«ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»

# ВЫБАРЫ ДЭПУТАТАЎ
# ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ
## пятага склікання
## 23 ВЕРАСНЯ 2012 ГОДА

# ВЫНІКІ
## НЕЗАЛЕЖНАГА НАЗІРАННЯ

Мінск, 2013

ВЫБАРЫ ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПЯТАГА СКЛІКАННЯ
23 ВЕРАСНЯ 2012 ГОДА
ВЫНІКІ НЕЗАЛЕЖНАГА НАЗІРАННЯ

Рэдактар: Таццяна Рэвяка

Дадзенае выданне адлюстроўвае вынікі незалежнага назірання за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 2012 года, якое ажыццяўлялася Праваабарончым цэнтрам «Вясна» і Беларускім Хельсінкскім камітэтам у межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».
У кнізе даецца ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў.
Кніга падрыхтавана на падставе справаздач доўгатэрміновых і кароткатэрміновых назіральнікаў.

*У выданнні выкарыстаны фотаздымкі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», photo.bymedia.net, афіцыйнага сайта Пінскага гарвыканкама*

**«Праваабаронцы за свабодныя выбары», 2013**

# ЗМЕСТ

**Спіс прынятых скарачэнняў** ... 6

**Уводзіны** ... 7

**Выбарчая кампанія. Грамадска-палітычны кантэкст** ... 8

**Прававая база** ... 10

**Фарміраванне выбарчых камісій** ... 11

**1. Фарміраванне акруговых выбарчых камісій** ... 11

1.1. Вылучэнне ў склад АВК ... 11

1.2. Пасяджэнні па ўтварэнні акруговых выбарчых камісій ... 12

1.3. Склад акруговых выбарчых камісій ... 13

1.4. Транспарэнтнасць пры фармаванні АВК ... 16

**2. Фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій** ... 17

2.1. Вылучэнне ў склад УВК ... 18

2.2. Пасяджэнні па ўтварэнні ўчастковых выбарчых камісій ... 18

2.3. Склад участковых выбарчых камісій ... 20

2.4. Транспарэнтнасць пры фарміраванні УВК ... 24

**Рэгістрацыя ініцыятыўных груп** ... 26

**Збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты** ... 28

**1. Вызначэнне месцаў, забароненых для збору подпісаў** ... 28

**2. Умовы збору подпісаў** ... 30

**Рэгістрацыя кандыдатаў** ... 33

**1. Прававыя аспекты** ... 33

**2. Транспарэнтнасць працэдуры праверкі подпісаў** ... 34

**3. Вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты** ... 35

**Перадвыбарчая агітацыя** ... 37

**1. Прававая рэгламентацыя** ... 37

**2. Вывядзенне заклікаў да байкоту за межы агітацыі** ... 37

**3. Агітацыя ў электронных сродках масавай інфармацыі** ... 40

**4. Агітацыя ў друкаваных СМІ** ... 42

**5. Асвятленне выбарчай тэматыкі ў СМІ** ... 44

**6. Агітацыя шляхам распаўсюду друкаваных матэрыялаў** ... 45

**7. Сустрэчы з выбаршчыкамі і іншыя масавыя мерапрыемствы** ... 48

7.1. Вызначэнне месцаў для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі і масавых мерапрыемстваў па-за памяшканнямі ... 48

7.2. Умовы правядзення агітацыі ... 50

**Зняцце кандыдатаў АГП і ПБНФ** ... 55

**Датэрміновае галасаванне** ... 56

**1. Прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні** ... 56

**2. Умовы для назірання падчас датэрміновага галасавання** ... 58

**3. Выяўленыя парушэнні падчас датэрміновага галасавання** ... 60

3.1. Разыходжанні ў дадзеных па колькасці прагаласаваўшых датэрмінова ... 61

**Дзень выбараў** ... 63
1. Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў ... 63
2. Галасаванне на выбарчых участках ... 64
3. Падлік галасоў ... 66
4. Устанаўленне вынікаў выбараў ... 70
**Назіранне за выбарамі** ... 73
**Скаргі і звароты, звязаныя з выбарамі** ... 77
1. Скаргі, звязаныя з утварэннем АВК і УВК ... 77
2. Скаргі на этапе рэгістрацыі ініцыятыўных груп і збору подпісаў ... 78
3. Скаргі на адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў ... 78
4. Скаргі на этапе агітацыі ... 79
5. Скаргі на этапе галасавання і падвядзення вынікаў выбараў ... 81
**Высновы** ... 83
**Рэкамендацыі** ... 85
1. Выбарчыя камісіі ... 85
2. Рэгістрацыя кандыдатаў ... 85
3. Спісы выбаршчыкаў ... 85
4. Фінансаванне выбараў ... 85
5. Перадвыбарчая агітацыя ... 86
6. Судовае абскарджанне рашэнняў, звязаных з выбарамі ... 86
7. Датэрміновае галасаванне ... 86
8. Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка ... 86
9. Падлік галасоў ... 86
10. Назіранне за выбарамі ... 87
**Сітуацыя пасля выбараў** ... 88
1. Міжнародная рэакцыя на выбары ... 88
2. Заявы кіраўніка дзяржавы і старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў па пытаннях, звязаных з правядзеннем выбараў ... 88
3. Грамадска-палітычны кантэкст ... 90
**Дакументы** ... 111
1. Адмова АКВ у магчымасці назіральніку прысутнічаць падчас праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў. ВА №64 ... 111
2. Адмова АКВ у магчымасці назіральніку прысутнічаць падчас праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў. ВА №98 ... 112
3. Адмова АКВ у магчымасці назіральніку прысутнічаць падчас праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў. ВА №99 ... 113
4. Адказ ЦВК назіральніку С. Гоўшу з нагоды заявы аб фальсіфікацыі пратакола паседжання АВК ВА №5 ... 114
5. Адказ з аддзела ўнутраных спраў Баранавіцкага гарвыканкама з нагоды заявы назіральніка С. Гоўшы аб фальсіфікацыі пратакола паседжання АВК ВА №5 ... 115
6. Адмова галоўнага рэдактара газеты «Маяк» у публікацыі праграмы кандыдата ў дэпутаты А. Кабанава ... 116
7. Планы сустрэч з выбаршчыкамі кандыдатаў у дэпутаты па Пінскай сельскай выбарчай акрузе №15: выключна ў працоўны час і выключна ў непрацоўны час ... 117

8. Запрашэнне на выбары (Аршанская гарадская ВА №26, участак для галасавання №1) на 27 верасня: 2 чалавекі, указаныя ў запрашэнні, не зарэгістраваны па дадзеным адрасе, 1 чалавек некалькі гадоў мае іншае прозвішча ........ 118
9. Выбарчыя паштоўкі з рэкламай прыватнага прадпрыемства «Райаграсэрвіс». Распаўсюджваліся ва ўстановах Маладэчна ідэолагамі ........ 119
10. Адмова УВК на прапанову назіральніка аб правядзенні празрыстай працэдуры падліку галасоў........ 120
11. Яўка выбаршчыкаў на двух суседніх участках Свіслацкай акругі №94 г. Мінска адрозніваецца больш чым у 5 разоў........ 121
12. Асаблівае меркаванне сябра АВК Грушаўскай выбарчай акругі №98 г. Мінска ........ 122
**Дадаткі** ........ 127
1. Рашэнне АВК Брэсцкай Памежнай выбарчай акругі №4 аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Мікалая Статкевіча ........ 127
2. Рашэнне Назіральнай рады па кантролю за выкананнем парадку і правіл правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі. ........ 128
3. Пастанова ЦВК «Аб растлумачэнні прымянення палажэнняў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць правядзенне дэбатаў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання»........ 129
4. Асвятленне парламенцкіх выбараў 2012 г. у беларускіх СМІ. Выніковы даклад. ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» ........ 130
5. Папярэднія заключэнні і высновы. Міжнародная місія па назіранні за выбарамі АБСЕ/ПА АБСЕ. Рэспубліка Беларусь —Парламенцкія выбары, 23 верасня 2012 года........ 137
6. Заключэнне групы назіральнікаў ад Міжнароднай Асамблеі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў на выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. ........ 151

# СПІС ПРЫНЯТЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

АБСЕ — Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе

АГП — Аб'яднаная грамадзянская партыя

АВК — акруговая выбарчая камісія

Беларускі саюз жанчын — Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын»

Белая Русь — Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь»

БДІПЧ АБСЕ — Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе

БПЛ «Справядлівы свет» — Беларуская партыя левых «Справядлівы свет»

БРСМ — Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»

БСДП (Г) — Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада)

БССП — Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя

БХК — Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі камітэт»

БХД — Беларуская хрысціянская дэмакратыя

ВА — выбарчая акруга

ВК — Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь

ВУ — выбарчы ўчастак

Каляндарны план — Каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання

КДБ — Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь

КаАП — Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях

КПБ — Камуністычная партыя Беларусі

КХП — Кансерватыўна-Хрысціянская Партыя — БНФ

ЛДПБ — Ліберальна-дэмакратычная партыя Рэспублікі Беларусь

ПБНФ — Партыя БНФ

ППНС — Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

РППС — Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці

Рух «За Свабоду» — Праваабаронча-асветніцкае грамадскае аб'яднанне Рух «За Свабоду»

СНД — Саюз незалежных дзяржаў

УВК — участковая выбарчая камісія

Цэнтральная камісія — Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў

# УВОДЗІНЫ

Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» — незалежная і палітычна незаангажаваная сумесная ініцыятыва Праваабарончага цэнтра «Вясна» і Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт».

Мэта кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» — назіранне за выбарамі, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаванне беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці пра вынікі назірання.

З першага дня выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання ў межах кампаніі дзейнічала 95 доўгатэрміновых назіральнікаў. Іх праца ахоплівала 106 са 110 выбарчых акруг. Вынікі апрацоўкі штотыднёвых справаздач назіральнікаў распаўсюджваліся ў форме тыднёвых справаздач і папярэдніх справаздач па асобных этапах выбараў.

Падчас датэрміновага галасавання і галасавання ў дзень выбараў назіранне ажыццяўлялі 295 кароткатэрміновых назіральнікаў на 150 выбарчых участках па ўсёй тэрыторыі краіны, сярод якіх — 70 удзельнікаў праекта «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка». Іх справаздачы апрацоўваліся штодзённа, што дазволіла выявіць агульныя тэндэнцыі ў арганізацыі выбарчага працэсу і зафіксаваць узровень парушэнняў ВК.

# ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ КАНТЭКСТ

Парламенцкія выбары 2012 года ўспрымаліся чарговай адміністрацыйнай працэдурай па вызначэнні прадстаўнікоў дзяржаўнага органа, які даўно не мае самастойнага значэння ў прыняцці важных для краіны рашэнняў. Гэтым часткова тлумачыцца тая невялікая цікавасць да выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу як з боку грамадства, так і з боку апазіцыйных сіл.

Традыцыйна беларускія ўлады праводзяць парламенцкія выбары ў «ціхім рэжыме», каб пазбегнуць непажаданай мабілізацыі пратэстнага электарату. Выбары 2012 года не сталі выключэннем. Шмат якія замежнікі, якія знаходзіліся ўлетку 2012 года ў Беларусі, адзначалі адсутнасць вонкавых прыкмет выбарчай кампаніі. Дзяржаўныя медыі амаль не асвятлялі кампаніі кандыдатаў. Апазіцыя ўцэлым выкарыстоўвала выбарчую кампанію для вырашэння сваіх унутраных праблем, а не камунікацыі з выбаршчыкамі. Улады абнавілі склад Палаты прадстаўнікоў, захаваўшы пры гэтым яе поўную лаяльнасць, не выкарыстоўваючы пры гэтым значных рэпрэсіўных захадаў. Еўрапейскі Саюз па-ранейшаму разглядаў выбары ў Беларусі як магчымасць для перамен і як своеасаблівы іспыт для афіцыйнага Мінска.

Разам з захаванай з савецкіх часоў традыцыяй удзельнічаць у выбарах беларускае грамадства адначасова даволі рэалістычна ацэньвала рэальную працэдуру галасавання і ступень важнасці парламента як органа ўлады. Так, згодна з дадзенымі НІСЭПД, 54,5% рэспандэнтаў лічылі, што вынікі выбараў не залежаць ад іх голаса, супрацьлеглага меркавання прытрымліваліся толькі 36,7%[1]. 39,6% у чэрвені 2012 меркавалі, што выбары не будуць свабоднымі і справядлівымі (36,8% меркавалі, што будуць). 46,9% (супраць 39,1%) былі ўпэўнены ў тым, што на выбарах будзе толькі імітацыя барацьбы, а размеркаванне месцаў ужо загадзя вызначана ўладамі. Разам з тым, ужо ў чэрвені 50,7% апытаных пацвердзілі свой намер удзельнічаць у выбарах[2]. Як паказвае прыклад у тым ліку мінулых выбарчых кампаній, па меры набліжэння да дня галасавання гэта лічба расце. Тым не менш, у параўнанні з выбарамі 2008 года гэта лічба патэнцыйных выбаршчыкаў значна знізілася, што сведчыць пра агульнае падзенне цікавасці да выбараў.

У сувязі з гэтым варта адзначыць, што паступовае зніжэнне цікавасці да выбараў не было звязана з ідэяй байкоту, якую напярэдадні выбарчай кампаніі падтрымлівалі толькі 14,2% апытаных. Такім чынам, пасіўнасць часткі электарату тлумачыцца не грамадзянскім выбарам не ўдзельнічаць у несумленных выбарах па сцэнары ўлады, а хутчэй адсутнасцю веры ў тое, што Палата прадстаўнікоў можа вырашаць іх праблемы, а таксама адсутнасцю бачнай, зразумелай і прывабнай альтэрнатыўнай палітычнай платформы (за лідараў апазіцыі ў тым самым апытанні выказалі гатоўнасць прагаласаваць толькі 8,6% грамадзян).

Ні адна з палітычных арганізацый, што так ці інакш удзельнічала ў электаральнай кампаніі, не верыла ў справядлівасць выбараў і ў магчымасць хоць нейкім чынам паўплываць на ўнутрыпалітычную сітуацыю праз іх правядзенне. Гэта пазіцыя, аднак, не стала аб'ядноўчай для апазіцыі. Наадварот, былі абраны тры стратэгіі: байкот, удзел і абумоўлены ўдзел (АГП і БНФ знялі сваіх кандыдатаў з выбараў перад галасаваннем). Гэта зрабіла дадатковы ўнёсак у расчараванне электарату.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на запэўніванні прыхільнікаў байкотнага сцэнару ў намеры арганізаваць актыўную кампанію, у рэчаіснасці было праведзена толькі некалькі пікетаў, астатняя актыўнасць абмежавалася выступамі ў апазіцыйных і незалежных медыях. У выніку на агульную карціну электаральных паводзін гэтая кампанія не паўплывала. Як паказалі паслявыбарчыя апытанні, доля тых, хто застаўся ўпэўненым у справядлівасці выбараў, толькі ўзрасла.

Партыі і рухі, што ставілі перад сабой больш рэалістычныя мэты, — праз удзел у выбарах пашырыць колькасць сваіх прыхільнікаў, — па меншай меры нагадалі грамадству пра сваё існаванне і прапанавалі пэўныя праграмы. Але нават гэтая апазіцыйная група ў большасці падчас кампаніі падымала пытанні, якія мала хвалююць сярэднестатыстычнага грамадзяніна — праблемы правоў чалавека, палітычных зняволеных, рэформы дзяржаўнага кіравання і г.д.

---

1 http://www.iiseps.org/press5.html
2 http://www.iiseps.org/press9.html

У выніку палітычная апазіцыя выйшла з выбараў у выглядзе двух канкуруючых блокаў (прыхільнікі і праціўнікі байкоту), якія працягнулі высвятленне ступені эфектыўнасці байкоту і маральнасць удзелу ў выбарах у існуючых палітычных умовах.

Такім чынам, палітычная апазіцыя, нават калі асобныя яе дзеячы імкнуліся пашырыць сваю сацыяльную базу, выкарыстоўвала электаральную кампанію для перафарматавання статусаў унутры самой апазіцыйнай супольнасці. Большасць лозунгаў і актуалізаваных тэм апазіцыйных кандыдатаў падчас выбарчай кампаніі былі звязаны найперш з апазіцыйным дыскурсам, а не з сацыяльнымі ці эканамічнымі праблемамі ў краіне, якія найперш турбуюць грамадзян. Большасць лідараў і актывістаў падчас сваіх выступаў найперш ацэньвалі, што скажуць іх калегі-апазіцыянеры, а не выбаршчыкі з іх акругі.

Што датычыць міжнароднага кантэксту, то ён быў не на карысць ліберальнай выбарчай кампаніі, адрозніваючыся ў горшы бок нават у параўнанні з 2008 ці 2010 гг.

Выбары 2012 года адбываліся на фоне сур'ёзнага дыпламатычнага крызісу ў беларуска-еўрапейскіх адносінах. Увесну 2012 года ЕС быў нават вымушаны адклікаць з Мінску ўсіх амбасадараў у знак салідарнасці з фактычна выдаленымі беларускім бокам амбасадарамі Польшчы і ЕС. Адносіны яшчэ больш азмрочыліся так званым «швецкім дэсантам», калі супрацоўнікі шведскай піяраўскай агенцыі раскідалі над Беларуссю плюшавых мядзведзікаў з лёгкаматорнага самалёта. Гэта прывяло да закрыцця шведскай місіі ў Беларусі і беларускай — у Швецыі.

Яшчэ ў сакавіку Еўрасаюзам была абвешчана новая праграма для Беларусі пад назвай «Еўрапейскі дыялог пра мадэрнізацыю з Беларуссю», якая аказалася скіраванай на беларускую апазіцыю і грамадзянскую супольнасць, паколькі ўлады Беларусі не могуць у ёй удзельнічаць да вызвалення ўсіх палітычных вязняў. Гэтыя дзеянні выклікалі яшчэ вышэйшы градус антызаходняй рыторыкі беларускага кіраўніцтва і афіцыйных СМІ, што не магло не адбіцца на агульнай хадзе выбарчай кампаніі.

Па традыцыі Еўрапейскі Саюз прывязаў чарговы перагляд санкцый адносна кіраўніцтва Беларусі да выбараў, занадта шмат значэння надаючы гэтай падзеі, якая сама па сабе не можа сведчыць пра намер (або яго адсутнасць) афіцыйнага Мінска палепшыць стасункі з ЕС. Выбары — гэта заўжды самы небяспечны і ўразлівы перыяд жыцця аўтарытарнага рэжыму, бо мабілізуе як прыхільнікаў, гэтак і апанентаў. Таму натуральна, што падчас выбараў улады імкнуцца як мага эфектыўней кантраляваць працяканне гэтага працэсу. Адсюль і ўзмацненне рэпрэсій, і кантроль за СМІ, і шчыраванне прапаганды. Адпаведна, кожны раз высновы па Беларусі, прывязаныя да выбараў, негатыўныя і вымагаюць пашырэння санкцыяў, што стварае сітуацыю кансервавання беларуска-еўрапейскіх адносін. Але прызвычаеныя да дэмакратыі еўрапейцы працягваюць разглядаць беларускія выбары як волевыяўленне грамадзян, а не як руцінную адміністрацыйную працэдуру ў межах кадравай палітыкі.

Варта адзначыць, што беларускія ўлады напярэдадні кампаніі адчувалі сябе даволі ўпэўнена, каб не ісці на сур'ёзныя саступкі Захаду і яшчэ пачакаць ад яго больш выгодных прапаноў і гарантый. Такую ўпэўненасць даваў надзейны тыл у выглядзе Расіі, якая не зацікаўлена псаваць свае стасункі з Беларуссю да канчатковага фарміравання Еўразійскага саюза.

Палата прадстаўнікоў была значна абноўлена, у ёй засталося толькі 19% дэпутатаў з папярэдняга складу. Не выключана, што гэта быў тактычны ход, нацэлены на тое, каб распачаць адносіны новага парламента з Захадам з чыстага аркуша. Верагодна, гэтай мэце служыла і прызначэнне новым міністрам замежных спраў Уладзіміра Макея, вядомага сваім параўнальным лібералізмам.

Разам з тым, нягледзячы на такую, здавалася б, фатальную перадвызначанасць беларускіх выбараў, ёсць падставы казаць, што гэта ўсё ж не бессэнсоўны рытуал. Удзельнічаючы ў іх, выбарчы працэс трэба ўважліва аналізаваць і рабіць высновы. Факты, зафіксаваныя незалежнымі назіральнікамі — гэта своеасаблівая хроніка падзей, якая дае матэрыял для такога аналізу, асэнсавання не толькі выбараў, але і ўвогуле палітычных працэсаў у найноўшай гісторыі Беларусі.

# ПРАВАВАЯ БАЗА

Выбары дэпутатаў ППНС пятага склікання прызначаны Указам Прэзідэнта ад 18 чэрвеня 2012 г. №276, згодна з якім асноўнае галасаванне было прызначана на 23 верасня. Выбары праводзіліся ў 110 акругах шляхам галасавання паводле мажарытарнай сістэмы.

Пасля парламенцкіх выбараў 2008 г. нацыянальнымі назіральнікамі, а таксама назіральнікамі місій БДІПЧ АБСЭ былі распрацаваны рэкамендацыі па рэфармаванні беларускага выбарчага заканадаўства. Частка гэтых рэкамендацый знайшла ўвасабленне ў новай рэдакцыі ВК, прынятай 4 студзеня 2010 г. Выбары дэпутатаў ППНС пятага склікання сталі першымі парламенцкімі выбарамі, правядзенне якіх рэгуляваў ВК са зменамі і дапаўненнямі 2010 і 2011 гг.[3]

Асноўнымі з іх з'яўляюцца наступныя:

• органы, якія ўтвараюць камісіі, як правіла, не менш за адну трацiну складу фарміруюць з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў; у склад камісій забаронена ўключаць суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў; дзяржаўныя служачыя не могуць складаць больш за трацiну складу камісіі.

• зменшана колькасць грамадзян (з 30 у старой рэдакцыі ВК да 10 — у рэдакцыі 2010 г.), якія могуць вылучаць свайго прадстаўніка ў склад АВК; таксама зменшана колькасць членаў працоўнага калектыву, якія дэлегуюць прадстаўніка ў склад камісіі (з 30 да 10); замацавана права суб'ектаў, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій, прысутнічаць на пасяджэннях органаў, якія іх утварылі;

• для кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб устаноўлены паведамляльны парадак правядзення масавых мерапрыемстваў у месцах, вызначаных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

• пры вылучэнні кандыдата ў дэпутаты ППНС палітычнай партыяй не патрабуецца наяўнасць арганізацыйнай структуры партыі на тэрыторыі акругі, па якой вылучаецца кандыдат;

• рашэнні органаў, якія ўтварылі камісіі, могуць быць абскарджаны ў судовым парадку суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій,

• кандыдаты ў дэпутаты ППНС атрымалі права ствараць уласныя выбарчыя фонды для фінансавання дадатковых выдаткаў па перадвыбарчай агітацыі ў памеры не больш за 1 000 базавых велічынь.

Змены і дапаўненні ў ВК у асноўным носяць пазітыўны характар і, як ужо адзначалася, часткова ўлічылі рэкамендацыі экспертаў БДІПЧ АБСЕ. Аднак многія рэкамендацыі засталіся не рэалізаванымі, у прыватнасці тыя, што накіраваны на павышэнне транспарэнтнасці выбарчага працэсу. Так, не замацаваны нормы, якія забяспечваюць галосны публічны падлік галасоў. Не замацаваны абавязак старшыні і сакратара выбарчай камісіі выдаваць копіі пратакола аб выніках галасавання тым асобам, якія маюць права прысутнічаць падчас падліку галасоў на ўчастку для галасавання. Захоўваюцца недахопы рэгулявання тых працэдур выбарчага працэсу, якія ў найбольшай ступені могуць выкарыстоўвацца для фальсіфікацый і злоўжыванняў.

Пастановы Цэнтральнай камісіі таксама з'яўляліся важнай метадычнай крыніцай, якая нарматыўна рэгулявала і тлумачыла шматлікія аспекты выбарчай кампаніі.

3 Избирательный кодекс Республики Беларусь. 11 февраля 2000 г. № 370-З. Изменения и дополнения: Закон Республики Беларусь от 4 января 2010 г. № 99-З; Закон Республики Беларусь от 8 ноября 2011 г. № 309-З

# ФАРМІРАВАННЕ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

У адпаведнасці з арт. 28 ВК падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў забяспечваюць акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі.

## 1. Фарміраванне акруговых выбарчых камісій

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з'яўляюцца важным суб'ектам выбарчага працэсу. Да паўнамоцтваў АВК аднесены, у прыватнасці, арганізацыя правядзення выбараў, кіраўніцтва дзейнасцю УВК, рэгістрацыя ініцыятыўных груп грамадзян і кантроль за правядзеннем агітацыі, рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты і іх даверанных асоб, кантроль за складаннем спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, разгляд заяў і скаргаў на рашэнні і дзеянні ўчастковых выбарчых камісій.

АВК па выбарах дэпутатаў ППНС фарміруюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтамі з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама з прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы. Акруговыя камісіі фарміруюцца ў складзе 9—13 сябраў. Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій рэгуляваўся арт. 35 ВК і Пастановай Цэнтральнай камісіі ад 19 чэрвеня 2012 г. № 22. Вылучаць у склад акруговых выбарчых камісій па адным прадстаўніку маюць права: кіруючы орган палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання (ва ўсе акруговыя камісіі); сход працоўнага калектыву арганізацыі, калектыву структурнага падраздзялення, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна, горада (у акруговыя камісіі, якія ствараюцца адпаведна на тэрыторыі раёна, горада, а ў гарадах з раённым дзяленнем — у акруговыя выбарчыя камісіі, якія ствараюцца на тэрыторыі адпаведнага раёна ў горадзе); выбаршчыкі ў колькасці не менш за 10 чалавек, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі і падпісаўшыя заяву аб вылучэнні прадстаўнікоў (у склад акруговай выбарчай камісіі).

### 1.1. Вылучэнне ў склад АВК

Згодна з Каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў пятага склікання, зацверджаным пастановай Цэнтральнай камісіі па правядзенні выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў 19.06.2012 г. № 17, вылучэнне прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій і прадастаўленне ў органы, якія іх фарміруюць, адпаведных дакументаў павінна было адбыцца не пазней за 6 ліпеня 2012 г.

У склад АВК было вылучана 2127 чалавек. Сярод іх ад грамадзян шляхам падачы заявы — 639 чалавек (25%), ад працоўных калектываў — 230 чалавек (9%), ад грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў — 858 чалавек (40%), ад палітычных партый — 400 чалавек (19%).

**Колькасць кандыдатаў па спосабу вылучэння**



Апазіцыйныя партыі прынялі даволі актыўны ўдзел у гэтым працэсе, вылучыўшы ўсяго 199 прэтэндэнтаў, што складае 9,4% ад агульнай колькасці вылучаных у АВК і 49,8% ад вылучаных палітычнымі партыямі. Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» вылучыла 88 чалавек, Партыя БНФ — 57 чалавек, АГП — 34 чалавекі, БСДП (Г) — 6 чалавек, Беларуская партыя «Зялёныя» — 5 чалавек, Партыя «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» — 9 чалавек. Для параўнання: падчас выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 2008 г. апазіцыйныя партыі вылучалі 118 чалавек, што складала 31,9 % ад вылучаных палітычнымі партыямі наогул.

Як і падчас папярэдніх выбараў, актыўна вылучаліся прадстаўнікі праўладных грамадскіх аб'яднанняў Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі — 279 чалавек (13,1%), Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў — 98 чалавек (4,6%), БРСМ — 108 чалавек (5,1%), Белая Русь — 117 чалавек (5,5%). Гэтыя чатыры грамадскія аб'яднанні вылучылі 28,3 % ад агульнай колькасці вылучаных у склад АВК і 70 % ад вылучаных грамадскімі і іншымі аб'яднаннямі адпаведна.

Некаторыя апазіцыйныя палітычныя партыі і рухі, якія падтрымлівалі ідэю байкоту выбараў, не вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых камісій. Гэта Кансерватыўна-Хрысціянская партыя — БНФ, незарэгістраваная партыя БХД, ПАГА «Рух «За Свабоду». Нязначным было вылучэнне актывістаў грамадскай кампаніі «Гавары праўду» (8 чалавек). Хаця ні ПАГА «Рух «За Свабоду», ні «Гавары праўду» не заяўлялі пра падтрымку байкоту выбараў.

Сярэдні конкурс на адно месца ў акруговай камісіі склаў 1,5 чалавекі на месца. У Мінску і Гомельскай вобласці — 2 чалавекі на месца. Усяго сфарміравана 110 акруговых выбарчых акругаў. У тым ліку: у Мінску — 20 камісій, у Мінскай і Гомельскай абласцях — па 17, у Брэсцкай вобласці — 16, у Віцебскай — 14, у Магілёўскай і Гродзенскай — па 13 камісій.

## 1.2. Пасяджэнні па ўтварэнні акруговых выбарчых камісій

Згодна з Каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў, пасяджэнні прэзідыумаў абласных, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласных, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта прайшлі да 9 чэрвеня 2012 г., ва ўстаноўленыя тэрміны.

Пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, у падаўляючай большасці насілі выключна фармальны характар. Прыняцце рашэнняў пра склад АВК адбывалася шляхам спісачнага галасавання, без абмеркавання вылучаных кандыдатур і фактычна зводзілася да безальтэрнатыўнага зацвярджэння складаў камісій, папярэдне кулуарна распрацаваных органамі ўлады. Інфармацыя аб месцах працы і пасадах асоб, вылучаных у склад камісій, на пасяджэннях не агалошвалася, хаця прысутныя задавалі адпаведныя пытанні.

На пасяджэнні прэзідыума Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта кандыдатаў на ўключэнне ў склад АВК персанальна не прадстаўлялі і не абмяркоўвалі, агучваліся толькі агульныя крытэрыі ўключэння ў камісіі (досвед працы, адказнасць, масавасць палітычнай партыі ці грамадскага аб'яднання і інш.). Праекты рашэнняў былі падрыхтаваны загадзя.

Працягласць паседжанняў у большасці рэгіёнаў была мінімальнай. У Мінскай вобласці і ў горадзе Мінску персанальна кандыдатуры прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій не абмяркоўваліся, галасаванне таксама ішло па папярэдне падрыхтаваных спісах. Для прыняцця рашэнняў па персанальным складзе 17 акруговых камісій па Мінскай вобласці прэзідыума Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і Мінаблвыканкама хапіла ўсяго 20 хвілін.

У Гомельскай вобласці пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта працягвалася 13 хвілін. Начальнік упраўлення арганізацыйна-кадравай працы Дзмітрый Ражкоў паведаміў, што была створана рабочая група, якая займалася падрыхтоўкай да фармавання камісій, і ўнёс на разгляд працэдуру прыняцця рашэння: галасаваць па кожнай акруговай камісіі ці агулам за ўвесь спіс. Прагаласавалі за ўвесь спіс, і паседжанне скончылася.

Колькасны і прадстаўнічы склад АВК Гродненскай вобласці быў зацверджаны ўсяго за 10 хвілін.

Кандыдатуры на паседжанні не абмяркоўваліся. Былі агучаны толькі агульныя лічбы — у склад 13 акруговых камісій, якія ўтвораны на тэрыторыі вобласці, было прапанавана 243 чалавекі. З іх у склад камісій уключана 169 чалавек, то бок, у кожнай камісіі па 13 чалавек. Прадстаўнікі дэмакратычных партый і аб'яднанняў, якія вылучалі сваіх сябраў у акруговыя камісіі, так і не змаглі па выніках паседжання даведацца, ці трапіў хто з іх вылучэнцаў у іх склад. Галасаванне праходзіла за сфармаваны спіс, аднак прозвішчы, якія знаходзяцца ў гэтым спісе, чыноўнікі агучваць адмовіліся. На ўсе пытанні назіральнікаў і прадстаўнікоў партый, адказвалі: «Чытайце «Гродзенскую праўду».

Паседжанне прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета і абласнога выканкама праходзіла больш за гадзіну, і ўдзельнікі мелі магчымасць задаць пытанні фармуючым органам, аднак галасаванне па персанальным складзе не праводзілася, сябры камісій зацвярджаліся спісачным складам.

Толькі на сумесным паседжанні прэзідыума аблсавета і Віцебскага аблвыканкама, у адрозненні ад паседжанняў астатніх аблсаветаў, агучваліся прозвішчы вылучэнцаў у акруговыя камісіі, а не прымаліся загадзя падрыхтаваныя спісы. Было сфармавана 14 акруговых камісій, па 13 сяброў у кожнай з іх. Было заяўлена 243 кандыдатуры на 162 вакантныя месцы, 61 чалавеку адмовілі. Па словах Паўла Левінава, які вылучаўся ад групы грамадзянаў па Чкалаўскай акрузе №18, ніхто з прэзідыума не патлумачыў, па якім прынцыпе фармаваўся канчатковы спіс, чаму менавіта гэтаму 61 чалавеку адмовілі ва ўключэнні ў спіс. Хоць само галасаванне праходзіла не па спісах, а індывідуальна па кожнай кандыдатуры.

## 1.3. Склад акруговых выбарчых камісій

Паводле звестак Цэнтральнай камісіі, 110 АВК былі ўтвораны з максімальнай колькасцю членаў — па 13 чалавек у кожнай. Прадстаўніцтва апазіцыйных партый у іх склала 3,3% (48 чалавек з 1430) ці 24% ад вылучаных апазіцыйнымі партыямі. Для параўнання: падчас папярэдніх парламенцкіх выбараў 2008 года колькасць вылучаных апазіцыйнымі партыямі ў АВК складала 118 чалавек. У склад камісій увайшло 38 чалавек (2,2 % ад агульнай колькасці сябраў АВК і 32% ад вылучаных апазіцыйнамі партыямі). Такім чынам, у 2012 годзе апазіцыйныя партыі вылучылі болей прадстаўнікоў у склад АВК, чым у 2008 г., але патрапіла ў склад выбарчых камісій іх у прапарцыйных адносінах меней. Падчас выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 2004 г. колькасць вылучаных у склад АВК ад апазіцыйных партый склала 318 чалавек, з іх 20 чалавек сталі сябрамі камісій (7 % ад колькасці вылучаных і 2% ад агульнай колькасці сябраў АВК).




Асноўнымі арганізацыямі, прадстаўленымі ў складзе АВК, сталі Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, БРСМ, Белая Русь і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Толькі ад РГА «Белая Русь» у склад АВК увайшлі 106 чалавек (7,4 % ад агульнай колькасці сябраў камісій). Такім чынам, нягледзячы на тое, што, у параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2008 г., колькасць членаў апазіцыйных партый у складзе АВК стала нязначна большай, колькасць адмоў з боку органаў, якія ўтвараюць камісіі, засталася вельмі вялікай. Варта адзначыць, што ў 2008 г. апазіцыйныя партыі свядома абмежавалі сваё вылучэнне ў АВК, прапанаваўшы разам ад усіх партый па адным прэтэндэнце ў кожную камісію. У гэтым годзе такога рашэння не было, і розныя апазіцыйныя партыі часам вылучалі некалькі прэтэндэнтаў у адну камісію. Пры

гэтым працэнт праходнасці прадстаўнікоў праўладных арганізацый стаў значна вышэйшым. Напрыклад, 90,5% усіх прадстаўнікоў аб'яднання Белая Русь увайшло ў склад АВК. Гэта сведчыць пра дыскрымінацыйнае стаўленне ўладных структур да тых грамадзян, якія былі вылучаны ад апазіцыйных партый.

Нягледзячы на ўнесеныя ў ВК змены ў частцы фарміравання выбарчых камісій, заканадаўства не забяспечыла празрыстасці і прапарцыйнасці працэсу іх фарміравання. Адсутнасць заканадаўча замацаваных аб'ектыўных крытэрыяў пры прыняцці рашэнняў аб уключэнні грамадзянаў у акруговыя выбарчыя камісіі, пакінула за органамі, якія іх фармуюць, абсалютнае права вызначаць іх склад і адвольна прымаць рашэнні аб уключэнні ці неўключэнні пэўных асоб.

Назіральнікі адзначылі перадузяты і суб'ектыўны характар прыняцця рашэнняў. Напрыклад, прадстаўнікам апазіцыйных партый адмаўлялі ва ўключэнні ў склад камісій у сувязі з пажылым узростам, але пры гэтым уключалі ў склад АВК членаў ветэранскіх арганізацый. Падставамі для адмовы, на якія спасылаліся прадстаўнікі органа, што фарміруе камісію, служылі адсутнасць досведу працы ў камісіях, сталага месца працы, аўтарытэт прэтэндэнта ў рэгіёне і інш.

Так, у Магілёўскай вобласці ў склад 13 акруговых камісіяў не патрапіў ніводны з 9 вылучэнцаў Партыі БНФ. Прадстаўнікі фармуючых органаў патлумачылі гэта пенсійным узростам некаторых кандыдатур, адсутнасцю досведу працы ў выбарчых камісіях, а адносна старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі партыі Дзмітрыя Салаўёва персанальна было заяўлена, што ён «не займаецца грамадскай дзейнасцю».

З Бярозаўскага раёна, які ўпершыню быў падзелены на 2 акругі (Івацэвіцкую №11 і Пружанскую №9), у акруговыя камісіі не трапіў ніводзін з 6 вылучаных прадстаўнікоў ад дэмакратычнай супольнасці. У камісіі было вылучана 2 прадстаўнікі ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі — Аляксандр Касевіч і Андрэй Міхнюк, ад Партыі БНФ — Зміцер Трацццяк і тры чалавекі шляхам збору подпісаў — Сяргей Русецкі, Тамара Шчапёткіна і Анатоль Сахаруша. Начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай працы Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр Каляда выказаў меркаванне, што гэтыя людзі не спрыялі б працы камісій. Па ягоных словах, камісіі трэба каб працавалі, а не высвятлялі адносіны.

Некаторыя станоўчыя змены ў выбарчым заканадаўстве, у прыватнасці, абмежаванне ўдзелу дзяржаўных служачых у дзейнасці акруговых выбарчых камісій, нівеляваліся адсутнасцю механізму кантролю за іх выкананнем. У большасці абласцей спісы сяброў акруговых камісій былі апублікаваны без указання іх месца працы і службовай пасады (толькі спосаб вылучэння), што пазбаўляла магчымасці мець дакладныя лічбы, наколькі выкананы патрабаванні ВК у дадзенай частцы, а таксама наколькі ўтвораныя камісіі з'яўляюцца незалежнымі ад уладнай вертыкалі. Аднак агульныя тэндэнцыі можна пабачыць па тых рэгіёнах, дзе такія звесткі аказаліся даступнымі.

Адна з выяўленых тэндэнцый — своеасаблівая «маскіроўка» прадстаўнікоў органаў, якія ўтвараюць камісіі, і дзяржслужачых пад вылучэнцаў ад палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян шляхам збору подпісаў. Гэтую тэндэнцыю выразна дэманструюць дадзеныя з Гомеля і Гомельскага раёна:

У склад АВК *Гомельскай Юбілейная акругі № 31* намеснік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Наталля Кавалёва трапіла ад прафсаюза. Яе калега, начальнік аддзела сацыяльнай падтрымкі насельніцтва адміністрацыі Чыгуначнага раёна Аляксандра Каленчыц прайшла ў акруговую камісію «ад грамадзян шляхам падачы заявы». «Ад грамадзян» патрапіла ў дадзеную АВК і старшыня прафкама Чыгуначнай арганізацыі працаўнікоў адукацыі і навукі Таццяна Стрыжак, якая раней узначальвала аддзел адукацыі адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля. Ад прафсаюза трапіла ў камісію яшчэ адна дзяржслужачая — намеснік дырэктара прадпрыемства «Цукаргандаль» Алена Бабок.

*Гомельская Сельмашаўская акруга № 32.* Начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Людміла Мяшкова трапіла ў камісію ад прафсаюза. Людміла Расказава, намеснік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля, вылучана ў акруговую камісію грамадзянамі. Начальнік аддзела культуры адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Марыя Фаменок стала сябрам акруговай камісіі «ад прафсаюза». Намеснік дырэктара дзяржаўнага прафесійна-палітэхнічнага ліцэя Харытонава Наталля трапіла ў акруговую камісію як прадстаўнік грамадскасці «Белай Русі».

*Гомельская Цэнтральная акруга №33.* Наталля Ананіч, начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля, вылучалася «ад грамадзян». Дырэктар сярэдняй школы Ала Нікіфарава вылучылася ў камісію «ад грамадзян». Яе калега, дырэктар гімназіі Віктар Петухоў, трапіў у камісію ад прафсаюза. Галоўны бухгалтар упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Наталля Сачыловіч вылучылася «ад грамадзян».

*Гомельская Савецкая акруга №34.* Намеснік кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Алена Герашчанка патрапіла ў камісію як вылучэнец «ад грамадзян». Дырэктар сярэдняй школы №33 Інна Цімашэнка — ад ГА «Белая Русь». Галоўны спецыяліст аддзела адукацыі адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Наталля Шапарава вылучылася ў камісію «ад грамадзян».

*Гомельская Прамысловая акруга №35.* Начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Ала Андрушчэнка вылучалася «ад грамадзян». У гэтай жа акруговай камісіі як вылучэнец ад грамадскага аб'яднання «Чырвоны Крыж» зацверджаны і яе калега — начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы адміністрацыі Навабеліцкага раёна Алена Хамец. Бандарэнка Андрэй — вылучэнец ад грамадзян, працуе галоўным юрысконсультам адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля.

*Гомельская Навабеліцкая акруга №36.* Кіраўнік справамі адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля Аляксей Васючэнка вылучыўся ў камісію «ад грамадзян», як і намеснік дырэктара сярэдняй школы №27 Аксана Герашчанка. Ад Белай Русі трапіла ў акруговую камісію дырэктар Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Людміла Грыцкова. Дырэктар лікёра-гарэлачнага завода, яна ж і дэпутат гарсавета Галіна Кардасёва вылучана ў акруговую камісію працоўным калектывам бухгалтэрыі завода. Намеснік кіраўніка адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля Уладзімір Прывалаў прадстаўляў у акруговай камісіі прафсаюз.

*Гомельская Сельская акруга №37.* Дырэктар Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна Алена Алейнікава вылучылася ў акруговую камісію ад грамадзян. Кіраўнік справамі Гомельскага райвыканкама Анатолій Кедо трапіў у камісію як прадстаўнік прафсаюза. «Ад грамадзян» вылучана ў камісіі начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскага райвыканкама Кацярына Лоская, а яе падначаленая, галоўны спецыяліст аддзела Ала Ткач прайшла ў камісію ад грамадскасці — ГА «Белая Русь».

У далейшым супрацоўнікі выканкамаў і кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў у большасці АВК занялі ключавыя пасады. Так, намеснік кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Алена Герашчанка ўзначаліла акруговую камісію Гомельскай Савецкай акругі №34, сакратаром абрана галоўны бухгалтар упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі Наталля Сачыловіч. Старшынёй акруговай камісіі Гомельскай-Прамысловай акругі №35 абрана начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы Ала Андрушчанка, намеснікам старшыні — дырэктар школы Інна Цімашэнка, сакратаром — галоўны спецыяліст аддзела адукацыі адміністрацыі Наталля Шапарава. Выбарчую акруговую камісію Калінкавіцкай акругі №41 узначаліў Алег Макушынскі — намеснік старшыні райвыканкама, намеснікам старшыні стаў дырэктар упраўлення капітальнага будаўніцтва Калінкавіцкага раёна Дзмітрый Гайкевіч, а сакратаром — начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы Алена Дзергач. Начальнік аддзела адукацыі Хойнікскага райвыканкама Людміла Кулакоўская ўзначаліла акруговую камісію Хойніцкай акругі №47. Старшынёй акруговай камісіі Рагачоўскай акругі №45 стаў намеснік старшыні райвыканкама Васіль Каральчук, намеснікам старшыні камісіі абралі дэпутата раённага Савета, дырэктара філіяла «Гомельаблгаз» Васіля Баранава, а сакратаром — начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай працы Ірыну Шаціла. Старшынёй акруговай камісіі Мазырскай выбарчай акругі №42 быў абраны кіраўнік справамі Мазырскага райвыканкама Міхаіл Пашынскі (вылучаны ад беларускага прафсаюза супрацоўнікаў дзяржаўных і іншых установаў), намеснікам стаў Аляксандр Шульга ад беларускага прафсаюза працаўнікоў будоўлі і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, генеральны дырэктар «Мазырсельбуд», а сакратаром — начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы райвыканкама Вераніка Байкова, абраная ад групы грамадзян. У акруговай камісіі Пружанскай выбарчай акругі №9 старшынёй камісіі быў абраны Анатоль Лаптановіч, накіраваны ад грамадскага аб'яднання «Белая Русь», дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Пружанскі міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі вучняў», ягоным намеснікам — Сачэўка Іван Васільевіч, вылучаны ад Камуністычнай партыі Беларусі, старшыня раённага камітэта Беларускага прафсаюза працаўнікоў адукацыі і навукі, сакратаром — Святлана Яфімава — галоўны спецыяліст аддзела арганізацыйна-кадравай пра-

цы Пружанскага райвыканкама. У АВК Івацэвіцкай акругі №11 старшынёй камісіі стаў Уладзімір Бурдзь —дырэктар Івацэвіцкага філіяла ЖКГ «Райводаканал», намеснікам старшыні камісіі Ірына Бачкалевіч — работніца Івацэвіцкага райвыканкама, сакратаром Алена Лакішык — юрыст Івацэвіцкага райвыканкама. Такім чынам, відавочнай з'яўлялася залежнасць сфармаваных акруговых выбарчых камісій ад выканаўчай улады.

Яшчэ адной з выразных тэндэнцыяй, зафіксаваных на этапе фармавання АВК, стала «пераемнасць» складу камісій ад папярэдніх выбараў. Большасць сяброў АВК, незалежна ад способу іх вылучэння, да гэтага з'яўляліся сябрамі ці акруговых камісій, ці тэрытарыяльных падчас мясцовых ці прэзідэнцкіх выбараў. У акруговых камісіях, сфармаваных у Гродненскай вобласці, папярэдні вопыт працы ў выбарчых камісіях мелі 89% зацверджаных кандыдатур, пра што яшчэ на паседжанні па фармаванні АВК заявіў старшыня абласнога Савета дэпутатаў Андрэй Навумовіч. Аналагічная сітуацыя была характэрная для ўсіх АВК, сфармаваных па краіне.

Напрыклад, у складзе акруговай камісіі Барысаўскай гарадской выбарчай акругі №62 дзевяць з трынаццаці сяброў уваходзілі ў склад Барысаўскай тэрытарыяльнай камісіі па выбарах прэзідэнта ў 2010 годзе, уключаючы старшыню Васіля Баранніка. А чацвёра «навічкоў»: Вольга Буфцяк з юрыдычнага аддзела Барысаўскага райвыканкама, вылучаная РГА «Белая Русь», другі сакратар Барысаўскага райкама БРСМ Ніна Глінская, галоўны спецыяліст аддзела культуры Барысаўскага райвыканкама Ганна Жарыкава (вылучалася ГА «Беларускі Чырвоны Крыж» і начальнік зямельнабудаўнічай службы Барысаўскага райвыканкама Павел Цырлін (вылучаўся грамадзянамі шляхам збору подпісаў).

Акруговая камісія Маладэчанскай гарадской выбарчай акругі №72 у асноўным таксама складалася з правераных не аднымі выбарамі кадраў: 10 чалавек з 13. З першага погляду гэта камісія была сфармавана выключна на дэмакратычных прынцыпах: у складзе, акрамя начальнікаў, ідэолагаў і працаўнікоў выканкама, ёсць просты лабарант установы адукацыі, пенсіянеркі і нават вартаўнік. Але на справе лабарант Апяцёнак Аксана аказваецца сакратаром БРСМаўскай пярвічкі, пенсіянерка Жаўняровіч Ніна — былы ідэолаг СПК «Краснае», а пенсіянерка Арловіч Люцыя — былая старшыня мясцовага Савета дэпутатаў, былая старшыня акруговых камісій на некалькіх выбарах. А просты вартаўнік Людміла Мястоўская — гэта былы вядучы спецыяліст па ахове дзяржаўных сакрэтаў былога завода-гіганта «Спадарожнік».

Па Гомельскай Юбілейнай акрузе №31 з 13 сяброў АВК 9 ужо працавалі на выбарах у камісіях — на мінулых парламенцкіх выбарах, а некаторыя «навабранцы» ўдзельнічалі ў працы ўчастковых камісій на прэзідэнцкіх выбарах. Напрыклад, памочнік дырэктара па ідэалагічнай працы ААТ «Электраапаратура» Святлана Стаіна на прэзідэнцкіх выбарах трапіла ва ўчастковую камісію як прадстаўнік грамадскага аб'яднання — «Белай Русі», а зараз — як вылучэнец ад грамадзян. Дэпутат Гомельскага гарсавета, упраўляючая аддзяленнем «Белпрамбудбанка» Галіна Касаверская на мінулых парламенцкіх выбарах працавала ў акруговай камісіі, але не Юбілейнай акругі, а Сяльмашаўскай №32. Камуніст Віктар Забарны на мінулых парламенцкіх выбарах працаваў у АВК Юбілейнай акругі, а зараз перайшоў у Сяльмашаўскую. Таксама ў АВК Юбілейнай акругі на мінулых выбарах працаваў Сяргей Карнееў, наменік дырэктара КЖРЭУП «Чыгуначнае», вылучаны «ад грамадзян». У склад АВК Сяльмашаўскай акругі трапіла і Таццяна Кажамякіна, якая на мінулых выбарах у парламент працавала ў Юбілейнай выбарчай акрузе.

Восем з трынаццаці сяброў АВК Гомельскай Цэнтральнай акругі № 33 мелі практычны досвед працы на выбарах у камісіях. Анатоль Карнееў на мінулых парламенцкіх выбарах працаваў у АВК Савецкай выбарчай акругі №34, зараз перамясціўся ў Цэнтральную. Ірына Кузьміцкая працавала ва ўчастковай камісіі на прэзідэнцкіх выбарах. Дырэктар гімназіі Віктар Петухоў таксама працаваў у камісіі на прэзідэнцкіх выбарах, як і Валянціна Палонская — старшыня раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа. У акруговай камісіі Савецкай акругі на мінулых выбарах у парламент працавала ветэран Аляфціна Свірыдава, якая перамясцілася ва АВК Цэнтральнай акругі. Галоўны бухгалтар упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Наталля Сачыловіч працавала ў АВК Прамысловай акругі №35, зараз — у Цэнтральнай. Дырэктар дома дзіцячай творчасці Тамара Чарняк таксама працавала раней у акруговай камісіі, толькі ў Савецкай, а не Цэнтральнай, як падчас гэтых выбараў.

## 1.4. Транспарэнтнасць пры фармаванні АВК

Паводле назіральнікаў, інфармацыя пра час і месца пасяджэнняў дзяржаўнымі СМІ і інтэрнэт-рэсурсамі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў большасці выпадкаў не

падавалася. Прадстаўнікі суб'ектаў, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у акруговыя выбарчыя камісіі, даведваліся аб месцы і часе пасяджэння шляхам асабістых зваротаў да прадстаўнікоў органаў выканаўчай улады.

У адпаведнасці з ч. 5 арт. 34 ВК на пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій. Удзел назіральнікаў не прадугледжаны. На немагчымасці прысутнасці назіральнікаў на пасяджэнні па фарміраванні АВК асобна фіксавалася ўвага фарміруючых органаў. Так, на афіцыйным сайце Віцебскага аблвыканкама была размешчана інфармацыя, што «на супольным пасяджэнні маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый» і іншых грамадскіх структур, «не прадугледжана накіраванне назіральнікаў».

Сваю пазіцыю органы ўлады матывавалі тым, што прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку і тыя, якія праводзяць маніторынг выбарчай кампаніі, не прадстаўляюць суб'ектаў, якія вылучылі прадстаўнікоў у склад выбарчай камісіі. Разам з тым, адным з відаў статутнай дзейнасці арганізацыі-суб'екта кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» — Беларускага Хельсінкскага камітэта, з'яўляецца ажыццяўленне назірання за выбарамі. Трэба адзначыць, што згодна з арт. 20 закона «Аб грамадскіх аб'яднаннях», грамадскае аб'яднанне мае права беспераешкодна атрымліваць інфармацыю, датычную іх дзейнасці. Фарміраванне выбарчых камісій, безумоўна, непасрэдна датычыцца арганізацыі выбараў і з'яўляецца важным этапам выбарчай кампаніі. Працэс фарміравання камісій павінен адбывацца максімальна празрыста, і пасяджэнні дзяржаўных органаў, на якіх фарміруюцца камісіі, павінны адбывацца ў прысутнасці ўсіх зацікаўленых суб'ектаў, у тым ліку прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, якія ажыццяўляюць маніторынг выбараў.

Неабходна заўважыць, што нягледзячы на адсутнасць у Кодэксе прамой забароны на прысутнасць больш за аднаго прадстаўніка суб'екта, які вылучыў свайго прадстаўніка ў склад камісіі, практыкавалася абмежаванне колькасці прадстаўнікоў — па адным ад кожнага суб'екта. Органы выканаўчай улады самастойна вызначалі, хто можа прысутнічаць на пасяджэнні органа, які ўтварае камісіі. У сувязі з гэтым не быў дапушчаны на пасяджэнне Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага аблвыканкама сябра партыі «Справядлівы свет» Анатоль Родзік, паколькі туды ўжо быў запрошаны іншы прадстаўнік гэтай партыі.

Прысутныя на пасяджэнні ў некаторых выпадках маглі задаваць пытанні аб прычынах прыняцця таго ці іншага рашэння, аднак сам працэс прыняцця рашэнняў па канкрэтных кандыдатах адбываўся без публічнага асвятлення і абмеркавання. Прысутным прадстаўнікам не давалі магчымасці азнаёміцца з матэрыяламі вылучэння ў склад акруговых выбарчых камісій (пратаколамі сходаў, заявамі грамадзянаў). Напрыклад, падчас паседжання па фарміраванні акруговых камісій па Гродненскай вобласці прадстаўнік БХК Раман Юргель выказаў пажаданне азнаёміцца з матэрыяламі вылучэння ў склад АВК, але яму такой магчымасці не далі.

## 2. Фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій

Згодна з артыкуламі 28 і 34 ВК падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў забяспечваюць УВК. Яны ўдакладняюць спісы выбаршчыкаў, забяспечваюць датэрміновае галасаванне і галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка, арганізоўваюць галасаванне ў дзень выбараў, праводзяць падлік галасоў і ўстанаўліваюць вынікі галасавання па ўчастку.

УВК фарміруюцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым дзяленнем — мясцовымі адміністрацыямі. УВК складаюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзянаў, якія вылучаны шляхам збору подпісаў. Не менш за адну траціну яе складу фарміруецца з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. У склад камісій не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Дзяржаўныя служачыя не могуць складаць больш за адну трацінy складу камісіі. Рашэнне органаў, якія ўтварылі камісіі, можа быць абскарджана ў судовым парадку ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій.

Выбарчае заканадаўства абмяжоўвае магчымасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў вылучаць прадстаўнікоў у УВК у параўнанні з вылучэннем у акруговыя выбарчыя камісіі

(АВК). Яно даецца толькі тым арганізацыйным структурам партый і грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць дзяржаўную рэгістрацыю альбо пастаўлены на ўлік у мясцовых органах улады. Такім чынам, рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні, якія не маюць арганізацыйных структур, наогул пазбаўлены магчымасці ўдзелу ў выбарчым працэсе ў складзе УВК.

Напярэдадні выбараў некаторыя арганізацыі (мінская гарадская і абласныя арганізацыі РПГА «Рух за Свабоду», Гродзенская арганізацыя Партыі БНФ) спрабавалі зарэгістраваць мясцовыя арганізацыйныя структуры, але атрымалі адмову. У выніку яны падпалі пад абмежаванне ВК і не атрымалі права вылучаць сваіх членаў у склад УВК.

## 2.1. Вылучэнне ў склад УВК

Паводле звестак Цэнтральнай камісіі, у склад УВК была вылучана 84781 кандыдатура: ад грамадзян шляхам падачы заявы — 32 908 кандыдатур (38,8%), ад працоўных калектываў — 15 375 (18,1%), ад палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў — 36 498 (43%).

Лідарамі па вылучэнні з'яўляюцца праўладныя грамадскія аб'яднанні: Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (больш за 12%), Белая Русь (каля 6%), БРСМ (5%), Беларускі саюз жанчын (каля 5%) і інш. Напрыклад, у Віцебскай вобласці гэтыя суб'екты разам з Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў вылучылі ўсяго 85% прэтэндэнтаў ад грамадскіх аб'яднанняў або 32% ад агульнага ліку вылучаных у УВК. Актыўнасць гэтых арганізацый у параўнанні з прэзідэнцкімі выбарамі 2010 г. у працэнтных суадносінах практычна не змянілася, але значна павялічылася ў параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2008 г.

Кандыдатуры ў склад УВК прапанавалі 10 палітычных партый з 15 зарэгістраваных. Пры гэтым лаяльныя ўладам палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні павялічылі сваю актыўнасць. Напрыклад, РППС вылучыла 832 прэтэндэнты, што ў два разы перавышае колькасць 2010 г.

У параўнанні з 2010 г. актыўнасць апазіцыйных партый знізілася. На прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. 1073 прэтэндэнты ад апазіцыйных палітычных партый складалі 1,3% ад агульнай колькасці кандыдатаў. У 2012 годзе 664 кандыдатуры ад пяці апазіцыйных партый складалі толькі каля 0,8% ад агульнага ліку вылучэнцаў.

Паводле звестак Цэнтральнай камісіі, БПЛ «Справядлівы свет» вылучыла 216 чалавек, БСДП (Г) — 30, АГП — 240, ПБНФ — 158, Беларуская партыя «Зялёныя» — 20. Доля апазіцыйных актывістаў сярод усіх, хто вылучаўся ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, у 2010 г. складала 3,2%, у 2012 г. — толькі 1,8%.

У цэлым доля вылучаных у склад УВК прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў узрасла да 42%. Падчас прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. яна склала 39,1%[4]. Адпаведна ў 2012 г. скарацілася колькасць кандыдатур у УВК ад грамадзян і працоўных калектываў.

Назіралася разыходжанне паміж звесткамі пра колькасць вылучэнцаў у склад УВК, агучанымі апазіцыйнымі партыямі, і звесткамі, якія прывяла Цэнтральная камісія. Напрыклад, АГП заявіла пра вылучэнне ў склад УВК 296 сваіх сяброў, а ў афіцыйных дакументах указана лічба 240[5]. Аналагічныя разыходжанні маюцца ў афіцыйнай і партыйнай статыстыцы вылучэння ад БПЛ «Справядлівы свет» і ПБНФ.

Незарэгістраваныя палітычныя суб'екты — партыя БХД і кампанія «Гавары праўду» — для вылучэння сваіх прадстаўнікоў у склад УВК выкарыстоўвалі збор подпісаў выбаршчыкаў. БХД заявіла пра вылучэнне 171 прадстаўніка.

## 2.2. Пасяджэнні па ўтварэнні ўчастковых выбарчых камісій

На пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць УВК, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія прадставілі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Пры гэтым палажэнні артыкула 13 ВК не ўтрымліваюць указання на паўнамоцтвы назіральнікаў на гэтай стадыі выбарчай кампаніі, што выкарыстоўвалася для абмежавання назірання за прыняццем рашэння па фарміраванні УВК. Можна казаць, што пасяджэнні выканкамаў і мясцовых адміністрацый па фарміраванні УВК адбываліся ва ўмовах адноснай адкрытасці для назіральнікаў.

---

4 4 Сборник электоральной статистики «Выборы Президента Республики Беларусь в 2010 году» [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://www.rec.gov.by/Elections-PRB

5 Сведения о выдвижении представителей в состав участковых избирательных комиссий по выборам депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://www.rec.gov.by/Elections-PPNS5-Electoral

Як і пры фарміраванні АВК, гэтыя пасяджэнні насілі выключна фармальны характар, аб чым сведчыць характар іх правядзення і працягласць. У абсалютнай большасці рэгіёнаў галасаванне зводзілася да хуткага і безальтэрнатыўнага зацвярджэння спісаў складу камісій, падрыхтаваных напярэдадні пасяджэнняў у закрытым рэжыме.

Паводле звестак назіральнікаў, Бярозаўскі райвыканкам за 6 хвілін зацвердзіў 486 з 515 кандыдатур. Працэдурна гэта выглядала наступным чынам: на пытанне начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай працы Віталія Мшара «Усе маюць спісы пад рукамі?» прагучала дружнае «усе». «Прагаласуем!» Ні ў каго з прысутных не ўзнікла ні пярэчанняў наконт кандыдатур у сябры камісіі, ні пытанняў, ні асобнай думкі. Было агучана, што пры адборы прэтэндэнтаў пад ўвагу браліся ўзрост, вопыт, пэўны стаж і ўменне працаваць.

У Пружанскім райвыканкаме паседжанне прайшло за 12 хвілін, падчас якіх было зацверджана 558 кандыдатур з 701 — без галасавання, проста было абвешчана, колькі чалавек уключана ў камісіі, якім шляхам яны вылучаліся.

На пасяджэнні Смалявіцкага райвыканкама ў дакладзе начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы была агучана толькі колькасць пададзеных заяў і колькасны склад кожнай камісіі.

Салігорскі райвыканкам на працягу 15 хвілін задаволіў 691 заяву з 741, пры гэтым інфармацыя пра спосабы вылучэння ў склад УВК, назвы партый і арганізацый кандыдатаў не паведамляліся, таксама як і прычыны, па якіх адны кандыдатуры ўключаліся ў склад УВК, а іншыя — не. Сябра салігорскай філіі БХК Уладзімір Шыла адзначыў, што ўжо праз гадзіну пасля пасяджэння Салігорскага выканаўчага камітэта быў падпісаны ў друк нумар газеты «Шахцёр» з апублікаванымі складамі камісій. Гэта сведчыць пра тое, што рашэнне па складзе УВК было гатова і перададзена ў рэдакцыю выдання загадзя, а пасяджэнне з'яўлялася фармальнасцю.

Пасяджэнні адміністрацый Ленінскага раёна Гродна працягвалася 25 хвілін, Кастрычніцкага — 20 хвілін, а адміністрацыі Гродзенскага раёна — усяго 5 хвілін, склады камісій зацвярджаліся спісам і без абмеркавання кандыдатур.

Па Слонімскім раёне было сфармавана 49 участковых выбарчых камісій, колькасны склад якіх вар'іраваўся ад 9 да 19 чалавек. Хто канкрэтна стаў сябрам участковых выбарчых камісій і ці трапіў хоць адзін прадстаўнік ад дэмакратычных сіл у іх склад, па выніках пасяджэння так і засталося невядомым, бо прозвішчы тых, каго ўключылі, не называліся. Было толькі сказана, што ў сямідзённы тэрмін інфармацыя з'явіцца ў мясцовым друку.

У Слуцкі райвыканкам паступіла 754 заявы аб вылучэнні ў 72 участковыя выбарчыя камісіі, размешчаныя на тэрыторыі раёна. 750 чалавек былі ўключаныя ў склад камісій. Паседжанне, на якім быў зацверджаны склад участковых выбаркамаў, доўжылася 14 хвілін. Абмеркавання кандыдатур не было, супрацоўніца аддзела арганізацыйна-кадравай работы Слуцкага райвыканкама Святлана Чубок зачытала загадзя падрыхтаваны спіс тых, каго вырашылі ўключыць у склад УВК. Чацвёра чалавек не ўвайшлі ва ўчастковыя выбарчыя камісіі, паколькі ў траіх з іх былі дапушчаныя памылкі ў пратаколе па вылучэнні. Случчанка, якая вылучалася ад Беларускага саюза жанчын, была адсеяна з прычыны абмежаванай колькасці сяброў камісіі, але чаму менавіта ёй не хапіла месца ў УВК — патлумачана не было.

Пра імітацыйны характар паседжанняў па ўтварэнні УВК у раённых адміністрацыях Гомеля сведчыць той факт, што інфармацыя аб утварэнні ўчастковых камісій з указаннем колькасці асобаў, якія ўвайшлі ў іх склад, была апублікавана ў газеце «Гомельскія ведамасці» 7 жніўня, у той час як самі пасяджэнні адбыліся толькі 8 жніўня.

Яшчэ адна недарэчнасць была зафіксаваная назіральнікамі пры азнаямленні з вынікамі пасяджэнняў па ўтварэнні УВК, якая патрапіла ў прэсу: у гарвыканкамаўскай газеце Бабруйска ў спісе членаў УВК №27 Бабруйскай сельскай ВА №80 у інфармацыі пра Маргарыту Бяляеву ўказвалася, што яна вылучалася грамадзянамі шляхам падачы заявы, а насупраць яе прозвішча ў дужках стаяў запіс — «данясе».

На фоне астатніх рэгіёнаў вылучаліся па працягласці пасяджэнні па фарміраванні УВК Кастрычніцкай і Чыгуначнай адміністрацый Віцебска. Так, пасяджэнне ў Кастрычніцкай раённай адміністрацыі 8 жніўня працягвалася амаль 10 гадзін, у Чыгуначнай — больш за 6 гадзін. Прысутны на пасяджэнні старшыня абласной арганізацыі партыі левых «Справядлівы свет» Мікалай Селівашка адзначыў, што ў галасаваўшых былі папкі з паперамі, якія ім раздалі папярэдне, каб пазнаёміцца з кандыдатурамі. У выніку галасаванне праходзіла па вызначаным сцэнары:

прагаласавалі за «патрэбных людзей». М. Селівашка запытаўся, чаму некаторыя прагаласавалі супраць яго, на што прадстаўнікі адміністрацыі адказалі, што ўсе адмовы — «гэта асабістае меркаванне кожнага». Падобным чынам — з папкамі ў руках — галасавалі і на пасяджэнні ў Першамайскай раённай адміністрацыі, і з тым жа вынікам: прадстаўнікоў апазіцыйных партый у камісіі не ўключылі.

## 2.3. Склад участковых выбарчых камісій

У перыяд з 6 па 8 жніўня 2012 года на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь была створана 6301 участковая выбарчая камісія (УВК), у якія ўвайшлі 68 945 членаў, за мяжой — 43 УВК. Не адбылося пасяджэння па фарміраванні УВК у Стакгольме. У выніку беларуска-шведскага дыпламатычнага канфлікту персанал Пасольства Беларусі ў Швецыі быў адклікаць, а названы выбарчы ўчастак ліквідаваны.




Прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку палітычных партый, у складзе УВК займалі 45,3%, прадстаўнікі працоўных калектываў — 16,2%, вылучаныя ад грамадзян шляхам падачы заяў — 38,5%. Уведзеная ў 2010 г. у Выбарчы кодэкс (ВК) (артыкул 34) квота не менш за адну трацiну для прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый у складзе УВК запаўнялася за кошт павышэння долі прадстаўніцтва праўладных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Гэта не стварыла большага плюралізму ў складзе УВК і пакінула за выканаўчай уладай магчымасць поўнага кантролю за падлікам галасоў. У параўнанні з прэзідэнцкімі выбарамі 2010 г. роля працоўных калектываў як суб'ектаў выбарчага працэсу зменшылася амаль на 4%, а роля грамадскіх аб'яднанняў узрасла на 3,5%.

Конкурс на месца ва УВК у сярэднім па краіне склаў 1,2 чалавекі. Гэты паказальнік істотна адрозніваецца ў Мінску — 1,6. Зафіксаваны і нулявыя конкурсы ў склад УВК на пасяджэннях Лагойскага, Івацэвіцкага, Верхнядзвінскага райвыканкамаў і інш.

У агульнай колькасці членаў УВК доля прадстаўнікоў чатырох апазіцыйных партый склала каля 0,1% (61 чалавек з 68945), яны аказаліся прадстаўленыя менш чым у 1% камісій. Гэта выключыла апанентаў улады з арганізацыі галасавання і падліку галасоў і такім чынам, пазбавіла магчымасці ўплываць на працу УВК. На прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. доля прадстаўнікоў пяці апазіцыйных партый складала 0,26% (183 чалавекі з 70815).

# Прадстаўніцтва ў УВК




Параўнанне «працэнта праходнасці» праўладных і апазіцыйных партый і ГА дае падставы сцвярджаць аб дыскрымінацыйным падыходзе пры фармаванні УВК.

| № | Назва партыі/ГА | Вылучана ў УВК | Уключана ў УВК | % праходнасці |
|---|---|---|---|---|
| *Праўладныя партыі і ГА* | | | | |
| 1. | Беларуская аграрная партыя | 571 | 485 | 85% |
| 2. | Камуністычная партыя Беларусі | 845 | 635 | 75% |
| 3. | Рэспубліканская партыя | 262 | 235 | 90 % |
| 4. | Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці | 832 | 704 | 85 % |
| 5 | Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя | 609 | 551 | 90 % |
| 6. | Белая Русь | 4799 | 4189 | 87 % |
| 7. | БРСМ | 4345 | 3674 | 85 % |
| 8. | Беларускі саюз жанчын | 4037 | 3791 | 94 % |
| 9. | Беларускае ГА ветэранаў | 3138 | 2635 | 84 % |
| 10. | ФПБ | 10400 | 9418 | 91 % |
| *Апазіцыйныя партыі* | | | | |
| 11. | Беларуская партыя «Зялёныя» | 20 | 0 | 0 % |
| 12. | Беларуская партыя «Справядлівы свет» | 216 | 39 | 18 % |
| 13. | БСДП (Грамада) | 30 | 5 | 17 % |
| 14. | АГП | 240 | 5 | 2 % |
| 15. | Партыя БНФ | 158 | 12 | 8 % |

У Мінску, дзе традыцыйна значная палітычная актыўнасць, вылучалася 186 прадстаўнікоў апазіцыйных партый. У выніку ні адзін з іх не быў уключаны ў склад УВК (працэнт праходнасці — 0). У акругах, дзе балатаваліся лідары апазіцыйных арганізацый Аляксандр Мілінкевіч, Аляксей Янукевіч, Уладзімір Навасяд і іншыя, апазіцыйныя актывісты не ўвайшлі ў склад УВК, нягледзячы на актыўнае вылучэнне. Адсутнасць крытэрыяў для ўключэння альбо адхілення вылучаных кандыдатур дазваляла органам выканаўчай улады маніпуляваць працэсам.

Падаўляючая большасць асоб, якія былі ўключаны ў склад УВК, ужо былі ў складзе выбарчых камісій на мінулых мясцовых, парламенцкіх ці прэзідэнцкіх выбарах. Так, у склад УВК Смалявіцкага раёна было ўключанана 80% асоб, задзейнічаных на прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. У Івацэвіцкім раёне склад камісій на 90 % аказаўся ідэнтычным складу, які быў на апошняй прэзідэнцкай кампаніі 2010 года. У Гродна ў Ленінскім раёне ў склад участковых камісій увайшло 85% «праверaных кадраў», у Кастрычніцкім — 83,5%. У Слонімскім раёне больш за 90% сябраў сфармаваных камісій раней ужо мелі досвед працы ў камісіях. 86% сяброў участковых выбарчых камісій на Случчыне раней працавалі ў іх складзе. Ва ўчастковых выбаркамах, створаных на тэрыторыі Жабінкаўскага раёна, з зацверджаных у склад АВК 247 чалавек ранейшы вопыт правядзення выбараў мелі 220 чалавек (89%). У Гомелі на выбарах прэзідэнта ў 2010 годзе працавалі 9 з 12 сяброў камісіі ўчастка №5 Савецкай акругі, у камісіі ўчастка №4 Савецкай акругі — 9 з 14, у камісіі ўчастка №7 Савецкай акругі — 10 чалавек з 14 і г.д.

У Салігорску спіс зацверджаных сяброў участковых камісій таксама аказаўся практычна ідэнтычным складу УВК на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года. Па выніках аналізу сябра салігорскай філіі БХК Уладзімір Шыла высветліў, што, напрыклад, у склад камісіі №23 нібыта вылучыліся абсалютна новыя людзі, але хітрасць заключаецца ў тым, што склад камісіі №23 узору 2010 года — гэта на 90% сябры камісіі №29 на выбарах 2012 г.

Пры аналізе складу УВК была выяўлена тая ж тэндэнцыя, якая зафіксавана і пры фарміраванні АВК: дзеля выканання патрабавання Выбарчага кодэкса аб абмежаванні колькасці дзяржслужачых у камісіі адной трэцяй часткай, а таксама з мэтай стварэння імітацыі «шырокага грамадскага прадстаўніцтва», значная частка дзяржслужачых вылучалася ва УВК ад грамадскіх аб'яднанняў і шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў. Гэтым тлумачыцца ўпартае нежаданне паведамляць пра месцы працы сяброў УВК: у рэгіянальным друку, на сайтах гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў была апублікавана інфармацыя пра персанальны склад УВК, куды пераважна ўвайшлі толькі прозвішча, імя, імя па бацьку і спосаб вылучэння. Інфармацыя пра месцы працы не рабілася публічнай яшчэ і таму, што, як і падчас ранейшых выбараў, камісіі былі сфарміраваны і кіраваліся па вытворчым прынцыпе.

Гэта цалкам пацвярджаецца дадзенымі з рэгіёнаў, дзе назіральнікі змаглі рознымі шляхамі атрымаць інфармацыю пра месцы працы сяброў УВК. Напрыклад, такая інфармацыя была атрыманая з часткі ўчасткаў *Гомельскай Савецкай выбарчай акругі №34.*

*УВК участка №2.* Участак размешчаны ў будынку сярэдняй школы №3. З 14 сяброў камісіі як мінімум 10 працуюць у гэтай школе настаўнікамі ці выхавацелямі. Але ў камісію трапілі ці ад грамадзян, ці ад прафсаюза, ці ад «Чырвонага Крыжа» і «Беларускага фонду міру». Дырэктар школы Кацярына Савенка прыйшла ў камісію таксама як прадстаўнік грамадскасці — Беларускага саюза жанчын, а намеснік дырэктара Людміла Палякова — як прадстаўнік Белай Русі.

*УВК участка №5* у складзе 12 чалавек утворана з кіраўніцтва і супрацоўнікаў ААТ «Малочныя прадукты», прынамсі, восем чалавек дакладна працуюць на дадзеным прадпрыемстве. Не выключана, што і ўсе сябры камісіі працуюць на прадпрыемстве, але ўдакладніць гэта аказалася немагчыма. У склад камісіі ўвайшлі генеральны дырэктар ААТ «Малочныя прадукты» Уладзімір Коцур, яго намеснікі Любоў Арэшчанка і Таццяна Сарокіна, старшыня прафкама Таццяна Пацярайла, начальнік кадравага аддзела Таццяна Аднаочка. Праўда, прыйшлі яны ў камісію як прадстаўнікі грамадскасці — Белай Русі, Фонду міру, Саюза жанчын, і як вылучэнцы ад грамадзян.

*Камісія ўчастка №4* практычна цалкам (як мінімум 10 чалавек з 14) утворана з супрацоўнікаў КЖРЭУП «Савецкае» (камунальнае прадпрыемства) і яго структурных падраздзяленняў. У склад камісіі ўвайшлі майстры ўчасткаў, дырэктар структуры КЖРЭУП — РЭУ (рамонтна-эксплуатацыйных упраўленняў), вядучыя інжынеры РЭУ і іншыя спецыялісты камунальнага прадпрыемства. У камісіі камунальныя спецыялісты і начальнікі былі пазначаны як прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў — Чырвонага Крыжа, фонду міру, Белай Русі, а таксама як вылучэнцы ад грамадзян. Прадстаўнікі КЖРЭУП кампактна размясціліся дружным калектывам і ў *камісіі ўчастка №11.* З 14 сяброў камісіі ўчастка дакладна 11 працуе ў КЖРЭУП «Савецкае». Увайшоў у камісію і прадстаўнік грамадскасці — Беларускага фонду міру Фёдар Хахлоў. Праўда, аказалася, што ён працуе намеснікам дырэктара КЖРЭУП «Савецкае», хоць гэта і не пазначана ў спісе камісіі.

*Камісія ўчастка №7.* Як мінімум восем з'яўляюцца супрацоўнікамі Будаўніча-мантажнага трэсту №27 Гомеля. Прычым у камісію трапілі кіраўнікі і падначаленыя: намеснік генеральнага дырэктара трэсту №27 Мікалай Сугак, прафсаюзны дзеяч трэста Таццяна Скібунова, начальнік аддзела кадраў Анатолій Дробаў. Начальнікі будаўнічага трэста тут прадстаўлены як сябры Саюза афіцэраў ды Белай Русі. Пра начальніцкія пасады — ні слова.

Аналагічная сітуацыя зафіксавана і на ўчастках Гомельскай Цэнтральнай акругі №33.

*УВК участка №32* складалася з 13 чалавек, і толькі адзін сябра камісіі вылучаны працоўным калектывам школы №59. Астатнія ж, калі верыць спісу камісіі — спрэс грамадскасць: Беларускі фонд міру, Беларускі саюз жанчын, Чырвоны Крыж, Белая Русь ці вылучэнцы ад грамадзян. Праверка ж паказала, што як мінімум 11 сяброў камісіі працуюць настаўнікамі ў дадзенай сярэдняй школе №59. Дырэктар жа школы Аляксандр Калькоў таксама трапіў у камісію як прадстаўнік Беларускага фонду міру. Яшчэ як мінімум сем настаўнікаў сярэдняй школы №59 засядаюць ва ўчастковай камісіі №33.

*Ва ўчастковай камісіі ўчастка №30* літаральна ўсе сябры камісіі па спісе — прадстаўнікі грамадскасці і вылучэнцы ад грамадзян. На самой справе як мінімум 10 сяброў камісіі — настаўнікі сярэдняй школы №16 на чале з дырэктарам Ірынай Сляпцовай, якая прайшла ў камісію ад Беларускага саюза жанчын.

*На ўчастку №17* у склад камісіі ўвайшлі педагогі гімназіі №10, традыцыйна на чале з дырэктарам, Ірэнай Бяспалай. У камісіі з сямнаддццаці сяброў як мінімум 13 працуе ў гімназіі №10. Прычым ніводнага ўпамінання, што гэта — настаўнікі, у спісе камісіі няма, усе — прадстаўнікі грамадскасці (БРСМ, Саюз жанчын, Белая Русь, прафсаюз) ці вылучэнцы ад грамадзян.

Як мінімум 10 настаўнікаў і дырэктар прайшлі ў камісію ўчастка №13, размешчанага ў памяшканні сярэдняй школы №11 Гомеля. Практычна ўсе сябры камісіі працуюць у гэтай школе разам з дырэктарам Наталляй Літвінавай. Традыцыйна ўсе настаўнікі ў камісіі пазначаны як прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў.

Пінскі гарвыканкам сфармаваў 87 участковых камісій *Пінскай гарадской выбарчай акругі №14* таксама па вытворчым прынцыпе, хаця фармальна ўсё выглядала бездакорна. Супрацоўнікі прадпрыемстваў і ўстановаў, дзе месціліся выбарчыя ўчасткі, вылучыліся ў камісіі замаскіравана — ад такіх праўладных грамадскіх арганізацыяў, як Белая Русь, Беларускі саюз жанчын, Беларускі Чырвоны крыж, БРСМ, Беларускі фонд міру і ад прафсаюзаў. Хаця часам абыходзілася і без падобных хітрыкаў. Напрыклад, участковая камісія №12, якая месцілася ў Доме культуры ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў». У спісе гэтай камісіі пазначана, што 10 з 13 яе сяброў з'яўляюцца супрацоўнікамі холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў». Але, па інфармацыі мясцовых назіральнікаў, астатнія тры таксама працуюць на «Пінскдрэве», хаця замаскіраваліся за вылучэннем ад пярвічак ветэранскай арганізацыі, БРСМ і Белай Русі.

Спіс сяброў камісіі (пададзены па-руску):

| **«Участковая комиссия № 12 — Дом культуры закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев», тел. 35-67-75.** | | |
|---|---|---|
| 1. | Ботян Владимир Алексеевич | — от Пинской городской организации Белорусского общественного объединения ветеранов |
| 2. | Диковицкая Светлана Анатольевна | — от трудового коллектива службы директора по работе с персоналом закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 3. | Землянскова Юлия Олеговна | — от Пинской городской организации общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи» |
| 4. | Каленик Лилия Николаевна | — от трудового коллектива яслей-сада № 45 «Лесовичок» закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 5. | Козлова Ольга Васильевна | — от первичной организации Пинской городской организации общественного объединения «Белорусский союз женщин» закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |

| | | |
|---|---|---|
| 6. | Короткевич Валентина Сергеевна | — от трудового коллектива участка сборки и отделки филиала закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» — завод строганного шпона и мебели |
| 7. | Крупицкий Сергей Леонидович | — от трудового коллектива управления технического развития службы главного инженера закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 8. | Полховский Иосиф Иванович | — от первичной профсоюзной организации закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 9. | Полякова Валентина Павловна | — от трудового коллектива Дома культуры закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 10. | Трушко Николай Николаевич | — от Пинской городской организации республиканского общественного объединения «Белая Русь» |
| 11. | Савина Светлана Валерьевна | — от трудового коллектива цеха паросилового хозяйства и водопровода и канализации частного производственно-сервисного унитарного предприятия «Пинскдрев-Техэнергосервис» |
| 12. | Сафонов Евгений Александрович | — от трудового коллектива управления экономики закрытого акционерного общества «Холдинговая компания «Пинскдрев» |
| 13. | Юрашкевич Елена Федоровна | — от трудового частного транспортного унитарного предприятия «Пинскдрев-Автопарк» |

Такім чынам, працэс фарміравання УВК амаль нічым не адрозніваўся ад працэсу іх фарміравання падчас папярэдніх парламенцкіх (2008), мясцовых і прэзідэнцкіх (2010) выбараў. З пункту гледжання адпаведнасці нацыянальнаму заканадаўству гэты працэс адбываўся без значных парушэнняў, але яго вынік не дазваляе лічыць створаныя камісіі бесстароннімі і неперадузятымі.

## 2.4 Транспарэнтнасць пры фарміраванні УВК

Пасяджэнні выканкамаў і мясцовых адміністрацый адбываліся ва ўмовах адноснай адкрытасці для назіральнікаў. У пераважнай большасці выпадкаў УВК фарміраваліся непразрыста, у шэрагу выпадкаў назіральнікі не мелі магчымасці назіраць за працэдурай прыняцця рашэнняў.

Некаторыя назіральнікі сутыкнуліся з праблемай допуску на пасяджэнні органаў, якія фарміруюць УВК. Парушаючы частку 2 артыкула 39 Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», некаторыя выканкамы наогул адмовілі назіральнікам у праве прысутнічаць на пасяджэннях. Падобная сітуацыя была зафіксавана ў Глыбоцкім, Вілейскім, Лагойскім, Маладзечанскім, Аршанскім, Віцебскім райвыканкамах і інш.

Мелі месца факты ўтойвання інфармацыі пра час пасяджэнняў. Так, у рэжыме сакрэтнасці ад назіральнікаў былі сфарміраваны УВК Ленінскага раёна г. Магілёва. Пасяджэнне адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва адбылося зранку 6 жніўня, аднак пра гэта назіральнікі змаглі даведацца ўжо толькі пасля яго заканчэння. Праваабаронца Барыс Бухель 4 жніўня, падчас падачы дакументаў на вылучэнне ў склад адной з участковых камісій свайго калегі Аляксея Колчына, прасіў супрацоўнікаў аддзела па арганізацыйна-кадравай працы Адміністрацыі Ленінскага раёна паведаміць дату, месца і час правядзення пасяджэння па фарміраванні камісій. 5 жніўня ў 8.30 ён патэлефанаваў у гэты аддзел адміністрацыі і зноў запытаў, калі адбудзецца пасяджэнне, яму зноў сказалі, што не ведаюць, бо пададзена вельмі шмат дакументаў і яны апрацоўваюцца. Таксама праваабаронцу паведамілі, што і начальнік аддзела, і кіраўнік справамі адміністрацыі раёна, якія могуць адказаць на яго пытанні, знаходзяцца на планёрцы. 6 жніўня ў 9.30 праваабаронца датэлефанаваўся да кіраўніка справамі Аляксандра Паддубнага, які сказаў, што час правядзення пасяджэння адміністрацыі раёна невядомы, і прапанаваў патэлефанаваць перад абедам альбо пасля яго. Калі ж Барыс Бухель датэлефанаваўся да загадчыцы аддзела арганізацыйна-кадравай працы Марыны Хаданёнак, то яна паведаміла, што пасяджэнне ўжо адбылося — у 10.00. Адзін

з лідараў Магілёўскай арганізацыі Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Анатоль Заўялаў апынуўся ў такой жа сітуацыі. Ён быў у адміністрацыі Ленінскага раёна 6 жніўня з 7.45 да 8.30, і ніякай абвесткі пра дату і месца пасяджэння там не было. На яго пытанні намесніца старшыні АВК №85 Марына Хаданёнак і яе падначаленыя нічога не адказвалі. Калі ў 15.00 актывіст зайшоў да Марыны Хаданёнак і запытаў, чаму загадзя не паведамілі пра дату і месца правядзення пасяджэння адміністрацыі раёна, чыноўніца папросту адмовілася адказваць на пытанне. Варта дадаць, што праваабаронца Аляксей Колчын вылучаўся ў склад участковай выбарчай камісій выключна для таго, каб патрапіць на пасяджэнне раённай адміністрацыі па фармаванні ўчастковых выбаркамаў. Але зрабіць гэта, як і падчас мінулых кампаній, не атрымалася, як і патрапіць у склад камісіі.

У некаторых раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтах, мясцовых адміністрацыях назіральнікам была дадзена магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі вылучэння ў склад УВК. Аднак шмат дзе органы, якія ўтвараюць камісіі, не дазволілі назіральнікам і зацікаўленым асобам азнаёміцца з падобнымі матэрыяламі. Тым самым назіральнікі былі пазбаўлены магчымасці ўпэўніцца ў законнасці вылучэння кандыдатур у склад УВК. Напрыклад, на пасяджэнні Салігорскага выканаўчага камітэта 8 жніўня назіральнік ад БХК Леанід Мархотка спрабаваў атрымаць дакументы па вылучэнні кандыдатур у склад участковых камісій, аднак старшыня выканкама Аляксандр Рымашэўскі адмовіўся прадастаўляць дадзеную інфармацыю.

Такім чынам, у значнай ступені прынцып адкрытасці і галоснасці ў правядзенні выбарчых працэдур не забяспечваўся.

# РЭГІСТРАЦЫЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП

Згодна з Каляндарным планам, падача дакументаў у адпаведныя акруговыя камісіі і рэгістрацыя ініцыятыўных груп па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ажыццяўляліся з 15 да 25 ліпеня 2012 г.

Паводле артыкула 65 ВК, збор подпісаў выбаршчыкаў, які ажыццяўляецца ініцыятыўнай групай у колькасці не менш за 10 чалавек, з'яўляецца адным са спосабаў вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Асобу, якую прапануюць для вылучэння кандыдатам у дэпутаты, павінны падтрымаць не меней за 1000 выбаршчыкаў, што пражываюць на тэрыторыі дадзенай выбарчай акругі.

Падпісацца ў падтрымку вылучэння прапаноўваемых асоб можа кожны, хто валодае выбарчым правам, г. зн. з'яўляецца грамадзянінам Беларусі, які дасягнуў 18 гадоў. Выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры. Паводле артыкула 4 ВК, у выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія па прысудзе адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі, а таксама асобы, у адносінах да якіх мерай утрымання абрана ўтрыманне пад вартай.

Вылучэнне шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў выкарыстоўваецца як апазіцыйнымі, так і праўладнымі кандыдатамі ў якасці своеасаблівай формы датэрміновай папулярызацыі асобы кандыдата.

Паводле звестак Цэнтральнай камісіі, усяго ў АВК было пададзена 440 заяў аб рэгістрацыі, што складае чатыры ініцыятыўныя групы на кожную акругу. Але геаграфічнае размеркаванне актыўнасці не было раўнамерным. Найбольшая колькасць заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп пададзена ў Мінску: на 20 выбарчых акруг — 142 заявы (у сярэднім 7,1 заявы на акругу). У Магілёўскай вобласці на 13 акруг пададзены 64 заявы на рэгістрацыю ініцыятыўных груп (4,9), у Віцебскай вобласці на 14 акруг — 52 заявы (3,7), у Брэсцкай вобласці на 16 акруг — 48 заяў (3), у Гродзенскай вобласці на 13 акруг — 39 заяў (2,9), у Мінскай вобласці на 17 акруг — 48 заяў (2,8), у Гомельскай вобласці на 17 акруг — 47 заяў (2,8).

Усяго былі зарэгістраваны 352 ініцыятыўныя групы, якія планавалі вылучыць 330 асоб, паколькі некаторыя прэтэндэнты рэгістравалі некалькі ініцыятыўных груп у розных акругах. Усяго 12 грамадзян падалі дакументы ў дзве і больш камісіі. Напрыклад, адразу ў трох акругах Мінска — Старавіленскай №105, Ясенінскай №100 і Купалаўскай №95 — былі зарэгістраваны ініцыятыўныя групы па вылучэнні лідара АГП Анатоля Лябедзькі, у Гродна былі зарэгістраваны чатыры ініцыятыўныя групы кіраўніка Гродзенскай абласной арганізацыі партыі Вадзіма Саранчукова. Падчас ранейшых выбарчых кампаній назіральнікамі не фіксавалася тактыка рэгістрацыі некалькіх груп адной асобай.

Апазіцыйныя партыі зарэгістравалі ўсяго 58 ініцыятыўных груп: БПЛ «Справядлівы свет» — 26, ПБНФ — 18, АГП — 4 , БСДП (Г) — 9, Беларуская партыя «Зялёныя» — 1. Неапазіцыйныя партыі зарэгістравалі 7 ініцыятыўных груп: КПБ — 5, Беларуская аграрная партыя — 1, РППС — 1. Такім чынам, 66 вылучаных шляхам збору подпісаў грамадзян, або 20%, з'ўляліся прадстаўнікамі палітычных партый. На выбарах 2008 года былі зарэгістраваны ініцыятыўныя групы 115 сяброў партый, параўнанне з чым дазволіла старшыні ЦВК Л. Ярмошынай заявіць, што «актыўнасць палітычных партый знізілася практычна ў два разы».

Было адмоўлена 85 групам, што ў працэнтных адносінах амаль у 4 разы перавышае колькасць адмоў на мінулых парламенцкіх выбарах. Нягледзячы на гэта, няма падстаў канстатаваць, што практыка адмоў асобам, якія мелі намер быць вылучанымі, стала больш жорсткай. У гэты раз адмоўлена толькі 15 прэтэндэнтам, яшчэ трое самастойна адклікалі дакументы пасля рэгістрацыі. Што датычыць прычын адмоваў, то, напрыклад, у Івацэвіцкай выбарчай акрузе №11 сябру АГП Вікторыі Грынюк было адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў сувязі з адсутнасцю ў кіраўніка ініцыятыўнай групы, які падаваў заяву, даверанасці ад самога патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты. Двум актывістам Грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» было адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп у сувязі з тым, што прэтэндэнты не падавалі заявы асабіста, а адправілі іх па пошце (Іван Амельчанка, які планаваў балатавацца ў сталічнай Каліноўскага выбарчай акрузе №108, і Пётр Лебедзеў, які падаваў заяву па Жлобінскай акрузе №40).

| Год правядзення выбараў | Пададзена заявак | Адмоўлена ў рэгістрацыі | Зарэгістравана | % адмовы |
|---|---|---|---|---|
| 2004 | 635 | 71 | 564 | 11% |
| 2008 | 455 | 23 | 423 | 5% |
| 2012 | 440 | 85 | 354 | 19% |

Вялікая колькасць ініцыятыўных груп, якія не атрымалі рэгістрацыю, тлумачыцца яшчэ і тым, што групы Мікалая Статкевіча і Алеся Міхалевіча спрабавалі зарэгістравацца адразу ў некалькіх АВК (на рэгістрацыю ініцыятыўных груп Статкевіча дакументы былі пададзены ў 56 акруговых камісій, Міхалевіча — у 20).

Старшыня Цэнтральнай камісіі патлумачыла прычыну адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп Мікалая Статкевіча і Алеся Міхалевіча. Паводле Лідзіі Ярмошынай, Статкевіч не перадаваў ніякіх лістоў у выбарчыя камісіі праз адміністрацыю папраўчай установы, у якой ён адбывае тэрмін зняволення па крымінальнай справе; Міхалевіч знаходзіцца ў міжнародным вышуку, дакументы на рэгістрацыю яго ініцыятыўнай групы падаваліся па пратэрмінаванай даверанасці.

Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» не лічаць, што адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатамі ў дэпутаты А. Міхалевіча і М. Статкевіча заснаваны на законе[6], сыходзячы з таго, што вылучэнне кандыдата ў дэпутаты і зварот за рэгістрацыяй у якасці суб'екта выбарчага працэсу (ініцыятыўнай групы) — гэта форма рэалізацыі грамадзянамі права на ўдзел у выбарах. Абмежаванне такога права павінна грунтавацца на законе. Абмежаванні выбарчага права Мікалая Статкевіча прадугледжаны артыкулам 57 ВК. Аднак камісіі незаконна абмежавалі правы грамадзян, якія захацелі вылучыць вядомых палітыкаў, паколькі забарона на рэгістрацыю гэтых ініцыятыўных груп матывуецца адвольным тлумачэннем артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і артыкулаў 4 і 65 ВК. Фактычна сваімі рашэннямі АВК абмежавалі не правы Мікалая Статкевіча і Алеся Міхалевіча на ўдзел у выбарах, а правы грамадзян, якія аб'ядналіся ў ініцыятыўныя групы па іх вылучэнні. АВК не ўлічылі, што, напрыклад, падставы адмовы ў рэгістрацыі Мікалая Статкевіча могуць адпасці да моманту рэгістрацыі яго кандыдатам у дэпутаты. (Напрыклад, заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае магчымасць вызвалення ад адбыцця пакарання са зняццем судзімасці ці апраўданне ў парадку наглядная судовай вытворчасці). У выпадку, калі такія падставы не адпадуць, АВК павінны адмовіць у рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты ўжо менавіта Мікалаю Статкевічу.

6 6 Экспертнае заключэнне аб нерэгістрацыі ініцыятыўных груп Мікалая Статкевіча і Аляксея Міхалевіча [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://spring96.org/be/news/55169

# ЗБОР ПОДПІСАЎ ЗА ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

Згодна з Каляндарным планам, збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ажыццяўляўся з 25 ліпеня да 13 жніўня 2012 г. Працэс збору подпісаў рэгуляваўся артыкулам 65 ВК.

Працэдуры збору і праверкі подпісаў у новай рэдакцыі ВК ад 4 студзеня 2010 г. сталі больш ліберальнымі. У прыватнасці дзейнічалі наступныя нормы:

калі ў падпісных лістах, што паступілі ў адпаведную камісію, ёсць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі розных раёнаў, гарадоў абласнога падпарадкавання, раёнаў у горадзе, то праверцы і ўліку падлягаюць толькі подпісы, сабраныя на адпаведнай тэрыторыі (у папярэдняй рэдакцыі ВК подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць не ў адным населеным пункце, прызнаваліся несапраўднымі);

у падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі аднаго горада абласнога падпарадкавання, раёна, а ў гарадах з раённым падзелам — аднаго раёна (а не аднаго населенага пункта, як у папярэдняй рэдакцыі ВК);

падпісныя лісты завяраюцца членам ініцыятыўнай групы (а не кіраўнікамі мясцовых органаў улады, на тэрыторыі якіх ажыццяўляўся збор подпісаў, як у папярэдняй рэдакцыі ВК);

атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для збору подпісаў выбаршчыкаў не патрабуецца, калі пікетаванне адбываецца ў месцы, не забароненым мясцовымі органамі ўлады.

Падпісныя лісты здаюцца ў адпаведную АВК для праверкі дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў і рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты.

Згодна з выбарчым заканадаўствам, удзел адміністрацый арганізацый у зборы подпісаў, таксама як прымус у працэсе збору подпісаў і ўзнагарода выбаршчыкаў за ўнясенне подпісаў, не дапускаецца. Прэтэндэнты на статус кандыдата ў дэпутаты не маюць права прыцягваць асобаў, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні ці іншай службовай залежнасці, для ажыцяўлення ў працоўны час дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню. Парушэнне гэтых патрабаванняў можа стаць падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты.

Збор подпісаў ладзіўся як шляхам пікетавання, так і шляхам абыходу месцаў жыхарства выбаршчыкаў. Прычым іх выкарыстоўвалі і сябры ініцыятыўных груп праўладных, і сябры ініцыятыўных груп апазіцыйных кандыдатаў.

Усяго ў выбарчыя камісіі паступіла 223 камплекты подпісаў. Шэраг прэтэндэнтаў у кандыдаты вылучаліся адначасова некалькімі спосабамі. З іх толькі шляхам збору подпісаў — 123 прэтэндэнты, адначасова шляхам збору подпісаў і працоўнымі калектывамі — 88, шляхам збору подпісаў і палітычнымі партыямі — 8. Усімі трыма спосабамі было вылучана 4 прэтэндэнты ў кандыдаты. У параўнанні з папярэднімі парламенцкімі выбарамі 2008 года зафіксавана змяншэнне колькасці ўдзельнікаў выбарчай кампаніі, якія скарысталіся шляхам збору подпісаў дзеля вылучэння кандыдытамі ў дэпутаты.

| **Спосаб вылучэння кандыдатаў** | **2008 г.** | **2012 г.** |
|---|---|---|
| Шляхам збору подпісаў | 197 | 123 |
| Шляхам збору подпісаў і працоўнымі калектывамі | 93 | 88 |
| Шляхам збору подпісаў і палітычнымі партыямі | 24 | 8 |
| Шляхам збору подпісаў, палітычнымі партыямі і працоўнымі калектывамі | 4 | 4 |

## 1. Вызначэнне месцаў, забароненых для збору подпісаў

Згодна з Каляндарным планам, не пазней за 10 ліпеня 2012 года мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады павінны былі вызначыць месцы, забароненыя для збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты сябрамі ініцыятыўных груп. Па інфармацыі назіральнікаў, адпаведныя рашэнні былі прыняты своечасова.

У многіх рэгіёнах абмежаванні закранулі значныя тэрыторыі ў ажыўленых кропках буйных гарадоў, асабліва — Мінску. Так, згодна з рашэннем Мінгарвыканкама ад 5 ліпеня 2012 г., збор

подпісаў забаронены на асноўных плошчах горада (Кастрычніцкая, Перамогі, Незалежнасці, Прывакзальная), а таксама на аддегласці не менш 50 метраў ад будынкаў органаў дзяржаўнага кіравання, дашкольных і школьных аб'ектаў, прадпрыемстваў, якія забяспечваюць жыццядзейнасць дзяржавы (грамадскі транспарт, аб'екты водазабеспячэння і г.д.). Дазволена было збіраць подпісы ў пешаходных пераходах метрапалітэна.

Віцебскі гарвыканкам забараніў арганізоўваць пікеты ў самых цэнтральных і шматлюдных месцах абласнога цэнтра: гэта плошчы Перамогі, Леніна, Свабода, 1000-годдзя Віцебску, у парках Пераможцаў і імя Шмырова, а таксама бліжэй як 150 метраў ад адміністрацыйных будынкаў органаў улады, суда, пракуратуры і арганізацый, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва і бяспеку дзяржавы. Гэтаксама ў Віцебску нельга было збіраць подпісы на аб'ектах аховы здароўя, у падземных пераходах, на месцы правядзення кірмашоў, спартовых і культурніцкіх мерапрыемстваў, у тым ліку на «Славянскім базары».

Варта адзначыць, што, вызначаючы забароненыя для збору подпісаў тэрыторыі, мясцовыя органы ўлады не кіраваліся прынцыпам аднастайнасці, часам розны парадак выкарыстоўваўся ў межах адной акругі, якая ўключала ў сябе розныя тэрытарыяльныя адзінкі. Напрыклад, тэрыторыя Любанскага раёна на гэтых выбарах уваходзіла ў склад Салігорскай сельскай выбарчай акругі №69. Паводле рашэння Любанскага выканкама, было забаронена правядзенне пікетаванняў з мэтай збору подпісаў на аддегласці менш за 50 метраў ад будынкаў мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, суда, пракуратуры, тэрыторый арганізацый, якія забяспечваюць абароназдольнасць, бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва (грамадскі транспарт, прадпрыемствы вода-, цепла- і энергазберажэння, бальніцы, паліклінікі, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, агульнаадукацыйныя ўстановы). Пры гэтым на тэрыторыі Салігорскага раёна, частка якога таксама ўваходзіла ў Салігорскую сельскую выбарчую акругу №69, пікеты па зборы подпісаў каля арганізацый, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва, не з'яўляліся забароненымі. Сябра РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» Уладзімір Шыла, спрабуючы адстояць роўныя ўмовы для прэтэндэнтаў у кандыдаты па зборы подпісаў, падаў скаргу на рашэнне Любанскага выканкама ў Мінскі абласны выканаўчы камітэт. Адказ прыйшоў за подпісам галоўнага ідэолага Мінаблвыканкама Руслана Трухана, які адзначыў, што «мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы самастойна вызначаюць месцы, у якіх забаронена праводзіць пікетаванні з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў». Адпаведныя рашэнні, па словах Р. Трухана, прымаюцца з улікам спецыфікі таго ці іншага рэгіёна і падставаў для ўнясення зменаў у рашэнне Любанскага райвыканкама і прывядзення ўмоваў па збору подпісаў на Салігорскай сельскай выбарчай акрузе №69 да адзінай нормы няма. Варта заўважыць, што на прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. менавіта Мінскі абласны выканаўчы камітэт быў адным з нешматлікіх органаў, які пераглядаў рашэнні ніжэйшых выканкамаў на карысць пашырэння дазволеных месцаў.

У рашэннях па вызначэнні месцаў, забароненых для збору подпісаў, мясцовыя выканкамы выкарыстоўвалі вельмі неканкрэтныя фармулёўкі, якія давалі магчымасць надзвычай шырокага трактавання і маніпуляцый: «іншыя месцы, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва», «іншыя месцы, дзе функцыянаванне пікетаў будзе перашкаджаць дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў», «арганізацыі, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва» і інш. Напрыклад, Лепельскі райвыканкам забараніў збор подпісаў «у месцах, якія перашкаджаюць руху транспарту і людскіх плыняў». Сярод іншых забароненых месцаў рашэнне Гомельскага гарвыканкама №736 ад 6 ліпеня ўтрымлівала фармулёўку: а таксама «месцаў, дзе функцыянаванне пікетаў будзе ствараць перашкоды дзейнасці арганізацый ці ўяўляць небяспеку для жыцця і здароўя удзельнікаў пікетаў». Аналагічная фармулёўка ўтрымлівалася ў рашэнні Мазырскага райвыканкама: пікеты былі забаронены ў месцах, дзе іх функцыянаванне «будзе перашкаджаць дзейнасці арганізацый альбо ўяўляць небяспеку для жыцця і здароўя ўдзельнікаў пікетаў», але канкрэтна гэтыя месцы не былі названы, і заставалася незразумелым, хто і якім чынам павінен вырашаць — перашкаджае пікет «дзейнасці арганізацыі» ці не.

У некаторых выпадках незадаволеныя абмежаваннямі актывісты абскарджвалі рашэнні выканкамаў аб вызначэнні забароненых для збору подпісаў месцах. Так, прадстаўнік Партыі БНФ Віталь Амяльковіч звярнуўся ў суд з патрабаваннем прызнаць рашэнне Слуцкага райвыканкама ад 6 ліпеня 2012 года №2090 несапраўдным і абавязаць выканаўчую ўладу прыняць новае рашэнне дзеля забеспячэння выбарчых правоў жыхароў Слуцка і Слуцкага раёна. Падобная скарга была пададзеная і ў Брэсце, дзе прастора для магчымага збору подпісаў значна паменшылася ў параўнанні з мінулымі выбарамі. Пасля дадзенага звароту прадстаўнікоў апазіцыі былі зняты не-

каторыя забароны , аднак у спісе месцаў, забароненых для збору подпісаў, пакінута пешаходная вуліца Савецкая. У горадзе Слоніме Гарадзенскай вобласці выканкам адмяніў сваё рашэнне пра забароненыя для збору подпісаў месцы, прыняўшы новае праз тыдзень. На пытанне, чаму выканкам адмяніў сваё рашэнне аб месцах, забароненых для пікетавання, якое было апублікавана раней у раённай газеце «Слонімскі веснік», старшыня Слонімскай выбарчай акруговай камісіі №58 (яна ж кіраўнік справамі райвыканкама) Алена Мачаліна сказала: «Перадумалі і адмянілі!» Больш ліберальнае ў параўнанні з выбарамі 2010 г. рашэнне аб вызначэнні месцаў, забароненых для пікетавання, было прынята Баранавіцкім гарвыканкамам.

## 2. Умовы збору подпісаў

Пры зборы подпісаў ініцыятыўныя групы апазіцыйных актывістаў былі пастаўлены ў няроўныя ўмовы ў параўнанні з ініцыятыўнымі групамі праўладных вылучэнцаў. Назіральнікамі зафіксаваны выпадкі, калі кіраўніцтва студэнцкіх і працоўных інтэрнатаў не дазваляла збіраць там подпісы, матывуючы гэта адсутнасцю дазволу з боку кіраўніцтва тых устаноў, у адміністрацыйным падпарадкаванні якіх гэтыя інтэрнаты знаходзяцца. Так, кіраўніцтва інтэрнатаў магілёўскага завода «Зеніт» матывавала гэта адпаведным распараджэннем намесніка дырэктара па ідэалогіі Мікалая Міхалені. 31 ліпеня падчас збору подпісаў у падтрымку Леаніда Падбярэцкага сябра яго ініцыятыўнай групы Аляксей Паўлоўскі быў затрыманы і дастаўлены ў апорны пункт міліцыі для высвятлення абставін. Пры гэтым камендант інтэрната завода «Зеніт» па вул. Кедравай, д. 11 збіраў подпісы за праўладнага прэтэндэнта — дзеючага дэпутата Уладзіміра Васіленку. Аляксей Паўлоўскі спрабаваў патрапіць чарговы раз 7 жніўня ў інтэрнат па вуліцы Ціміразеўскай, 11, і зноўку сутыкнуўся з непрабіўной сцяною з супрацоўніц.

За вылучэнне ў дэпутаты пракурора Магілёўскай вобласці Эдуарда Сянкевіча збор подпісаў праводзілі камендант і выхавацелька інтэрната па вуліцы Касманаўтаў, 45 у Магілёве. Калі адзін з жыхароў інтэрната, актывіст Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) Мікалай Залозны, які працуе слесарам-сантэхнікам у дадзеным інтэрнаце, спытаў, ці ўваходзіць камендант і выхавальніца ў склад ініцыятыўнай групы, яны нічога не адказалі. Але праз пару дзён пасля гэтага Мікалая Залознага зноў выклікалі ў кабінет да каменданта і сказалі падпісацца за Эдуарда Сянкевіча. На заўвагу Мікалая, што ён ужо падпісаўся, прысутныя ў кабінеце сказалі, што тады подпісы збіралі не сябры ініцыятыўнай групы, таму яны несапраўдныя і трэба падпісацца яшчэ раз. На гэты раз пры сабе жанчыны мелі пасведчанні сяброў ініцыятыўнай групы. Самому Мікалаю Залознаму, які з'яўляўся сябрам ініцыятыўнай групы апазіцыйнага кандыдата Леаніда Падбярэцкага, у інтэрнаце збіраць подпісы забаранілі. «Вы працуеце ў сістэме камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, абслугоўваеце інтэрнаты, дзе таксама пражываюць і непаўнагадовыя дзеці, і Вашыя погляды, калі яны супярэчаць дзяржаўнаму ладу, могуць негатыўна на іх адбівацца», — патлумачыў начальнік жыллёва-эксплуатацыйнага прадпрыемства Павел Шышоў. Таксама зборшчык подпісаў быў папярэджаны П. Шышовым, што ў падпарадкаваным яму інтэрнатах дзейнічае прапускны рэжым, і староннім людзям, у якіх там няма знаёмых ці сваякоў, туды ў мэтах захавання асабістай маёмасці і спакою грамадзянаў, уваход забаронены.

У Баранавічах за праўладнага вылучэнца ў дэпутаты Аляксандра Сяцко збіралі подпісы вахцёры інтэрната № 6 па вуліцы Кірава, д.73/2 у працоўны час, нават не пытаючыся пашпартоў. Скаргу на дадзенае парушэнне накіраваў у акруговую камісію іншы прэтэндэнт у кандыдаты па Баранавіцкай Усходняй выбарчай акрузе №6 Рыгор Грык. У адказе старшыня АВК Тамара Шукала паведаміла, што для разгляду заявы сябры акруговай камісіі наведалі інтэрнат і размаўлялі з загадчыцай установы, дзяжурным вахцёрам, жыльцамі, вывучылі запісы у журнале рэгістрацыі наведвальнікаў, аднак фактаў парушэння заканадаўства не выявілі. Тым не менш, у пункце 2 рашэння АВК №6 ад 08.08.2012г. быў прызнаны факт, што на стале ў вахцёра інтэрната быў падпісны ліст за Аляксандра Сяцко. У сувязі з гэтым АВК звярнула ўвагу ініцыятыўнай групы Аляксандра Сяцко «на недапушчэнне халатнага стаўлення да падпісных лістоў».

У шматлікіх выпадках быў задзейнічаны адміністрацыйны рэсурс (збор подпісаў у памяшканнях дзяржаўных арганізацый у працоўны час, прыцягненне службовых асоб, якія не з'яўляюцца сябрамі ініцыятыўных груп, і інш.). Напрыклад, у г. Слуцку на прадпрыемствах «Слуцкмежрайгаз» і «Слуцкі мясакамбінат» арганізавалі збор подпісаў за дзеючага дэпутата Інэсу Кляшчук. Супрацоўнікі ставілі свае подпісы пад кантролем адміністрацыі ў аддзеле кадраў у загадзя падрыхтаваных падпісных аркушах з запоўненымі пашпартнымі дадзенымі. Зафіксаваны факты,

калі адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў забаранялі сваім падначаленым падтрымліваць вылучэнне апазіцыйнага кандыдата ў дэпутаты ці патрабавалі ад іх спыніць сяброўства ў яго ініцыятыўнай групе. Адміністрацыя «Слуцкага цукроварафінаднага камбіната» і Слуцкай цэнтральнай раённай бальніцы, праводзячы збор подпісаў за Інэсу Кляшчук, адначасова ў вуснай форме забараніла супрацоўнікам ставіць подпісы ў падтрымку альтэрнатыўных прэтэндэнтаў у кандыдаты. У г. Брэсце ў гарадской паліклініцы №6 пацыентам на прыёме прапаноўвалі падпісацца ў падтрымку праўладнага вылучэнца Валянціна Мілашэўскага. За іншага праўладнага вылучэнца — дырэктара Брэсцкага цэнтральнага ўнівермага і адначасова кіраўніка раённай суполкі РГА «Белая Русь» Віктара Валюшыцкага «паклапацілася» старшыня падатковай інспекцыі Маскоўскага раёна горада Брэста Лілія Сіняк, якая парэкамендавала супрацоўнікам адлучыцца ад працы і паставіць подпісы. У вайсковых частках г. Брэста кантрактнікаў прымушалі падпісвацца за вылучэнне Ваеннага камісара Брэсцкага абласнога ваеннага камісарыята Уладзіміра Базанава. У г. Наваполацку дырэктар аднаго з гарадскіх рынкаў збірала подпісы ў прадпрымальнікаў, якія арэндуюць месцы на гэтым рынку, у падтрымку старшыні гарадскога аддзялення РГА «Белая Русь» Вадзіма Дзевятоўскага. На працоўных аб'ектах прадпрыемства «Райводаканал» Івацэвіцкага ЖКГ прадстаўнікі адміністрацыі збіралі подпісы ў падтрымку дэпутата ад Івацэвіцкай выбарчай акругі № 11 генеральнага дырэктара гэтага прадпрыемства Леаніда Кавалевіча. Калектыў баранавіцкага станкабудаўнічага завода ЗАТ «Атлант» вылучыў кандыдатам у дэпутаты Палітыка Вольгу, якая кіруе на заводзе ГА «Белая Русь». Збор подпісаў за яе ў працоўны час суправаджаўся агітацыяй. Праз некалькі дзён Вольга Палітыка была вылучана яшчэ і калектывам Баранавіцкага аўтаагрэгатнага завода. Ідэолагі згаданых прадпрыемстваў арганізоўвалі збор подпісаў за яе ў працоўны час. За галоўнага ўрача Гомельскага абласнога кардыялагічнага дыспансера, дэпутата абласнога Савета дэпутатаў, члена Савета Рэспублікі Ганну Лапаціну, якая вылучалася па Гомельскай Прамысловай акрузе, подпісы збіраліся ў наведвальнікаў мясцовай паліклінікі, прычым матывавалася гэта тым, што трэба падтрымліваць работнікаў медыцыны, бо яна ў Беларусі бясплатная.

Пікеты па зборы подпісаў адбываліся пераважна без перашкод, зафіксаваны адзінкавыя выпадкі падобных дзеянняў. Так, 27 ліпеня ў Слоніме спадарыня Скок, адміністратар рынка «Касаўскі», каля ўваходу ў які быў наладжаны пікет па зборы подпісаў за лекара-траўматолага, кіраўніка слонімскай суполкі Партыі БНФ Івана Шэгу, пачала выказваць сваё незадавальненне і запатрабавала згарнуць мерапрыемства. Зборшчыкі подпісаў звярнулі ўвагу адміністратара, што дадзенае месца не ўключана райвыканкамам для правядзення пікетаў і параілі спраўдзіць гэта. Спадарыня Скок звярнулася ў Слонімскі райвыканкам, адкуль прыехалі супрацоўнікі і папрасілі паказаць пасведчанні сяброў ініцыятыўнай групы ў зборшчыкаў. Паколькі з пасведчаннямі аказалася ўсё ў парадку, збор подпісаў працягнуўся далей без перашкод.

6 жніўня на пляцоўцы каля універмага «Гомель» адбываўся пікет па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатам у дэпутаты па Гомельскай Цэнтральнай акрузе Міхаіла Бязносенкі, актывіста грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду». Да зборшчыкаў подпісаў падышлі супрацоўнікі ўнівермагу і загадалі адысці далей ад крамы, бо, маўляў, дадзеная тэрыторыя належыць універмагу, а адміністрацыя гандлёвага прадпрыемства супраць пікета. Зборшчыкі подпісаў нагадалі адміністрацыі, што дадзенае месца не забароненае для пікетаў. Супрацоўнікі ўнівермага абяцалі выклікаць міліцыю, але калі зборшчыкі подпісаў пачалі тэлефанаваць журналістам, то прадстаўнікі адміністрацыі зніклі ў будынку.

На гэтым этапе назіральнікі фіксавалі выпадкі складання актаў, вынясення пісьмовых папярэджанняў і прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці некаторых удзельнікаў выбарчай кампаніі.

30 ліпеня на патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты ад Купалаўскай выбарчай акругі №95 г.Мінска актывіста кампаніі «Гавары праўду» Міхаіла Пашкевіча быў складзены акт за парушэнне ВК. Міхаіл Пашкевіч быў абвінавачаны ў датэрміновай агітацыі, якую знайшлі ў тэксце біяграфіі кандыдата і ў выкарыстанні ім сімволікі кампаніі «Гавары праўду». Пазней АВК паведаміла Міхаілу Пашкевічу, што парушэнняў нормаў ВК у дзеяннях яго ініцыятыўнай групы не выяўлена.

Атрымаў пісьмовае папярэджанне АВК слонімскі актывіст, сябра Партыі БНФ Іван Шэга. У працы яго ініцыятыўнай групы былі выяўлены фармальныя парушэнні. Лагойская акруговая выбарчая камісія №75 двойчы вынесла папярэджанне Валянціне Каляка. Першае было абскарджана ў ЦВК і скасавана.

Кацярыне Сакалоўскай, якая вылучалася ў кандыдаты ў дэпутаты ў сталічнай Матусевіцкай выбарчай акрузе №103, было вынесена два папярэджанні ад акруговай камісіі. Абодва папярэджанні К.Сакалоўская атрымала за збор подпісаў не сябрамі яе ініцыятыўнай групы. У першы раз на зборы подпісаў «папаліся» тры чалавекі, якія не мелі пасведчанняў сяброў ініцыятыўнай групы — яны працавалі ў пікеце на пляцоўцы каля станцыі метро Каменная горка. У другі раз у гэтым жа пікеце быў заўважаны адзін чалавек, які збіраў подпісы без пасведчання. К. Сакалоўская двойчы прыходзіла на экстранныя паседжанні камісіі, дзе ёй выносіліся папярэджанні, і абодва разы выбачалася і прызнавала сваю віну. Камісія была настроена да беспартыйнай прэтэндэнткі ў дэпутаты мірна і рэкамендавала вывучаць заканадаўства.

Прыхільнікі байкоту выбараў, якія зарэгістравалі свае ініцыятыўныя групы, таксама праводзілі пікеты па зборы подпісаў, але не з мэтай вылучэння ў якасці кандыдатаў, а за байкот і вызваленне палітвязняў. 31 ліпеня Марына Хоміч, актывістка аргкамітэта па стварэнні БХД, ладзіла пікет у цэнтры сталіцы. На інфармацыйных стэндах была змешчана інфармацыя пра палітвязняў і лозунгі «Выбараў няма!», «Не хадзіце на выбары — вас падмануць!». Супрацоўнікі міліцыі папярэдзілі Марыну Хоміч, што яе лозунгі не з'ўляюцца перадвыбарчымі, а пікет падпадае пад дзеянне Закона «Аб масавых мерапрыемствах». Сапраўды, згодна з дзеючым заканадаўствам, пікеты ў падтрымку байкоту выбараў можна трактаваць як датэрміновую агітацыю. Ініцыятыўныя групы маюць права праводзіць пікеты для збору подпісаў выключна за вылучэнне свайго прэтэндэнта і для інфармавання аб ім выбаршчыкаў. Агітацыя за байкот выбараў, з'ўляецца адным з відаў перадвыбарчай агітацыі, час якой пачынаецца з моманту рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Для правядзення пікетаў з мэтамі, не датычнымі збору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў, неабходна атрымаць дазвол Мінгарвыканкама ў адпаведнасці з Законам «Аб масавых мерапрыемствах».

Варта адзначыць, што ўлады даволі талерантна ставіліся да падобных парушэнняў, паколькі былі відавочна зацікаўленыя ў наяўнасці кандыдатаў у дэпутаты, нават калі ініцыятыўныя групы агітавалі за байкот выбараў, але фіксаваліся і факты прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за падобныя дзеянні.

22 жніўня ў судзе Савецкага раёна Мінска адбыўся разгляд адміністрацыйных спраў актывістаў ствараемай партыі БХД Галіны Каржанеўскай і Іны Лойкі, якія ўдзельнічалі ў пікетах па зборы подпісаў з мэтай закліку да байкоту выбараў. Суд вынес рашэнне аштрафаваць актывістак на тры базавыя велічыні кожную.

Прэтэндэнт на дэпутацкі мандат па Барысаўскай гарадской выбарчай акрузе №62, намеснік старшыні АГП Леў Марголін і яго даверанная асоба Міхаіл Васільеў былі аштрафаваныя на 30 і 20 базавых велічынь адпаведна за правядзенне 4 жніўня пікета па зборы подпісаў, які быў кваліфікаваны як парушэнне арт. 23.34 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства). Нагодай паслужыў надпіс на стэндзе ініцыятыўнай групы «За справядлівыя выбары без Лукашэнкі», пры гэтым выбаршчыкаў прасілі ставіць подпіс не «за» прэтэндэнта, а менавіта «за» справядлівыя выбары. Пастанова суда Барысаўскага раёна абскарджана ў Мінскі абласны суд, але безвынікова.

У некаторых выпадках пікеты па зборы подпісаў выкарыстоўваліся для прыцягнення ўвагі грамадскасці да наяўнасці палітычных зняволеных у Беларусі. Так, актывісты грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» і Руху «За свабоду» 12 жніўня правялі ў Мінску сумесны пікет, прысвечаны Дню нараджэння экс-кандыдата ў прэзідэнты Мікалая Статкевіча, які знаходзіцца ў турме. У акцыі бралі ўдзел родныя палітзняволеных : жонка Мікалая Статкевіча — Марына Адамовіч, нявеста Дзмітрыя Дашкевіча — Наста Палажанка, вядомыя палітыкі і актывісты: Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Фядута, Андрэй Дзмітрыеў, Павел Вінаградаў і іншыя. Акцыя прайшла без эксцэсаў і наступстваў.

# РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Згодна з Каляндарным планам, рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты ажыццяўлася АВК не ранней за 40 дзён і завяршалася не пазней за 30 дзён да пачатку выбараў — з 14 да 23 жніўня 2012 г. адпаведна.

## 1. Прававыя аспекты

Працэс рэгістрацыі кандыдатаў рэгуляваўся артыкулам 68 ВК, а таксама адпаведнымі Пастановамі Цэнтральнай камісіі[7].

Устаноўлены арт. 66 ВК пералік дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдатаў, уключае сярод іншага і дэкларацыю аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у дэпутаты. Пры ўказанні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці звестак, неадпаведнасць якіх мае істотны характар, АВК можа адмовіць у рэгістрацыі кандыдата.

Змены ВК, унесеныя ў 2010 г., спрасцілі працэдуры рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. На спрашчэнне працэдур рэгістрацыі кандыдатаў была накіравана і Пастанова Цэнтральнай камісіі №35, згодна з якой пад істотным характарам не адпаведных рэчаіснасці звестак разумеецца дэкларaванне меншага памеру агульнай сумы гадавога даходу, калі неадпаведнасць складае больш за 20% ад агульнай сумы гадавога даходу. Таксама істотны характар неадпаведнасці ў дэкларацыі стварае адсутнасць звестак пра нерухомасць, якая належыць асобе па праве ўласнасці, пра асабісты аўтатранспарт, каштоўныя паперы (акцыі) і інш. Не маючай істотнага характару прызнаецца адсутнасць звестак аб даходах у выглядзе кошту прафсаюзных пуцёвак, аб матэрыяльнай дапамозе, кампенсацыях ды інш.

Падчас выбараў Прэзідэнта ў 2010 г. пад значным характарам неадпаведнасці звестак, згодна з пэўным тлумачэннем Цэнтральнай камісіі, разумелася перавышэнне недакладнасцяў у дэкларацыі на 10% ад агульнай сумы гадавога даходу.

Недакладнасць подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах (больш за 15% ад агульнай колькасці правераных подпісаў) з'яўляецца адной з падстаў для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата. Гэта робіць назіранне за адпаведнасцю працэдуры іх праверкі патрабаванням ВК актуальнай і важнай часткай грамадскага кантролю за выбарчым працэсам.

Працэдура праверкі подпісаў АВК апісана ў артыкуле 67 ВК. Асноўным з'яўляецца тое, што праверцы падвяргаецца не менш за 20% подпісаў у падпісных лістах ад колькасці, неабходнай для рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты, што складае не менш за 200 подпісаў. Калі недакладных подпісаў выбаршчыкаў выяўлена больш за 15%, то праводзіцца дадактовая праверка яшчэ 15% подпісаў ад колькасці, неабходнай для рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты (150 подпісаў).

У выпадку, калі сумарная колькасць недакладных подпісаў, выяўленых пры праверцы, складзе больш за 15% ад агульнай колькасці, далейшая праверка спыняецца.

Прызнанне дакладнымі подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах адбываецца ў парадку, прадугледжаным ч. 14, 16 і 17 арт. 61 ВК. Несапраўднымі подпісамі лічацца: фіктыўныя подпісы (выкананыя ад імя неіснуючых асобаў і якія выдаюцца за сапраўдныя); подпісы выбаршчыкаў, выкананыя ад імя розных асобаў адной асобай ці ад імя адной асобы іншай асобай; подпісы асобаў, якія не валодаюць выбарчым правам; подпісы выбаршчыкаў, якія ўказалі ў падпісным лісце дадзеныя, неадпавядаючыя рэчаіснасці; подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да ўстаноўленага тэрміну вылучэння кандыдатаў; подпісы выбаршчыкаў, калі ў звестках пра іх адсутнічаюць адно ці некалькі дадзеных, патрабаваных Кодэксам; подпісы выбаршчыкаў, калі дадзеныя аб іх унесеныя ў падпісны ліст нерукапісным спосабам ці алоўкам, а таксама подпісы, дата ўнясення якіх прастаўленая выбаршчыкам неўласнаручна; усе подпісы выбаршчыкаў у падпісным лісце, калі подпісы сабраныя асобай, якая не з'яўляецца членам ініцыятыўнай групы, ці калі падпісны ліст не завераны членам ініцыятыўнай групы альбо завераны іншым членам ініцыятыўнай групы, не збіраўшым гэтыя подпісы; подпісы выбаршчыкаў, сабраныя з парушэннем патрабаванняў ч.8 арт. 61 ВК.

---

7 Пастанова ад 19.06.2012 года № 23 «О разъяснении применения положений Избирательного кодекса Республики Беларусь, предусматривающих порядок выдвижения кандидатов в депутаты путем сбора подписей избирателей при проведении выборов депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва»; Пастанова ад 05.07.2012 года №35 «О разъяснении применения положений Избирательного кодекса Республики Беларусь, предусматривающих декларирование доходов и имущества лиц, выдвинутых кандидатами в депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва»

Пастанова Цэнтральнай камісіі №23 дазволіла ўносіць у падпісны ліст звесткі пра выбаршчыка не толькі члену ініцыятыўнай групы і самому выбаршчыку, але і іншым асобам. Гэта фактычна з'явілася легітымізацыяй адміністрацыйнага рэсурсу і ўступіла ў супярэчнасць з артыкулам 61 ВК, які ўстанаўлівае, што ўсе подпісы ў падпісным лісце лічацца несапраўднымі, калі яны сабраны асобай, якая не з'яўляецца сябрам ініцыятыўнай групы.

Згодна з арт. 68 ВК АВК правярае адпаведнасць парадку вылучэння кандыдата ў дэпутаты і прымае рашэнне аб яго рэгістрацыі ці адмове ў рэгістрацыі. Рашэнне можа быць абскарджана асобай, якая была вылучана кандыдатам у дэпутаты, у Цэнтральную камісію і Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

## 2. Транспарэнтнасць працэдуры праверкі подпісаў

Большасць назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», зарэгістраваных у АВК, не мелі магчымасці назіраць за правядзеннем праверкі дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах. Толькі на чатырох акругах 110 назіральнікам дазволілі азнаёміцца з дакументамі вылучэнцаў. Камісіі матывавалі свае адмовы тым, што ў артыкуле 13 ВК у пераліку правоў назіральніка няма прамога ўказання на такое права.

АВК ажыццяўлялі праверку дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў загадзя па-за межамі паседжанняў, хоць Выбарчы кодэкс не ўтрымлівае такую форму працы, а на пасяджэннях звычайна толькі агучваліся вынікі такіх праверак. Так, напрыклад, у адказах на заявы назіральнікаў Рамана Юргеля і Святланы Рудкоўскай (г. Гродна), Васіля Ліпскага (г. Магілёў), Леаніда Мархоткі (г. Салігорск) з просьбай прысутнічаць пры праверцы дакладнасці подпісаў указвалася, што закон такога права назіральнікам не дае. А назіральніцы па Грушаўскага акрузе № 98 Мінска Наталлі Манькоўскай увогуле адказалі, што прысутнасць назіральніка пры праверцы сапраўднасці подпісаў з'яўляецца ўмяшальніцтвам у працу камісіі.

Некаторыя камісіі не аспрэчвалі права назіральнікаў прыстнічаць на адпаведных паседжаннях. Так, у адказе назіральніку па Паўднёва-Заходняй акрузе №99 Мінска Васілю Санковічу камісія паведаміла: «У адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 13 Выбарчага кодэкса, вы як назіральнік маеце права прысутнічаць на паседжанні камісіі, дзе будзе вызначацца парадак праверкі дакументаў, прадстаўленых для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў РБ, на паседжанні камісіі, дзе будуць разглядацца матэрыялы праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, а таксама на паседжанні камісіі, дзе будзе разглядацца пытанне аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Аб'явы аб тэрмінах паседжанняў камісіі будуць загадзя вывешаны ў памяшканні акруговай камісіі». Тым не менш, Санковіча да праверкі подпісаў не дапусцілі.

Назіральніку па Жодзінскай выбарчай акрузе №64 Аляксею Лапіцкаму ў пісьмовай адмове на просьбу аб магчымасці прысутнічаць пры праверцы подпісаў растлумачылі, чаму гэта немагчыма: «Пры праверцы дакладнасці подпісаў у падпісных аркушах альбо іншых дадзеных, якія пазначаны ў адносінах да выбаршчыкаў, сябры камісіі маюць права для ўдакладнення пытання звяртацца непасрэдна да выбаршчыкаў па месцы жыхарства, абтэлефаноўваць, а таксама звяртацца ў адпаведныя дзяржаўныя органы (падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі органаў ГАУС, ЖЭУ). Сябры камісіі працуюць па індывідуальных планах напрацягу дня, а таксама ў вечаровы час, калі выбаршчыкі прыходзяць з працы».

Варта адзначыць, што Цэнтральная камісія цалкам падтрымала дзеянні АВК па нядопуску назіральнікаў да працэдуры праверкі подпісаў. На звароты назіральнікаў у ЦВК прыходзілі ідэнтычныя адказы. Так, праваабаронца з Магілёва Аляксей Колчын, зарэгістраваны назіральнікам у акруговай выбарчай камісіі №85, хацеў назіраць за працэдурай праверкі подпісаў выбаршчыкаў гэтай камісіяй, пра што і напісаў адпаведную заяву. Аднак камісія ў сваім адказе абышла ягоную просьбу поўным маўчаннем. Пасля гэтага Аляксей Колчын звярнуўся са скаргай у Цэнтрвыбаркам. У сваім лісце Лідзія Ярмошына адзначыла, што назіранне за працэдурай праверкі подпісаў выбаршчыкаў «не можа быць забяспечана, паколькі не заснавана на законе».

Назіральнік ад БХК у акруговай камісіі Салігорскай гарадской выбарчай акругі №68 Леанід Мархотка звярнуўся ў ЦВК з патрабаваннем абавязаць адпаведны выбаркам забяспечыць яму магчымасць свабоднага азнаямлення з дакументамі аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Сама акруговая выбарчая камісія прадставіць такую мажлівасць назіральніку ад-

мовілася. У адказе, які прыйшоў з Цэнтральнай выбарчай камісіі, адзначалася: «нормы выбарчага заканадаўства не абавязваюць старшыню, а таксама членаў (акруговай) камісіі прадстаўляць для азнаямлення назіральнікам дакументы, якія трапілі ў (акруговую) камісію».

Разам з тым у асобных, хаця і адзінкавых, АВК кіраўніцтва стварыла неабходныя ўмовы для назірання і кантролю на этапе рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Допуск да ўсіх пратаколаў і падпісных лістоў меў назіральнік Днепра-Бугскай ВА №10, мог прысутнічаць на праверцы подпісаў назіральнік Вілейскай ВА №74 і інш.

Непразрыстасць працэдур праверкі дакументаў аб вылучэнні кандыдатаў не дае магчымасці ацэньваць, наколькі працэдуры праверкі подпісаў выбаршчыкаў аб вылучэнні кандытаў у дэпутаты адпавядалі патрабаванням выбарчага заканадаўства, ці з'яўляліся яны аб'ектыўнымі і ці не залежалі ад палітычна матываванага падыходу з боку АВК.

## 3. Вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты

Згодна звестак Цэнтральнай камісіі, усяго па краіне рознымі шляхамі былі вылучаны 494 асобы, з іх зарэгістраваны 363 кандыдаты, што на 90 чалавек больш, чым было ў 2008 годзе, 122 (24,6%) прэтэндэнтаў атрымалі адмову ў рэгістрацыі. 9 зарэгістраваных АВК кандыдатаў адмовіліся ад далейшага ўдзелу ў выбарах. У чатырох акругах выбары былі безальтэрнатыўнымі (дзве акругі ў Мінскай, адна — у Брэсцкай і адна — у Гродзенскай вобласці). У 2008 годзе было 16 безальтэрнатыўных акругаў.

Прадстаўнікі палітычных партый вылучылі 204 кандыдаты, што складае 41% ад агульнай колькасці вылучаных, у 2008 годзе іх было 50. Старшыня ЦВК Л. Ярмошына патлумачыла павелічэнне актыўнасці наступным чынам: «Пазітыўна спрацавалі ўсе новаўвядзенні 2010 года. Быў спрошчаны парадак вылучэння ад палітычных партыяў, спрошчаны парадак збору подпісаў, зменшыліся патрабаванні да падачы дэкларацыі».

Агулам 8 партый удзельнічалі ў парламенцкай кампаніі, столькі ж удзельнічала і на папярэдніх парламенцкіх выбарах. Адмоўлена ў рэгістрацыі 23% вылучэнцаў ад палітычных партый, з іх 19,5% — гэта адмовы вылучэнцам ад апазіцыйных партый.

**Вынікі рэгістрацыі партыйных кандыдатаў наступныя:**

| Назва палітычнай партыі | Колькасць вылучаных | Колькасць зарэгістраваных | Колькасць адмоў у рэгістрацыі (%) |
|---|---|---|---|
| ПБНФ | 33 | 30 | 3 (9%) |
| АГП | 48 | 35 | 13 (27%) |
| БПЛ «Справядлівы свет» | 32 | 26 | 5 (15%) |
| БСДП (Г) | 15 | 11 | 4 (26%) |
| КПБ | 23 | 21 | 2 (8,6%) |
| БССП | 1 | 1 | |
| ЛДПБ | 93 | 70 | 23 (24%) |
| РППС | 19 | 9 | 10 (52,6%) |

Большасць грамадзян, якія атрымалі адмовы, вылучаліся шляхам збору подпісаў (56%). Асноўныя падставы адмоў, указаныя АВК, — гэта недакладнасць подпісаў (больш за 15% ад правераных) і памылкі ў дэкларацыях аб даходах. Грамадзянская кампанія «Гавары праўду» вылучыла шляхам збору подпісаў 25 сваіх актывістаў, з якіх толькі 13 (48%) былі зарэгістраваны. У Мінску кампанія «Гавары праўду» была прадстаўлена толькі адным кандыдатам у дэпутаты. Не былі зарэгістраваны лідар Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, сябра АГП, былы міністр абароны генерал Павел Казлоўскі і інш.

Найменшая колькасць адмоў традыцыйна ў тых асоб, якія ішлі ад працоўных калектываў: з 19 вылучаных не працягнулі ўдзел у выбарчай кампаніі толькі 3 (15%). Вылучаных ад двух суб'ектаў (ад грамадзян шляхам збору подпісаў і ад працоўных калектываў) зарэгістравалі 100% (89 з 89). Варта адзначыць, што менавіта такім шляхам вылучаюцца кандыдаты, якіх падтрымлівае ўлада. Улічваючы кантроль выканаўчай улады над прадпрыемствамі, зразумела, што апазіцыйныя кандыдаты не могуць вылучацца ад працоўных калектываў.

У якасці кандыдатаў зарэгістраваны 21 дзеючы дэпутат ППНС. Усяго ў выбарчай кампаніі 2012 г. было вылучана 60 асоб, якія ў розныя гады з'яўляліся дэпутатамі ППНС. Усе гэтыя прэтэндэнты прайшлі рэгістрацыю.

Старшыня ЦВК Л. Ярмошына адзначыла, што крытэры адбору кандыдатаў на выбарах-2012 былі больш строгія, чым на прэзідэнцкіх у 2010 годзе. «Справа ў тым, што кандыдатаў у прэзідэнты рэгіструе ЦВК, у дэпутаты — мясцовыя акруговыя камісіі. У Цэнтрвыбаркаме працуюць больш дасведчаныя людзі, якія трактуюць усё выключна па літары закону. У рэгіёнах людзі падрыхтаваныя менш, таму яны больш строга кантралююць усё, памылкі верагодныя больш».

Назіральнікі зафіксавалі выпадкі ціску і запалохвання ўдзельнікаў выбарчай кампаніі з боку спецслужбаў. 23 жніўня 2012 г. у г. Рагачове пасля няўдалай спробы рэгістрацыі ў якасці кандыдата Дзяніс Дашкевіч і яго жонка былі выкліканы ў мясцовае аддзяленне КДБ. Запрашэнні на размову ў КДБ паступалі таксама да некаторых членаў ініцыятыўнай групы Дашкевіча. Кандыдат ад БПЛ «Справядлівы свет» Іосіф Мацэюн падчас рэгістрацыі ў АВК Вілейскай ВА №74 заявіў пра зняцце сваёй кандыдатуры з-за ціску з боку КДБ. У выніку гэтая акруга стала адной з чатырох безальтэрнатыўных, кандыдатам па ёй ішоў начальнік Галоўнага ўпраўлення эканамічнай бяспекі КДБ Віктар Русак.

# ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ

Згодна з Каляндарным планам, этап перадвыбарчай агітацыі працягваўся адзін месяц — з дня рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты 22 жніўня да 22 верасня 2012 г. Кандыдаты, зарэгістраваныя пасля абскарджання адмоў у рэгістрацыі, у параўнанні з астатнімі кандыдатамі, мелі менш часу для вядзення агітацыйнай кампаніі.

Апошнія 5 дзён агітацыі (18-22 верасня) супадалі з днямі датэрміновага галасавання, што з'яўляецца відавочнай хібай дзеючага выбарчага заканадаўства.

## 1. Прававая рэгламентацыя

Прававой асновай правядзення перадвыбарнай агітацыі стала абноўленая рэдакцыя ВК, змены і дапаўненні ў якой пашырылі магчымасці агітацыйнай дзейнасці ў параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2008 г. Умовы, парадак і формы перадвыбарчай агітацыі рэгуляваліся артыкуламі 45, 45.1, 46, 47 главы 10 ВК і адпаведнымі Пастановамі Цэнтральнай камісіі[8].

Згодна з арт. 45 Выбарчага кодэкса, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў у дэпутаты, ініцыятыўным групам, якія праводзяць агітацыю за абранне кандыдатаў у дэпутаты, прадстаўляецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання перадвыбарчых праграм кандыдатаў, іх палітычных, дзелавых і асабістых якасцяў, правядзення агітацыі за ці супраць кандыдата на сходах, мітынгах, у сродках масавай інфармацыі, а таксама падчас сустрэч з выбаршчыкамі.

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства не маюць права прымаць удзелу ў агітацыі.

Агітацыя (у тым ліку заклікі да байкатавання выбараў) у дзень галасавання не дапускаецца.

Артыкул 47 ВК утрымлівае палажэнні, звязаныя з недапушчальнасцю злоўжывання правам на правядзенне перадвыбарчай агітацыі. Так, у ім гаворыцца, што агітацыйныя перадвыбарчыя матэрыялы, выступы на сходах, мітынгах, у друку, па тэлебачанні, радыё не павінны ўтрымліваць прапаганды вайны, заклікаў да гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, зневаг і паклёпу ў адносінах да службовых асоб Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у дэпутаты. Забаронены агітацыя ці прапаганда сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці моўнай перавагі, выпуск і распаўсюд паведамленняў і матэрыялаў, якія распальваюць сацыяльную, расавую, нацыянальную ці рэлігійную варажнечу.

Кандыдаты, іх давераныя асобы, арганізацыі і асобы, якія агітуюць за абранне кандыдатаў, не маюць права раздаваць грамадзянам грашовыя сродкі, падарункі і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, праводзіць ільготны распродаж тавараў, бясплатна прадастаўляць любыя паслугі і тавары, акрамя агітацыйных друкаваных матэрыялаў, якія спецыяльна выраблены для выбарчай кампаніі з выкананнем патрабаванняў закона. Пры правядзенні перадвыбарчай агітацыі забараняецца ўздзейнічаць на грамадзян абяцаннямі перадачы ім грашовых сродкаў, матэрыяльных каштоўнасцяў.

Пры парушэнні патрабаванняў артыкула 47 ВК павінны прадпрымацца меры па спыненні злоўжывання правам на правядзенне агітацыі, а адпаведныя камісіі маюць права адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.

У ходзе назірання высветлілася, што новыя нормы ВК не былі рэалізаваны ў поўнай меры.

## 2. Вывядзенне заклікаў да байкоту за межы агітацыі

5 ліпеня 2012 г. Цэнтральнай камісіяй створаны Назіральны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі, у склад якога ўвайшлі чыноўнікі Міністэрства інфармацыі, Адміністрацыі Прэзідэнта і супрацоўнікі

---

8 Пастанова ад 05.07.2012 года № 33 «Об утверждении Положения о порядке использования средств массовой информации при подготовке и проведении выборов депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва»; Пастанова ад 05.07.2012 года № 34 «О Наблюдательном совете по контролю за соблюдением порядка и правил проведения предвыборной агитации в средствах массовой информации»; Пастанова ад 05.09.2012 года № 122 «О разъяснении применения положений Избирательного кодекса Республики Беларусь, предусматривающих проведение дебатов кандидатов в депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва».

дзяржаўных СМІ. Грамадзянскую супольнасць у гэтым органе прадстаўлялі толькі члены праўладнага Беларускага саюза журналістаў. Прапанова апазіцыйных партый аб пашырэнні складу названага органа за кошт уключэння ў яго прадстаўнікоў Беларускай асацыяцыі журналістаў і незалежных СМІ Цэнтральнай камісіяй не была рагледжана.

У функцыі НС уваходзіла назіранне за выкананнем СМІ норм заканадаўства і забеспячэннем роўных магчымасцяў для перадвыбарных выступаў кандыдатаў па тэлебачанні, радыё, у друку. Савет таксама надзелены кампетэнцыяй разглядаць спрэчкі, звязаныя з выкарыстаннем СМІ ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, пры паступленні зваротаў ад кандыдатаў у дэпутаты і даваць рэкамендацыі, заключэнні, якія павінны разглядацца кіраўнікамі СМІ.

27 жніўня 2012 г. Назіральны савет разгледзеў звароты тэлеканала «Беларусь-2», тэлерадыёкампаній «Сталічнае тэлебачанне», «Магілёў» аб адпаведнасці патрабаванням ВК выступаў кандыдатаў Ніны Каляды, Арцёма Агафонова, Віктара Малочкі і Мацвея Хатары, сяброў АГП, якія заклікалі да байкоту выбараў. Назіральны савет пастанавіў, што гэтыя выступы не могуць быць аднесены да перадвыбарчай агітацыі, а «права на бясплатныя выступы па дзяржаўным тэлебачанні і радыё прадастаўляецца кандыдатам у дэпутаты для вядзення перадвыбарчай агітацыі і выкарыстанне дадзеных магчымасцей для іншых мэт законам не прадугледжана»[9].

Цэнтральная камісія пагадзілася з рашэннем НС. 28 жніўня сакратар Цэнтральнай камісіі Мікалай Лазавік заявіў журналістам: «З боку дзяржавы было б неразумна арганізоўваць выбарчую кампанію, марнаваць на гэта велізарныя сродкі і даваць магчымасць апанентам выкарыстоўваць эфірны час для правядзення агітацыі супраць дзяржаўнага мерапрыемства»[10]. На яго думку, агітацыя за байкот не забаронена заканадаўствам Беларусі, аднак яна не адпавядае паняццю перадвыбарнай агітацыі, дадзенаму ў п. 2 арт. 155 ВК, — «дзейнасць, якая мае на мэце заахвоціць або заахвочвае выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, галасавання за тых ці іншых кандыдатаў ці супраць іх».

На падставе рэкамендацый Назіральнага савета Цэнтральная камісія прыняла Пастанову №93[11], згодна з якой заклікі да байкоту выбараў выводзіліся за межы перадвыбарчай агітацыі. Гэтае палажэнне Пастановы пярэчыць артыкулам 45 і 47 ВК і фактычна ўвяло цэнзуру на агітацыйныя выступы кандыдатаў у сродках масавай інфармацыі, а ў шэрагу выпадкаў — і падчас публічных выступаў.

У выніку тэлерадыёкампаніі пачалі масава адмаўляць у эфірным часе тым кандыдатам, якія заклікалі да байкоту. 28 жніўня тэлерадыёкампанія «Гомель» не паказала выступ кандыдата ад АГП па Гомельскай-Савецкай ВА №34 Васіля Палякова. 29 жніўня тэлерадыёкампанія «Брэст» не дала ў эфір выступ кандыдата ад АГП па Баранавіцкай-Заходняй ВА №5 Анжалікі Камбалавай. У гэты ж дзень радыё «Сталіца» не транслявала кандыдата ад АГП па Барысаўскай гарадской ВА №62 Льва Марголіна. Тэлеканал «Беларусь-2» не паказаў выступы кандыдатаў ад АГП Адама Варанца (Гомельская сельская ВА №37) і Марата Афанасьева (Буда-Кашалёўская ВА №38) ды інш. Паводле паведамлення АГП, 33 з 68 магчымых выступаў па радыё і тэлебачанні кандыдатаў ад гэтай партыі не патрапілі ў эфір. Запісаны выступ кандыдата ад АГП па Брэсцкай Усходняй ВА №3 быў адрэдагаваны і паказаны ў эфіры насуперак волі кандыдата. Разам з тым адзначаны выпадкі, калі яны былі паказаны па тэлебачанні. Па канале «Беларусь-2» заклікі да няўдзелу ў выбарах прагучалі ад Леаніда Аўтухова (Віцебская Сельская выбарчая агруга №21), Івана Шэгі (Слонімская выбарчая агруга №58), Аляксандра Рамановіча (Пінская гарадская выбарчая агруга №14).

Некаторыя кандыдаты адзначалі, што падчас запісу супрацоўнікі тэлекампаній забаранялі ім ужываць словы «байкот», «пікет» ды інш.

На гэтай жа падставе цэнзураваліся праграмы кандыдатаў. Так, рэдакцыя магілёўскай газеты «Прыдняпроўская ніва» адмовілася публікаваць праграму кандыдата ад АГП па Магілёўскай Сельскай выбарчай акрузе №88 Аляксандра Шаўцова. Са значнымі купюрамі ў газеце

---

9 Выступления четырех кандидатов в депутаты не соответствуют Избирательному кодексу Беларуси. — Белта, 28.08.2012. [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://www.belta.by/ru/all_news/politics/Vystuplenija-chetyrex-kandidatov-v-deputaty-ne-sootvetstvujut-Izbiratelnomu-kodeksu-Belarusi—-TsIK_i_606655.html

10 Большинство кандидатов в депутаты Беларуси не намерены участвовать в дебатах.- Белта, 28.08.2012. [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://www.belta.by/ru/all_news/politics/Bolshinstvo-kandidatov-v-deputaty-Belarusi-ne-namereny-uchastvovat-v-debatax—-Lozovik_i_606703.html

11 Пастанова ад 29.08.2012 года № 93 «О праве кандидатов в депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь на ведение предвыборной агитации в средствах массовой информации».

«Маяк» выйшаў матэрыял кандыдата ад АГП па Пружанскай выбарчай акрузе №9 Аляксандра Кабанава. З-за заклікаў да байкоту выбараў праграма Юрыя Хашчавацкага, кандыдата ад АГП па Кастрычніцкай ВА №7 г. Мінска, не была апублікавана ў газетах «Звязда» і «Рэспубліка».

Прыхільнікі ідэі байкоту выбараў рэгулярна сутыкаліся з перашкодамі з боку праваахоўных органаў, асабліва пры распаўсюджванні агітацыйнай прадукцыі. У г. Мінску быў затрыманы Валеры Буйвал, які быў аштрафаваны на 25 базавых велічынь паводле артыкула 23.4 КаАП. У г. Віцебску за распаўсюджванне агітацыйных матэрыялаў быў асуджаны на 7 сутак арышту сябра БХД Яўген Гуцалаў. 5 верасня затрыманы і пазней асуджаны на 7 сутак актывіст кампаніі «Гавары праўду» Ягор Віняцкі. 7 верасня затрыманы актывісты моладзевага крыла «Zмена» кампаніі «Гавары праўду» Павел Вінаградаў і Аляксандр Арцыбашаў (асуджаныя адпаведна на 5 і 3 сутак адміністрацыйнага арышту). 18 верасня ў г. Мінску каля дзясятка актывістаў і журналістаў, у тым ліку некалькі акрэдытаваных Міністэрствам замежных спраў карэспандэнтаў вядучых СМІ, былі затрыманы падчас пікету за байкот выбараў. Затрыманні агітатараў за байкот адбыліся на тэрыторыі Фрунзенскай ВА №101 г. Мінска, дзе актыўна дзейнічалі кампанія «Гавары праўду», Рух «За свабоду» і ПБНФ.

Неаднаразова фіксаваліся выпадкі канфіскацыі ўлётак за байкот выбараў. 18 верасня каля г. Ліда прадстаўнікі праваахоўных органаў затрымалі каля 15 тысяч улётак АГП. 6 верасня ў офісе «Гавары праўду» адбыўсяператрус, падчас якога канфіскавалі агітацыйныя матэрыялы.

Трэба адзначыць, што ўсе заяўкі аб правядзенні масавых мерапрыемстваў з мэтай агітацыі за байкот выбараў, якія падаваліся ў Мінгарвыканкам актывістамі БХД і іншых апазіцыйных партый, не былі задаволены.

Цэнзура, забарона бясплатных выступаў у СМІ тых кандыдатаў, якія заклікалі да байкоту выбараў, не адпавядаюць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і міжнародным абавязацельствам краіны, парушаюць прынцып роўнасці кандыдатаў у дэпутаты і абмяжоўваюць як правы кандыдатаў на агітацыю, так і правы выбаршчыкаў на атрыманне поўнай і аб'ектыўнай інфармацыі аб кандыдатах і іх праграмах[12].

Адмовы кандыдатам у бясплатным выступе па тэлебачанні і радыё, у публікацыі іх праграм нельга прызнаць законнымі і абгрунтаванымі. Згодна з п. 7.7 Капенгагенскага дакумента АБСЕ (1990)[13], дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ забяспечваюць такія ўмовы, пры якіх закон і дзяржаўная палітыка дапускаюць правядзенне палітычных кампаній у атмасферы свабоды і сумленнасці, дзе ніякія адміністрацыйныя дзеянні, гвалт або запалохванні не стрымлівалі б партыі і кандыдатаў ад вольнага выяўлення сваіх поглядаў і ацэнак, а таксама не перашкаджалі б выбаршчыкам знаёміцца з кандыдатамі і абмяркоўваць іх, галасаваць свабодна, не асцерагаючыся пакарання.

Заклікі да байкоту выбараў, крытыка выбарчага заканадаўства і практыкі яго прымянення разам з любой іншай перадвыбарчай агітацыяй заканадаўствам не забароненыя, кандыдаты ў дэпутаты вольныя ў выкладанні сваіх поглядаў і праграм, а выбаршчыкі павінны мець максімальныя магчымасці атрымліваць інфармацыю пра кандыдатаў, іх погляды і праграмы. Любыя абмежаванні гэтых правоў, за выключэннем прадугледжаных законам і неабходных у дэмакратычным грамадстве, варта разглядаць як недапушчальнае абмежаванне свабодных выбараў.

Волевыяўленне выбаршчыкаў падчас выбараў ажыццяўляецца не толькі праз галасаванне за аднаго з кандыдатаў, альбо супраць усіх кандыдатаў. Адмова ад галасавання — гэта таксама грамадзянская пазіцыя, на якую выбаршчык мае права. Ён мае права падтрымаць альбо не падтрымаць пазіцыю кандыдатаў, якія заклікаюць да байкоту выбараў. Але для свабоднага фарміравання думкі пра кандыдатаў, іх погляды і праграмы выбаршчык павінен мець магчымасць атрымліваць інфармацыю пра іх. Таму заклікі кандыдатаў не ўдзельнічаць у выбарах і ў такой форме рэалізаваць сваё права на ўдзел у выбарчым працэсе павінны мець роўныя магчымасці данясення да выбаршчыкаў разам з іншымі заклікамі.

Артыкулам 46 ВК прадугледжана, што кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на роўных правах карыстаюцца дзяржаўнымі СМІ, а дзяржаўныя СМІ абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для перадвыбарчых выступаў кандыдатаў. Выступы кандыдатаў павінны забяспечвацца на роўных падставах.

---

12 Аб рэалізацыі права кандыдатаў у дэпутаты на перадвыбарную агітацыю [Электронны рэсурс].
Рэжым доступу: http://elections2012.spring96.org/be/news/56615

13 Документ Копенгагенского совещания Конференции по человеческому измерению ОБСЕ. Копенгаген, 29 июня 1990 года

Вычарпальны пералік падстаў для абмежавання выступаў кандыдатаў у ходзе перадвыбарчай агітацыі усталяваны арт. 47 ВК. Толькі ў выпадку парушэння ўказаных патрабаванняў выбарчымі камісіямі могуць прымацца меры аж да адмены рэгістрацыі кандыдата. Неабходна таксама адзначыць, што ч. 16 арт. 45 ВК забараняе заклікі да байкатавання выбараў, нароўні з іншымі відамі агітацыі, толькі ў дзень галасавання. Іншых абмежаванняў на выказванне заклікаў да байкоту выбараў заканадаўства не ўтрымлівае. ЦВК, як і іншыя органы выбарчай адміністрацыі, не надзелены кампетэнцыяй пашырэння абмежаванняў, устаноўленых ВК.

Такім чынам, цэнзура, забарона бясплатных выступаў у СМІ тых кандыдатаў, якія заклікаюць да байкоту выбараў, не адпавядаюць заканадаўству Беларусі і яе міжнародным абавязацельствам, парушаюць прынцып роўнасці кандыдатаў у дэпутаты і абмяжоўваюць як правы кандыдатаў на агітацыю, так і правы выбаршчыкаў на атрыманне поўнай і аб'ектыўнай інфармацыі.

## 3. Агітацыя ў электронных сродках масавай інфармацыі

Кандыдатам было дадзена права на пяціхвілінны выступ на дзяржаўным радыё і на пяціхвілінны выступ на дзяржаўным тэлебачанні. Кандыдаты мелі доступ да тэлеэфіру ў больш рэйтынгавы час — з 19 да 20 гадзін, у той час як раней выступы трансляваліся з 18.00 да 18.30 у рэгіёнах і з 17.30 да 18.30 у буйных гарадах і Мінску. Выступы трансляваліся ў запісе, пры гэтым не дазвалялася выкарыстанне папярэдне падрыхтаваных кандыдатамі аўдыё- ці відэаматэрыялаў.

Зафіксаваны шматлікія выпадкі забароны трансляцыі ці цэнзуры выступаў кандыдатаў у дзяржаўных СМІ, якія найперш былі звязаны з заклікамі да байкоту выбараў (*гл. «Вывядзенне заклікаў да байкоту за межы агітацыі»*), утрымлівалі крытыку дзеючых уладаў ці прыцягвалі ўвагу да існуючых у краіне вострых праблем.

Так, кандыдат у дэпутаты ад Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Віктар Буры не змог прадставіць выбаршчыкам сваю перадвыбарчую праграму ні на беларускім тэлебачанні, ні на радыё. Выступ В.Бурага па тэлебачанні павінны былі трансляваць на тэлеканале «Беларусь 2» увечары 3 верасня, аднак запіс у эфір не прайшоў. У сваім тэлевыступе кандыдат хацеў расказаць беларусам пра фальсіфікацыі на парламенцкіх выбарах 2008 года, пра якія ён даведаўся падчас працы назіральнікам на выбарчым участку ў Калодзішчах. Інфармацыю пра фальсіфікацыі кандыдат спрабаваў данесці і падчас радыёвыступу, але ўжо з агучваннем канкрэтных прозвішчаў. Выступ В.Бурага на радыё «Сталіца» быў запланаваны на 12 верасня, аднак, па словах кандыдата, яго «забыліся запрасіць на запіс». «Яны сказалі, што ўсіх папярэджвалі, але ў мяне не было прапушчаных званкоў», — адзначыў ён.

Віцебскага сацыял-дэмакрата, кандыдыта па Віцебскай Чкалаўскай выбарчай акрузе №18, Аляксея Гаўруцікава папярэдзілі, што ягоны тэлевыступ можа быць зняты з эфіру, бо ён, па словах дырэктара тэлерадыёкампаніі «Віцебск» Анатоля Камовіча, «дэманстраваў партрэт «крымінальніка», што з'яўляецца недапушчальным пры цяперашнім рэжыме». Па словах Аляксея Гаўруцікава, пасля запісу ягонага тэлевыступу ў студыю забег чалавек, які назваўся дырэктарам тэлерадыёкампаніі, ды прапанаваў усё перазапісаць нанова: «Я некалькі разоў паказваў партрэт Мікалая Статкевіча, калі казаў, што я прыхільнік стварэння «Народнай Грамады» і што патрабую вызвалення і поўнай рэабілітацыі ўсіх палітвязняў. Напрыканцы зноў нагадаў, што я за вызваленне палітзняволеных, і ў тым ліку Статкевіча, які знаходзіцца ў турме за пратэст супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў. Дырэктар Анатоль Камовіч, які з'явіўся ў студыі пасля здымак, заявіў, што гэта недапушчальна. Аднак я ад перазапісаў прамовы адмовіўся, і спадар Камовіч сказаў, што будзе раіцца ў ЦВК, ці пускаць мой выступ у эфір». Але далей пагрозаў справа не пайшла.

Магчымасць правядзення тэле- і радыёдэбатаў кандыдатаў у дэпутаты была ўведзена ў ВК у 2010 г. Аднак на практыцы гэты сродак агітацыі быў малаэфектыўным. 5 верасня адбылося пасяджэнне Цэнтральнай камісіі, на якім была прынята Пастанова з тлумачэннем палажэнняў ВК адносна правядзення дэбатаў кандыдатаў у дэпутаты. Пастанова Цэнтральнай камісіі №122 забараніла ўдзельнічаць у дэбатах тым davеранным асобам кандыдатаў у дэпутаты, якія самі з'яўляліся кандыдатамі. У абгрунтаванне свайго рашэння Цэнтральная камісія спаслалася на палажэнні ВК, якія гарантуюць роўныя прававыя ўмовы для агітацыі ўсіх кандыдатаў у дэпутаты. Паводле Л. Ярмошынай, «кандыдаты, зарэгістраваныя даверанымі асобамі іншых кандыдатаў,

пашыраюць магчымасці вядзення сваёй агітацыйнай кампаніі <...> Калі пісалася выбарчае заканадаўства, меркавалася, што кандыдат сам будзе ўдзельнічаць у дэбатах. Калі не можа гэтага здзейсніць фізічна — замест яго можа выступіць яго давераная асоба. Нікому ў галаву не прыйшло, што гэта можа ператварыцца ў магчымасць для пашырэння магчымасцяў агітацыі на карысць аднаго кандыдата.

Нагодай для такога рашэння сталі дэбаты 4 верасня на тэлеканале «Беларусь 2», дзе ў якасці даверанай асобы кандыдата Уладзіміра Раманоўскага прыняў удзел лідар АГП Анатоль Лябедзька. Пастанова Цэнтральнай камісіі паслужыла прававой асновай для адмовы ў трансляцыі ўжо запісанага выступу старшыні Партыі БНФ Аляксея Янукевіча ў якасці даверанай асобы кандыдата Аляксандра Кузняцова.

Рашэнне ЦВК наўпрост супярэчыць артыкулу 46 ВК, які дазваляе давераным асобам кандыдатаў удзельнічаць у дэбатах замест кандыдата без усялякіх умоў і абмежаванняў і з'яўляецца беспрэцэдэнтным выпадкам змянення правілаў правядзення агітацыйнай кампаніі непасрэдна падчас яе правядзення. У выніку, насуперак матывацыі ЦВК, Пастанова зрабіла адваротны эфект: адны з давераных асобаў, што самі з'яўляюцца кандыдатамі, паспелі выступіць у дэбатах на карысць сваіх давернікаў, а другія — не паспелі. Гэта парушае прынцып роўнасці ў магчымасцях для агітацыі.

У некаторых рэгіёнах кандыдаты, у першую чаргу праўладныя, адмовіліся ад тэледэбатаў. У Баранавіцкай Заходняй ВА №57 кандыдат, дэпутат Баранавіцкага гарсавета Вольга Палітыка адмовілася ўдзельнічаць у тэледэбатах з кандыдатам ад ПБНФ Мікалаем Чарнавусам і кандыдатам ад АГП Анжэлай Камбалавай. Яна паведаміла, што пасля прагляду тэлевыступлення Мікалая Чарнавуса 28 жніўня ў яе няма ніякага жадання спрачацца з гэтым кандыдатам у дэпутаты. Запіс тэледэбатаў планавалі паказаць па канале «Беларусь 2» 12 верасня.

Аналагічная сітуацыя склалася ў Пінскай гарадской ВА №14. Старшыня пінскай арганізацыі ПБНФ Аляксандр Рамановіч некалькі разоў беспаспяхова запрашаў да дэбатаў сваю канкурэнтку — дзеючую дэпутатку ПП НС Зінаіду Мандроўскую. Рабіў ён заклікі нават праз сродкі масавай інфармацыі, аднак так і не атрымаў адказу.

Рэчыцкія кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не праводзілі тэлевізійныя дэбаты з-за адмовы Адама Вашкова, дырэктара метызнага завода. Кандыдат патлумачыў нежаданне ўдзельнічаць у дэбатах тым, што для гэтага трэба ехаць на тэлебачанне ў Гомель, «ды і што можна сказаць на дэбатах за 5 хвілін». Выказаў жаданне ўдзельнічаць у дэбатах толькі кандыдат Антон Няфёдаў, беспартыйны і ўдзельнік грамадскай кампаніі «Гавары праўду». Трэці кандыдат, сябра Ліберальна-дэмакратычнай партыі з Гомеля Ігар Каўбаска на паседжанні, калі вырашалася пытанне правядзення тэледэбатаў, не прысутнічаў.

Тое, што не будзе тэледэбатаў кандыдатаў па Пружанскай ВА № 9, было паведамлена 30 жніўня на пазачарговым паседжанні акруговай камісіі. З заявы кандыдата ў дэпутаты Аляксандра Юркевіча — старшыні Пружанскага райвыканкама — вынікала, што адмаўляецца ён ад тэледэбатаў з кандыдатам ад АГП Аляксандрам Кабанавым, на якія пагадзіўся на паседжанні камісіі 22 жніўня (пазней згоду пацвердзіў пісьмова). Прычынай адмены сваёй згоды на тэледэбаты Юркевіч назваў інфармацыю з інтэрнэта, што кандыдаты ад АГП будуць здымацца з выбараў, а таксама тое, што Кабанаў адмовіўся ад радыёвыступу. Хаця, па словах Кабанава, ён усяго папрасіў камісію перанесці свой радыёвыступ.

Абодва кандыдаты ў дэпутаты па Жодзінскай выбарчай акрузе (вылучэнец «БелАЗ» Дзмітрый Харытончык і прадстаўнік КПБ Сяргей Васілеўскі) праігнаравалі магчымасць публічна выказацца перад тэлегледачамі ў тэледэбатах. 30 жніўня на паседжанні старшыня акруговай выбарчай камісіі Сяргей Афанасенкаў паведаміў, што ні адзін з двух з кандыдатаў, якія засталіся на перадвыбарчай дыстанцыі пасля зняцця прадстаўніка ад ЛДПБ, не выказаў жадання ўдзельнічаць у тэледэбатах. Пры гэтым ён патлумачыў, што для дэбатаў вылучаецца вельмі мала часу, і «за нейкія там 5-7 хвілін трэба сказаць самае важнае», а на гэта не кожны здольны, а добра падрыхтавацца да выступу — вельмі складана.

У некаторых акругах кандыдатам, якія заявілі пра намер удзельнічаць у дэбатах, было адмоўлена ў рэалізацыі гэтага права. Так, у Слонімскай ВА №58 адмоўлена ў правядзенні дэбатаў кандыдату ад ПБНФ Івану Шэга і кандыдату ад БПЛ «Справядлівы свет» Міхаілу Караткевічу. Скарга, пададзеная Іванам Шэга ў Цэнтральную камісію, не была задаволена. Такім чынам, у Гродзенскай вобласці не зафіксавана ніводнага выпадку правядзення радыё- альбо тэледэбатаў. Сем дэбатаў былі зняты з эфіру з-за таго, што кандыдаты агітавалі за байкот выбараў.

**Звесткі пра тэле- і радыёвыступы, тэле- і радыёдэбаты кандыдатаў ***

| № п/п | Рэгіён | Колькасць акруг | Колькасць кандыдатаў | Тэле-выступы | | Радыё-выступы | | Тэле-дэбаты | | Радыё-дэбаты | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | *Заяўлены* | *Адбыліся* | *Заяўлены* | *Адбыліся* | *Заяўлены* | *Адбыліся* | *Заяўлены* | *Адбыліся* |
| 1 | Брэсцкая | 16 | 51 | 51 | 38 | 51 | 36 | 10 | 7 | - | - |
| 2 | Віцебская | 14 | 49 | 49 | 37 | 49 | 35 | 6 | 6 | 18 | 15 |
| 3 | Гомельская | 17 | 53 | 53 | 41 | 53 | 46 | 2 | 1 | - | - |
| 4 | Гродзенская | 13 | 34 | 34 | 28 | 33 | 24 | - | - | - | - |
| 5 | Мінская | 17 | 42 | 42 | 23 | 42 | 28 | 2 | 2 | - | - |
| 6 | Магілёўская | 13 | 46 | 46 | 41 | 44 | 35 | 4 | 4 | 11 | 10 |
| 7 | г. Мінск | 20 | 89 | 78 | 72 | 89 | 72 | 15 | 10 | 12 | 12 |
| Усяго | | 110 | 364 | 353 | 280 | 361 | 276 | 39 | 30 | 41 | 37 |

** Паводле звестак Цэнтральнай камісіі. Колькасць кандыдатаў прыводзіцца без уліку скасавання рэгістрацыі кандыдатаў, вылучаных АГП і ПБНФ.*

Некаторыя эксперты расцанілі беларускі фармат тэледэбатаў толькі як дадатковы час у тэлеэфіры, паколькі на дэбатах кандыдатам давалася па пяць хвілін, сама дыскусія праходзіла не ў прамым эфіры і ўяўляла сабой, па сутнасці, адказы на пытанні вядучых, а не спрэчку канкуруючых кандыдатаў. Таксама падчас тэледэбатаў была заўважаная схаваная рэклама, паколькі ў прэзентацыйным роліку аб выбарчай акрузе шмат увагі надавалася дасягненням цяперашніх уладаў па добраўпарадкаванні раёна.

І ўсё ж некаторыя ўдзельнікі тэледэбатаў выклікалі вялікі рэзананс сваімі выступамі. Найперш гэта датычыць лідэара АГП Анатоля Лябкедзькі, які двойчы браў удзел у тэледэбатах — як давераная асоба кандыдата Уладзіміра Раманоўскага і як кандыдат. Пасля выхаду тэледэбатаў, у якіх А. Лябедзьба выступаў у якасці давернай асобы, пад пагрозай аказалася ягонае ўласнае выступленне як кандыдата ў сувязі з тым, што тэлеканал «Беларусь-2» перанёс запіс дэбатаў кандыдатаў у дэпутаты «з-за паломкі абсталявання». А. Лябедзька выказаў меркаванне адносна сапраўдных прычын пераносу: «На мінулым тыдні я запісваў дэбаты таксама з дзейным дэпутатам Святланай Шылавай. У маім выступленні не было заклікаў да байкоту, але тое, што ў нас няма выбараў, няма парламента — гэта я агучыў, і наша жорсткая пазіцыя была выкладзена. Шылава, я мяркую, у дэбатах выглядала бледнавата. Таму або зараз тэлеканал тэрмінова арганізуе курсы па вучобе праўладных кандыдатаў па выступленні перад камерай, або думае, што наогул рабіць з дэбатамі і як пазбавіцца ад такой непрыемнасці». Намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Марат Маркаў у інтэрв'ю на сайце НДТРК патлумачыў прычыны іншым чынам: «Мы ўпершыню даем магчымасць для правядзення кандыдатамі маштабных агітацыйных мерапрыемстваў на тэлебачанні. Натуральна, што ў працэсе іх арганізацыі ўзнікаюць асобныя пытанні, якія патрабуюць аптымізацыі. Зноў жа менавіта для таго, каб дэмакратычнае права на агітацыю кожнага прэтэндэнта на дэпутацкі мандат было безумоўна рэалізавана. Спецыяльна пад тэледэбаты было распрацавана праграмнае забеспячэнне, і на мінулым тыдні мы ўсё, што планавалі, запісалі, і запісалі паспяхова. Аднак у працэсе падрыхтоўкі да наступных запісаў падчас правядзення рэгламентных работ мы выявілі шэраг момантаў, якія неабходна наладзіць, каб не ўзнікала пытанняў ні ў кандыдатаў, ні ў нас. Таму мы прынялі рашэнне правесці адпаведную тэхнічную прафілактыку — не больш. Гэта абсалютна шараговае пытанне, якое, безумоўна, будзе вырашана за адзін-два дні». Сапраўды, адкладзеныя тэледэбаты былі запісаны і прагучалі ў эфіры «Беларусь-2».

## 4. Агітацыя ў друкаваных СМІ

Згодна з арт. 46 ВК, дзяржаўныя СМІ, а таксама СМІ, якія часткова фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту ці заснавальнікамі якіх з'яўляюцца дзяржаўныя органы ўлады, абавязаны забяспечыць роўныя магчымасці ўсім кандыдатам. Кандыдаты мелі права бясплатна апублікаваць у

адпаведных СМІ сваю праграму аб'ёмам да двух машынапісных старонак, прадставіўшы тэкст не пазней чым за 20 дзён да выбараў.

Разам з тым, 11 кандыдатаў ад АГП не здолелі апублікаваць свае паграмы ў дзяржаўных выданнях. Праграмы кандыдатаў, прапанаваныя для друку ў дзяржаўнай прэсе, як і выступы кандыдатаў у электронных СМІ, у некаторых выпадках цэнзураваліся. Кандыдата ад ПБНФ па Баранавіцкай Заходняй ВА №5 Мікалая Чарнавуса ў газеце «Наш край» папрасілі выкрасліць тэзісы, якія тычыліся крытыкі ўлады. Рэдакцыя газеты «Магілёўскія ведамасці» адцэнзуравала перадвыбарную праграму Ліліі Сіваковай, кандыдата ад БПЛ «Справядлівы свет» па Магілёўскай-Кастрычніцкай ВА №86. Бярозаўская раённая газета «Маяк» адмовіла ў публікацыі праграмы кандыдату па Івацэвіцкай ВА №11 ад БСДП (Г) Валянціну Лазарэнкаву. Гродзенскія дзяржаўныя выданні адмовіліся друкаваць праграму кандыдата ад ПБНФ Аляксандра Стральцова на мовах нацыянальных меншасцяў (польскай і літоўскай), распаўсюджаных у памежных з Літвой і Польшчай рэгіёнах Гродзенскай сельскай ВА №52, дзе балатаваўся гэты кандыдат. ПБНФ расцаніла згаданы выпадак як парушэнне права кандыдата на агітацыю і права выбаршчыкаў на выкарыстанне роднай мовы. Урэшце праграма Стральцова была надрукавана па-беларуску ў дзяржаўнай раённай газеце «Перспектива». А тым часам праграма іншага кандыдата па Гарадзенскай сельскай акрузе, генерала-маёра Аляксандра Мяжуева, была надрукавана ў абласной газеце «Гродзенская праўда», газеты раздаваліся задарма ў многіх паштовых аддзяленнях Гародні.

Кандыдатам, вылучаным апазіцыйнымі партыямі, дзяржаўныя газеты прад'яўлялі прэтэнзіі, што яны прадстаўляюць для друку не ўласную праграму, а праграму партыі ці ўвогуле адмаўлялі ў тым, што прадстаўленыя тэксты з'яўляюцца праграмай кандыдата.

З газеты «Рэспубліка» кандыдату ў дэпутаты ад Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Віктару Бураму прыйшоў ліст аб адмове ў публікацыі перадвыбарчай праграмы ў сувязі з тым, што дасланы тэкст, на думку рэдакцыі, не з'яўляецца агітацыйным, а ўяўляе сабой проста выказванне яго пункту гледжання па некаторых пытаннях, хаця ў законе няма шаблона, як павінна весціся агітацыя. У тэксце, прызначаным для публікацыі ў газеце, кандыдат прапаноўваў унесці змены ў выбарчым заканадаўстве ў частцы правядзення датэрміновага галасавання. Акрамя таго, згодна з праграмай Бурага, «кожны зарэгістраваны кандыдат у дэпутаты любога ўзроўню павінен мець права дэлегаваць у склад кожнай участковай камісіі аднаго свайго прадстаўніка ў якасці яе паўнапраўнага члена».

Кандыдату ў дэпутаты ад АГП Мацвею Хатары з Бабруйску газета «Бабруйскае жыццё» адмовіла ў магчымасці бясплатна апублікаваць праграму. Аляксандр Казак, галоўны рэдактар «БЖ» заявіў, што «гэта не праграма, а агітацыйны матэрыял», таму за тое, каб яго надрукаваць, кандыдат мусіць заплаціць. М. Хатары такая пастаноўка пытання не задаволіла, бо надрукаваць праграму ён мог бы толькі за сродкі са свайго кандыдацкага рахунка, што ён вырашыў не рабіць, бо планаваў здымацца з выбараў. Кандыдат паспрабаваў абскардзіць рашэнне рэдактара «Бабруйскага жыцця» ў ЦВК. Цэнтрвыбаркам скаргу не задаволіў.

Магілёўская гарадская газета «Веснік Магілёва» не надрукавала разам з перадвыбарчай праграмай біяграфію кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Шклоўскай выбарчай акрузе №90, сябра Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Зінаіды Мілешчанкі. Пасля таго, як Зінаіда Мілешчанка звярнулася ў рэдакцыю газеты са скаргай, там паабяцалі выправіць памылку і на наступным тыдні апублікаваць біяграфію кандыдаткі разам з яе перадвыбарчай праграмай цалкам.

Прад'яўляючы неабгрунтаваныя прэтэнзіі да праграм апазіцыйных кандыдатаў, сродкі масавай інфармацыі адначасова лаяльна ставіліся да зместу праграм іншых прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат. Так, у «Мінскім кур'еры» 4 верасня была апублікавана праграма кандыдата ад Камуністычнай партыі Беларусі Жана Содзеля, які балатаваўся па Каліноўскай выбарчай акрузе №108 Мінска. У звароце да выбаршчыкаў ён заклікаў захаваць стабільнасць у краіне і выступіць супраць «празаходніх грантасмокаў ад так званай апазіцыі». Жан Содзель — адзін з самых маладых кандыдатаў у выбарчай кампаніі, апошнім часам працаваў журналістам на тэлеканале АНТ. Тэлегледачам ён запомніўся сюжэтамі, дзе негатыўна распавядаў пра дзейнасць апазіцыйных партый. У сваёй выбарчай праграме ён таксама не абмінуў гэтай тэмы: «Нам дарагія стабільнасць, мір і грамадзянская згода ў нашым агульным доме. І мы не можам і не павінныя дазволіць псеўдапатрыётам і лібералам розных масцяў абрынуць краіну ў багну хаоса і беспарадку... Прагаласаваўшы за кандыдата ад Камуністычнай партыі Беларусі, вы падтрымаеце стабільнасць і ўласны дабрабыт. І выступіце супраць празаходніх грантасмокаў ад так званай апазіцыі,

якую ўтрымліваюць еўра-амерыканскія распаўсюднікі дэмакратыі». Дадзеныя словы супярэчылі нормам арт.47 Выбарчага кодэкса, дзе сказана, што агітацыйныя матэрыялы «не павінны ўтрымліваць абразаў і паклёпу ў дачыненні да ... кандыдатаў у дэпутаты».

**Звесткі пра публікацыі праграм кандыдатаў у дзяржаўных газетах***

| № п/п | Рэгіён | Коль-касць акруг | Колькасць канды-датаў | Колькасць кандыдатаў, чые праграмы былі апублікаваны | Газеты, у якіх былі апублікаваны праграмы | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Рэспуб-ліканскія | Абласныя (мінская гарадская) | Раённыя (гарадскія) |
| 1 | Брэсцкая | 16 | 51 | 31 | | 11 | 51 |
| 2 | Віцебская | 14 | 49 | 26 | 2 | 1 | 31 |
| 3 | Гомельская | 17 | 53 | 40 | | 2 | 28 |
| 4 | Гродзенская | 13 | 34 | 32 | | 5 | 29 |
| 5 | Мінская | 17 | 42 | 28 | | | 49 |
| 6 | Магілёўская | 13 | 46 | 32 | | 7 | 54 |
| 7 | г. Мінск | 20 | 89 | 33 | 15 | 35 | |
| Усяго | | 110 | 364 | 222 | 17 | 61 | 242 |

** Паводле звестак Цэнтральнай камісіі. Колькасць кандыдатаў прыводзіцца без уліку скасавання рэгістрацыі кандыдатаў, вылучаных АГП і ПБНФ.*

## 5. Асвятленне выбарчай тэматыкі ў СМІ

Беларускія медыя не надаюць сур'ёзнай увагі тэме парламенцкіх выбараў. Да такой высновы прыйшла экспертная група Беларускай асацыяцыі журналістаў, якая займалася маніторынгам СМІ падчас выбараў у Беларусі. «У правядзенні выбарчай кампаніі ды ў яе асвятленні выразна праглядаюцца рысы агульнапалітычнага застою, якія часам кваліфікуюць як палітычную стабільнасць», — адзначыў аналітык Алесь Анціпенка.

Дзяржаўныя СМІ, паводле маніторынгу, акцэнтвавалі ўвагу на арганізацыю і тэхнічныя аспекты выбарчага працэсу. Галоўнай крыніцай інфармацыі для дзяржаўных медыя заставаліся ЦВК і акруговыя камісіі. Напрыклад, навінная праграма «Панарама» (Беларусь-1) адвяла ЦВК 50% часу, праграма «Радыёфакт (1 канал) — 35%, тыднёвік «7 дней»- амаль 48% плошчы параўнальна з усімі іншымі суб'ектамі маніторынгу. Аднак казаць, што выбарчая тэматыка ў дзяржаўных СМІ дамінуе, не выпадае. Для параўнання: у праграме «Радыёфакт» тэма «Спорт» атрымала 10,5%, «Надвор'е» — 10,1% часу праграмы, а тэма парламенцкіх выбараў — усяго 1,7% часу.

Былі прааналізаваныя выступы першых кандыдатаў у параўнанні з выбарамі ў 2008 годзе. Сёлета кандыдаты маюць доступу да тэлеэфіру ў больш рэйтынгавы час — з 19 да 20 гадзінаў (раней — 18.00-18.30 у рэгіёнах, 17.30-18.30 — у вялікіх гарадах і Мінску). Негатыўныя тэндэнцыі — выступ кандыдатаў транслююць у запісе, што дае магчымасць цэнзураваць звароты да выбаршчыкаў. Апроч таго, у тэлепраграме выступы кандыдатаў анансуюць пад рубрыкай «Выбары-2012», не акцэнтуючы ўвагу на тым, хто менавіта будзе выступаць, інтарэсы якой партыі кандыдат прадстаўляе.

Такое асвятленне выбарчага працэсу добра тлумачыцца ацэнкай характару парламенцкай кампаніі, дадзенай старшынёй ЦВК Лідзіяй Ярмошынай: «Усё ж такі гэта не выбары прэзідэнта, калі кандыдаты, яны прадстаўляюць усю краіну ў цэлым, і, відавочна, прадстаўляюць дастаткова розныя кропкі гледжання. Што датычыцца цяперашніх выбараў, то тут будуць дэбатаваць перш за ўсё праблемы, цікавыя для выбаршчыкаў кожнай выбарчай акругі. Таму, цалкам магчыма, яны будуць насіць дастаткова камерны характар», — заявіла яна ў інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь-1».

«Я не ведаю, ці ўсведамляла Лідзія Ярмошына, што яна казала. Але сэнс яе словаў у тым, што парламенцкія выбары — гэта не буйная агульнарэспубліканская кампанія, а камернае і лакальнае мерапрыемства, якім займаецца Цэнтрвыбаркам,» — адзначыў Алесь Анціпенка.

Наогул эксперты прыйшлі да высновы, што медыі праяўляюць мала цікавасці да выбарчай тэматыкі, выключэнне — толькі партал naviny.by. Гэта было характэрна і для парламенцкай кампаніі ў 2008 годзе.

Алесь Анціпенка таксама даў папярэднюю ацэнку тэледэбатам, якія транслявалі дзяржаўныя каналы. «У краіне велізарная праблема — палітыкі не здольныя свабодна камунікаваць, уступаць у дыялог, выказваць крытычнае меркаванне. У нас з савецкага часу пераважае маналагічная камунікацыя, што характэрна для таталітарнага і аўтарытарнага грамадства».

## 6. Агітацыя шляхам распаўсюду друкаваных матэрыялаў

Кандыдаты мелі права на выраб агітацыйнай друкаванай прадукцыі (плакатаў, улётак, надпісаў, заяў, фотаматэрыялаў) за кошт дзяржаўных сродкаў у памеры 50 базавых велічынь, а таксама за кошт прыватных выбарчых фондаў (да 1 000 базавых велічынь) і за ўласны кошт (да 20 базавых велічынь). Тыя кандыдаты, якія мелі намер зняцца з выбараў, у большасці выпадкаў устрымаліся ад выкарыстання сродкаў, што выдзяляліся для агітацыі з дзяржаўнага бюджэту.

Адзначаны перашкоды з боку друкарняў у вырабе агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў. Дзяржаўныя і прыватныя друкарні («Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа», «Мінская фабрыка каляровага друку», «Чырвоная зорка» і інш.) адмаўляліся вырабляць матэрыялы, што фінансаваліся з прыватных выбарчых фондаў апазіцыйных кандыдатаў. Некаторыя з іх спасылаліся на загружанасць сваіх вытворчых магчымасцей і прапаноўвалі надрукаваць матэрыялы толькі пасля 25 верасня. Як заявіла ПБНФ, 15 прыватных друкарань адмовіліся вырабляць іх прадукцыю. Дзяржаўныя друкарні тлумачылі адмовы і іншымі прычынамі. Напрыклад, прадстаўнік паліграфічнага камбінату імя Якуба Коласа паведаміў, што з-за тэхнічных характарыстык абсталявання яны могуць надрукаваць выбарчыя ўлёткі накладам не менш за 500 тыс. асобнікаў. Ён таксама звярнуў увагу, што выбарчага фонду кандыдата не хопіць на аплату такога накладу, а менш яны друкаваць не могуць. Шмат дзяржаўных друкарняў спасылаліся на тое, што занятыя друкам дзённікаў. Па словах прадстаўніка Мінскай фабрыкі каляровага друку, усе іх магчымасці на дадзены момант скіраваныя на друк раней атрыманых замоваў. У выніку толькі 4 з 31 кандыдата ад ПБНФ здолелі скарыстацца сваімі перадвыбарчымі фондамі і надрукаваць улёткі.

Некаторыя з кандыдатаў здолелі на месцах дамовіцца на лічбавы друк, які значна даражэйшы за афсэт, і вырабіць абмежаваным накладам свае выбарчыя ўлёткі. У г. Рэчыца Гомельскай вобласці дзяржаўнае паліграфічнае прадпрыемства «Тытул» адмовілася друкаваць 10 тысяч адзінак агітацыйнай прадукцыі кандыдата па Рэчыцкай ВА №44 Антона Няфёдава. Камунальнае паліграфічнае ўнітарнае прадпрыемства «Тытул» падпарадкоўваецца райвыканкаму. Там А. Няфёдаву сказалі, што 10 тысяч экзэмпляраў прадпрыемства не надрукуе, таму што з-за такой колькасці «зламаецца прынтар». Замест гэтага заказ прынялі толькі на 5 тысяч. Адначасова з пачатку агітацыйнага перыяду ў Рэчыцы распаўсюджваліся агітацыйныя матэрыялы кандыдата ад улады — дырэктара метызнага завода Адама Вашкова. Відавочна, прынтары пры друкаванні ягоных матэрыялаў не ламаліся.

Кандыдат па Віцебскай-Чкалаўскай ВА №18 Аляксей Гаўруцікаў і кандыдат па Віцебскай Горкаўскай ВА №17 Алена Фаміна не змаглі ў тэрмін атрымаць наклады сваіх улётак з дзяржаўнай друкарні, што перашкодзіла вядзенню паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі. На 11 верасня былі гатовы толькі каляровыя ўлёткі для вонкавага размяшчэння ў вітрынах, установах і г.д. Чорна-белыя ўлёткі, якія планавалася раздаваць выбаршчыкам падчас сустрэч, немагчыма было атрымаць больш за пяць дзён ад вызначанай першапачатковай даты.

Друкарні адмаўляліся друкаваць агітацыйныя ўлёткі кандыдатаў, у якіх утрымліваўся заклік да байкоту выбараў. Такая сітуацыя склалася з кандыдатам ад АГП з Магілёва Уладзімірам Шанцавым. Кандыдат, які збіраўся здымацца з выбарчай гонкі, каб не траціць сродкі, выдаткаваныя яму дзяржавай, стварыў свой уласны фонд. «Я занёс макет улёткі ў магілёўскую абласную друкарню імя Спірыдона Собаля. Супрацоўнікі друкарні спачатку макет прынялі, аднак, калі я ўжо быў у банку, каб перавесці ім сродкі на рахунак, то яны патэлефанавалі мне і адмовілі, спаслаўшыся на тое, што ім забаранілі. Я прыйшоў да іх і папрасіў, каб мне далі пісьмовы адказ, аднак гэтае патрабаванне яны праігнаравалі», — адзначыў Уладзімір Шанцаў. Пасля дзяржаўнай дру-

карні магілёўскі кандыдат ад АГП звярнуўся ў прыватную: «Там у мяне макет прынялі, аднак сказалі, што пературэлефануюць і паведамяць, калі надрукуюць. Там таксама мне паведамілі, што ў іх шмат заказаў і друк маёй прадукцыі можа расцягнуцца на нейкі час».

Зафіксаваны выпадак цэнзуры пры вырабе агульнага інфармацыйнага плаката кандыдатаў. Так, фотаздымак на плакаце кандыдатаў па Гомельскай-Навабеліцкай выбарчай акрузе №36 Уладзіміра Няпомняшчых быў апрацаваны ў кампутарнай праграме з мэтай выдалення надпісу «За Беларусь без Лукашэнкі» на адзенні: словы «без Лукашэнкі» зніклі пад надпісам «Кандыдаты ў дэпутаты», застаўся толькі надпіс «За Беларусь».

**Звесткі пра выкарыстанне дзяржаўных сродкаў, выдзеленых кандыдатам***

| № п/п | Рэгіён | Колькасць акруг | Колькасць кандыдатаў | Кандыдаты, якія для вырабу агітацыйных плакатаў скарысталіся (цалкам / часткова) дзяржаўнымі сродкамі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Брэсцкая | 16 | 51 | 33 |
| 2 | Віцебская | 14 | 49 | 41 |
| 3 | Гомельская | 17 | 55 | 45 |
| 4 | Гродзенская | 13 | 34 | 26 |
| 5 | Мінская | 17 | 46 | 31 |
| 6 | Магілёўская | 13 | 46 | 33 |
| 7 | г. Мінск | 20 | 89 | 64 |
| Усяго | | 110 | 370 | 273 |

** Паводле звестак Цэнтральнай камісіі. Колькасць кандыдатаў прыводзіцца без уліку скасавання рэгістрацыі кандыдатаў, вылучаных АГП і ПБНФ.*

Пасля сыходу з выбарчай гонкі трох кандыдатаў ад ПБНФ АВК запатрабавалі кампенсаваць патрачаныя на агітацыю сродкі, выдзеленыя з дзяржаўнага бюджэту.

Правам на стварэнне прыватных выбарчых фондаў скарысталася менш за траціну кандыдатаў. Усяго па краіне імі было адкрыта 85 прыватных рахункаў для збору сродкаў. Кандыдаты ад апазіцыі заяўлялі пра бюракратычныя перашкоды з боку камісій, што замарудзіла адкрыццё рахункаў. Апошні з іх быў адкрыты 18 верасня, ужо падчас датэрміновага галасавання. Фактаў выкарыстання выбарчых фондаў для аплаты вонкавай рэкламы альбо рэкламы на радыё і тэлебачанні ўвогуле не зафіксавана.

**Звесткі пра выкарыстанне прыватных выбарчых фондаў***

| № п/п | Рэгіён | Колькасць акруг | Колькасць кандыдатаў | Колькасць выбарчых фондаў, створаных кандыдатамі | Колькасць выбарчых фондаў, сродкі з якіх былі выкарыстаны кандыдатамі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брэсцкая | 16 | 51 | 15 | 14 |
| 2 | Віцебская | 14 | 49 | 12 | 10 |
| 3 | Гомельская | 17 | 53 | 16 | 14 |
| 4 | Гродзенская | 13 | 34 | 7 | 5 |
| 5 | Мінская | 17 | 42 | 4 | 4 |
| 6 | Магілёўская | 13 | 46 | 14 | 5 |
| 7 | г. Мінск | 20 | 89 | 17 | 15 |
| Усяго | | 110 | 364 | 85 | 67 |

** Паводле звестак Цэнтральнай камісіі. Колькасць кандыдатаў прыводзіцца без уліку скасавання рэгістрацыі кандыдатаў, вылучаных АГП і ПБНФ.*

Згодна з выбарчым кодэксам, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады па ўзгадненні з адпаведнымі камісіямі былі вызначаны месцы для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў. У розных рэгіёнах рашэнні адрозніваліся большай ці меншай ступенню ліберальнасці. Так, у Магілёве агітацыйныя друкаваныя матэрыялы кандыдатаў у дэпутаты можна было размяшчаць на дошках аб'яў, інфармацыйных стэндах прадпрыемстваў прамысловых, гандлёвых, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, бытавога абслугоўвання, будаўнічых арганізацый, установаў культуры, адукацыі і медыцыны, на інфастэндах на тэрыторыі ЖЭУ, рэкламных тумбах на прыпынках грамадскага транспарту і на інфармацыйных стэндах у памяшканнях, дзе размешчаны ўчасткі для галасавання. А вось у Пінскім раёне, згодна з адпаведным рашэннем райвыканкама, аўтобусныя прыпынкі не ўвайшлі ў пералік месцаў, дзе можа быць размешчана агітацыйная прадукцыя.

У Бабруйску на тэрыторыі Першамайскага раёна для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў мясцовымі ўладамі былі вызначаны нешматлюдныя месцы: інфармацыйныя стэнды на ўчастках для галасавання, інфармацыйныя шчыты каля сямі ЖЭУ, рэкламныя шчыты на скрыжаванні вуліц Батава і Будаўнікоў, на канечнай аўтобуса №18, прыпынак на скрыжаванні вуліц Ульянаўская і Арджанікідзэ, прыпынак на вуліцы Ракасоўскага (аўтакааператыў), прыпынак Кісялевічы. Адначасова ў Ленінскім раёне горада пералік такіх месцаў звужаўся ўсяго стэндамі каля шасці ЖЭУ.

У Мазыры 11 з 13 вызначаных рашэннем Мазырскага райвыканкама месцаў на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў аб кандыдатах у дэпутаты — гэта дошкі аб'яў, інфармацыйныя стэнды, дзе агітацыйным матэрыялам традыцыйна не хапала месца сярод афіш для Дома культуры, кінатэатра, тэатра. Агітацыйныя матэрыялы заставаліся малазаўважнымі. Мясцовыя актывісты не аднойчы прапаноўвалі ўладам Мазыра зрабіць адмысловыя тумбы, стэнды, прымеркаваныя да выбарчых кампаній, але вынікаў гэта не прынесла. Такая ж сітуацыя з месцамі для агітацыйнай прадукцыі склалася і ў Светлагорску, дзе стэндаў для выбарчых плакатаў не было, а замест іх выкарыстоўваліся звычайныя афішныя тумбы і дошкі аб'яў. 7 верасня на падрапаныя прыватныя абвесткі былі развешаны агітацыйныя ўлёткі старшыні райсавета Галіны Філіповіч з абяцаннем «разам зрабіць наша жыццё лепш». У Гомелі на прыпынках грамадскага транспарту стэнды для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў былі аформлены з плакатаў-рэкламы цырка, проста перавернутай на іншы бок, і праз белую паперу прасвечваліся словы «Цырк» і «На біс!», а таксама фізіяномія вясёлага клоуна.

Фіксаваліся выпадкі супрацьдзеяння з боку афіцыйных асоб размяшчэнню агітацыйных матэрыялаў апазіцыйных кандыдатаў. Брэсцкія філіялы РУП «Белпошта» і РУП «Белфармацыя» адмовіліся прадастаўляць месца для перадвыбарных плакатаў кандыдатаў ад БСДП (Грамада) ва ўсіх паштовых аддзяленнях і аптэках горада Брэста.

Пра знікненне агітацыйных матэрыялаў з выбарчых участкаў у Хоцімскім раёне заявіў Валерый Каранкевіч, кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Крычаўскай выбарчай акрузе №83: «19 верасня мы ладзілі агітацыйныя пікеты ў аграгарадках Бярозкі і Забялышына Хоцімскага раёна. Пасля гэтага мы праехалі па пяці выбарчых участках у Хоцімскім раёне, і ні на адным не аказалася маіх агітацыйных матэрыялаў. Самае сумнае тое, што напярэдадні датэрміновага галасавання ўсе гэтыя агітацыйныя матэрыялы на выбарчыя ўчасткі былі завезены і развешаны маімі даверанымі асобамі».

Адначасова агітацыйныя матэрыялы праўладных кандыдатаў размяшчаліся ў недазволеных месцах, і афіцыйныя асобы, адказныя за выкананне рашэнняў мясцовых органаў улады, ніякім чынам не рэагавалі на падобныя парушэнні. У Рэчыцы матэрыялы кандыдата ў дэпутаты, дырэктара Рэчыцкага метызнага завода Адама Вашкова можна было сустрэць, напрыклад, на стэндах у памяшканні раённай паліклінікі. Адказнасць за недапушчэнне размяшчэння агітацыі ў забароненых месцах была ўскладзена на аддзел унутраных спраў (начальнік — Андрэй Сілкоў), а кантроль за выкананнем рашэння — на начальніка аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Наталлю Маркаву, але ніякай рэакцыі з іх быку не было.

Аналагічная сітуацыя была зафіксавана і ў Светлагорску, дзе агітацыйная прадукцыя старшыні Светлагорскага райсавета Галіны Філіповіч была расклеена ў месцах, не вызначаных для размяшчэння матэрыялаў. Светлагорскі райвыканкам яшчэ 13 жніўня прыняў рашэнне аб пераліку месцаў для размяшчэння агітацыі кандыдатаў у дэпутаты. Згодна рашэнню, агітацыйныя матэрыялы можна размяшчаць на інфармацыйных стэндах і тумбах, у памяшканнях для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі і на ўваходах у гандлёвыя прадпрыемствы. Аднак гэта рашэнне Га-

ліна Філіповіч ігнаравала. Яе агітацыйныя ўлёткі былі расклееены ў Светлагорску на сценах дамоў, дзвярах пад'ездаў і інш.

У цэлым, паводле назіральнікаў, па ўсёй краіне агітацыйныя друкаваныя матэрыялы сустракаліся ў нязначнай колькасці, іх прысутнасць была малазаўважнай, а інфармаванне выбаршчыкаў — мінімальным.

# 7. Сустрэчы з выбаршчыкамі і іншыя масавыя мерапрыемствы

Згодна з арт. 45 ВК, кандыдаты ў дэпутаты забяспечваюцца магчымасцю праводзіць сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі на сходах ці ў іншай зручнай для выбаршчыкаў форме.

## 7.1. Вызначэнне месцаў для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі і масавых мерапрыемстваў па-за памяшканнямі

Згодна з Каляндарным планам, да 14 жніўня выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненні з адпаведнымі акруговымі выбарчымі камісіямі былі вызначаны памяшканні для правядзення сустрэч кандыдатаў у дэпутаты і іх даверaных асоб з выбаршчыкамі і перадвыбарчых сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі. Такія памяшканні прадстаўляюцца бясплатна ў парадку чарговасці паступлення пісьмовых зваротаў. Таксама кандыдаты ў дэпутаты мелі права за кошт сродкаў уласнага выбарчага фонду арэндаваць будынкі і памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі.

У гэты ж тэрмін былі вызначаны месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў, пікетаванняў) у мэтах перадвыбарчай агітацыі. Згодна з арт. 45.1 ВК, правядзенне масавых мерапрыемстваў у месцах, вызначаных рашэннямі мясцовых уладаў, маюць заяўляльны характар. Масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца па-за вызначанымі месцамі, павінны арганізоўвацца і праводзіцца ў адпаведнасці з Законам «Аб масавых мерапрыемствах». У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што дазваляльны парадак правядзення мітынгаў, шэсцяў і пікетаў, устаноўлены законам Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь», даўно з'яўляецца аб'ектам крытыкі з-за неабгрунтаванага звужэння свабоды сходаў.

Месцы для сустрэч з выбаршчыкамі былі вызначананы выканкамамі ў тэрміны, устаноўленыя выбарчым заканадаўствам і ЦВК. Аднак у большасці рэгіёнаў было вызначана крытычна мала такіх месцаў, памяшканні аказваліся нязручнымі (аддаленымі, нядобраўпрарадкаванымі) ці невялікімі, пляцоўкі — маланаведваемымі. А асабліва гэта было характэрным для райцэнтраў і сельскіх населеных пунктаў.

У Смаргоні райвыканкам выдзеліў для мэтаў агітацыі толькі адно месца — летні амфітэатр гарадскога парку, дзе звычайна няма мінакоў. Самыя зручныя і шматлюдныя пляцоўкі па цэнтральнай вуліцы Леніна, дзе толькі і ёсць сэнс ладзіць пікеты ці мітынгі — аказаліся гэтым разам пад забаронай. Большасць вёсак Смаргонскага раёна таксама аказаліся пазбаўленымі магчымасці ўбачыць перадвыбарчую агітацыю. Ладзіць масавыя мерапрыемствы дазволена толькі ў дзевяці населеных пунктах, па-за ўвагай засталіся не зусім малыя вёскі, дзе ёсць для гэтага зручныя месцы каля культурных ці адукацыйных устаноў і якія з'яўляюцца цэнтрамі для яшчэ меншых навакольных вёсак.

Згодна з рашэннем Бялыніцкага райвыканкама, для правядзення масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў, пікетавання) было вызначана толькі адно месца — пляцоўка перад сцэнай у Ліпавым гаі гарадскога пасёлка Бялынічы. Праводзіць масавыя мерапрыемствы ў гэтым месцы кандыдатам не мела асаблівага сэнсу, бо звычайна туды людзі прыходзяць толькі на канцэрты альбо на нейкія святы. У параўнанні з прэзідэнцкімі выбарамі 2010 года ўмовы для правядзення агітацыйных пікетаў рэзка пагоршыліся, бо тады іх правядзенне было дазволена ў значна большай колькасці месцаў — практычна па ўсім пасёлку. Для правядзення сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі былі вызначаны памяшканні раённага Цэнтра культуры і сельскіх устаноў культуры.

У Светлагорску для сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў і пікетавання было вызначана 6 пляцовак. З больш чым 100 населеных пунктаў Светлагорскага раёна толькі ў 18 было дазволена праводзіць агітацыйныя мерапрыемствы па-за памяшканнямі. Кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і іх давераным асобам не дазвалялася праводзіць пікеты і сходы ў 83 вёсках

і пасёлках, у тым ліку ў двух цэнтрах сельсаветаў — у вёсках Давыдаўка і Краснаўка. У розных сельсаветах колькасць месцаў для агітацыі заўважна адрознівалася. Так, у Мікалаеўскім сельсавеце агітацыйныя мерапрыемствы можна было праводзіць у 4-х паселішчах, а ў Асташкавіцкім — толькі ў саміх Асташкавічах.

На тэрыторыі Першамайскага раёна Бабруйска для правядзення сустрэч кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асобаў была выдзелена актавая зала Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Гэтае памяшканне — не самы горшы варыянт, побач прыпынак грамадскага транспарту, гэта фактычна цэнтр горада, нягледзячы на тое, што насупраць знаходзяцца гарадскія могілкі. А вось для масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі раёна вызначылі няўдалыя месцы: тэрыторыю спартовай базы ФК «Белшына» (знаходзіцца на ўскрайку лесапарку) і адкрытая пляцоўка перад спартовай залай вучэльні алімпійскага рэзерву (знаходзіцца на тэрыторыі былога вайсковага гарадка). На тэрыторыі Ленінскага раёна Бабруйска месцамі для правядзення масавых мерапрыемстваў вызначаны адкрытыя пляцоўкі, прылеглыя да футбольнага поля дзіцяча-юнацкай спартовай школы. Гэта месца на ўскрайку горада, куды даязджае ўсяго пара гарадскіх аўтобусных маршрутаў. У якасці памяшкання для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі вызначылі актавую залу Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, які знаходзіцца ў дварах, і таму яго бывае складана знайсці бабруйчанам.

Нават у межах аднаго населенага пункта ў розных раёнах зафіксаваны розныя падыходы да вызначэння месцаў для агітацыі. Так, у Магілёве для агітацыі было вызначана 18 адкрытых пляцовак, 12 з якіх — на тэрыторыі Ленінскага раёна горада і роўна напалову меней на тэрыторыі Кастрычніцкага — толькі 6. У Віцебску самыя лепшыя магчымасці для агітацыі былі вызначаны ў самым буйным раёне — Першамайскім, дзе было прадстаўлена 8 месцаў для вулічнай агітацыі. «Пакрыўджаным» выглядаў Чыгуначны раён — тут былі вызначаны ўсяго два месцы для вулічнай агітацыі і толькі тры залы для сустрэч у памяшканнях. Калі быць больш дакладным, то ў самім Віцебску месца для агітацыі ў Чыгуначным раёне ўсяго адно — гэта «Парк культуры і адпачынку Чыгуначнікаў у раёне цэнтральнай сцэнічнай пляцоўкі», другое — гэта ўжо «пляцоўка каля «Палаца культуры» ў гарадскім пасёлку Руба, які фармальна лічыцца тэрыторыяй Віцебска, хаця месціцца далёка за гарадской рысай. На тэрыторыі Кастрычніцкага раёна было прапанавана 6 пляцовак для агітацыі, але аптымістычную карціну азмрочвала тое, што гэта 4 агітпляцоўкі ў дварах жылых дамоў, а таксама загарадны парк культуры і адпачынку ў Мазурына і пляцоўка перад клубам ААТ «Кераміка» на ўскраіне горада.

У Мінску ў спіс памяшканняў для правядзення сустрэч кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб з выбаршчыкамі ўвайшлі 164 памяшканні — у асноўным, актавыя залы школ і жыллёва-эксплуатацыйных арганізацый. Найбольшая колькасць месцаў для сходаў было выдзелена ў Аўтазаводскай выбарчай акрузе №92 — 11 памяшканняў, ва Усходняй выбарчай акрузе №107 такіх месцаў усяго пяць. У пералік месцаў для правядзення агітацыйных масавых мерапрыемстваў у сталіцы ўвайшлі ў асноўным пляцоўкі перад крамамі і гандлёвымі цэнтрамі — усяго 147, пры гэтым найбольшая колькасць — 11 — вызначана ў Кальварыйскай выбарчай акрузе №104, а ў Каліноўскай выбарчай акрузе №108 — усяго пяць.

У многіх рэгіёнах, дзе рашэнні аб вызначэнні месцаў для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі і масавых мерапрыемстваў па-за памяшканнямі насілі значна абмежавальны характар, яны абскарджваліся кандыдатамі ў дэпутаты ці іншымі суб'ектамі выбарчага працэсу. У шэрагу выпадкаў такія абскарджанні мелі станоўчы вынік, але ў абсалютнай большасці аказаліся беспаспяховымі.

Адзін са станоўчых прыкладаў меў месца ў Магілёве, дзе кандыдат у дэпутаты па Магілёўскай-Прамысловай выбарчай акрузе №87 Аксана Закрэўская дамаглася павелічэння колькасці месцаў для агітацыі. Яна падала адпаведную заяву ў адміністрацыю Кастрычніцкага раёна горада, і мясцовыя ўлады пайшлі ёй насустрач. Згодна з першапачатковым рашэннем раённай адміністрацыі, агітацыйны пікет А. Закрэўская магла праводзіць толькі ў адзіным месцы ў горадзе — у двары дома №14б па вуліцы Чалюскінцаў, што, па ацэнцы прэтэндэнткі на дэпутацкі мандат, істотна сказвалася на эфектыўнасці агітацыі. Пасля задавальнення звароту кандыдата ў пералік дазволеных месцаў было дададзена яшчэ пяць пляцовак, чатыры з якіх — каля гандлёвых цэнтраў і крамаў, а адна — каля рынку.

Не ўдалося дамагчыся павелічэння месцаў для агітацыі кандыдату ў дэпутаты па Брэсцкай Цэнтральнай выбарчай акрузе №2 Ігару Маслоўскаму, які абскарджваў рашэнне гарвыканкама ў Брэсцкім аблвыканкаме (копія яе была накіравана таксама ў Цэнтрвыбаркам). І. Маслоўскі па-

ведаміў, што, згодна з рашэннем Брэсцкага гарвыканкама №1611 ад 09.08.2012 года «Аб вызначэнні месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў», ладзіць сустрэчы з выбаршчыкамі на тэрыторыі сваёй акругі ён можа толькі ў двух месцах — на стадыёне «Лакаматыў» і спартыўнай пляцоўцы Цэнтра алімпійскага рэзерву па футболе. Астатнія месцы, пералічаныя ў згаданым рашэнні гарвыканкама, знаходзяцца на тэрыторыі іншых выбарчых акругаў. Акрамя таго, і гэтыя дзве пляцоўкі знаходзяцца на значнай адлегласці ад месцаў, дзе жывуць выбаршчыкі, і незабяспечаныя грамадскім транспартам. Адначасова Ігар Маслоўскі нагадваў, што раней мясцовыя ўлады забаранілі ладзіць пікеты для збору подпісаў па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты на ўсіх цэнтральных вуліцах Брэста і змянілі свае рашэнне толькі пасля ўмяшальніцтва аблвыканкаме, куды накіравалі скаргу прадстаўнікі палітычных партый. У атрыманым кандыдатам адказе, які падпісаў намеснік старшыні аблвыканкама Леанід Цуприк, сцвярджалася, што двух пляцовак на тэрыторыі акругі для сустрэч з выбаршчыкамі дастаткова, а таксама ў ім пералічваліся ўсе аўтобусныя і тралейбусныя маршруты, а таксама маршрутныя таксі, якія курсуюць на суседніх вуліцах, хоць і далёка да месцаў сустрэч. Напрыканцы намеснік старшыні аблвыканкама падсумаваў, што парушэнняў законных правоў кандыдатаў у дэпутаты ў гэтым рашэнні гарадскіх уладаў не знойдзена, таму і адмяняць яго ці рабіць карэктывы няма сэнсу. Ігар Маслоўскі вырашаў на ўласным досведзе давесці, што месцы, якія гарвыканкам вызначыў для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі, не могуць быць выкарыстаны падчас агітацыйнай кампаніі. Ён разам са сваімі прыхільнікамі арганізавалі пікетаванні ў абодвух вызначаных месцах і, прастаяўшы на кожнай з пляцовак каля 20 хвілін, не распаўсюдзілі ніводнай перадвыбарчай улёткі, бо за гэты час там так і не з'явіліся людзі.

Беспаспяховымі аказаліся спробы і кандыдатаў з Гродна дамагчыся павелічэння колькасці месцаў для агітацыі. Першапачаткова старшыня абласной арганізацыі Партыі БНФ Вадзім Саранчукоў, кандыдат у дэпутаты па Гарадзенскай Цэнтральнай выбарчай акрузе №50, звярнуўся да старшыні Гарадзенскага гарадскога выканаўчага камітэта з просьбай унесці змены ў пункт 3 рашэння Гарадзенскага гарадскога выканаўчага камітэта №429 ад 09 жніўня 2012 г., дадаўшы да пераліку месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі Ленінскага раёна наступныя кропкі: пляцоўку прывакзальнай плошчы мясцовага аўтавакзала насупраць прыпынку, пляцоўку на пачатку вуліцы Паліграфістаў, насупраць крамы «Пралеска». Адказ на гэты зварот быў адмоўны. Пасля гэтага кандыдаты ад розных партый і рухаў — Вадзім Саранчукоў (ПБНФ), Дзмітрый Бандарчук (кампанія «Гавары праўду»), Юрый Істомін (АГП), Віктар Міхальчык і Павел Станеўскі (абодва «Справядлівы свет») звярнуліся ў ЦВК з просьбай паўплываць на мясцовыя ўлады дзеля пашырэння колькасці месцаў у горадзе, прыдатных для агітацыі. ЦВК за подпісам старшыні Лідзіі Ярмошынай у адказе «элегентна» спаслалася на пункты 2, 3, 4 часткі шостай артыкула 24 Выбарчага кодэкса, згодна з якімі «вызначэнне месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў у г. Гродна з'яўляецца кампетэнцыяй Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта, і Цэнтральная камісія не мае права даваць ацэнку прынятаму рашэнню».

Зафіксаваны выпадак, калі мясцовыя органы ўлады самастойна прымалі рашэнні па павелічэнні колькасці месцаў для агітацыі і паляпшэнні ўмоваў для яе ажыццяўлення. Так, першапачаткова ў Слоніме мясцовымі ўладамі былі вызначаны толькі 3 пляцоўкі для правядзення масавых мерапрыемстваў, але крыху пазней Слонімскі райвыканкам унёс дапаўненне ў сваё рашэнне і дадаў яшчэ тры месцы, дзе кандыдаты маглі ажыццяўляць агітацыйныя мерапрыемствы па-за памяшканнямі. Таксама калі па ранейшаму вызначэнні райвыканкама ў сельскай мясцовасці масавыя мерапрыемствы агітацыйнага характару можна было праводзіць толькі каля клубаў (а яны ёсць не ва ўсіх вёсках раёна), то па ўнесеных зменах кандыдаты маглі выступаць перад выбаршчыкамі яшчэ і на пляцоўках перад крамамі, кавярнямі, у вясковых скверах.

## 7.2. Умовы правядзення агітацыйных мерапрыемстваў

Артыкул 45.1 главы 10 ВК прадугледжвае заяўляльны парадак правядзення агітацыйных мерапрыемстваў. Рэалізацыя гэтай нормы ВК на практыцы адбывалася не заўсёды. Віцебскі райвыканкам не даў магчымасці даверанай асобе Леаніда Аўтухова, кандыдата ад ПБНФ, правесці пікет у в. Буяны Віцебскага раёна ў паведамляльным парадку. Суд Чыгуначнага раёна г. Віцебска не разгледзеў скаргу па гэтай справе ва ўстаноўлены законам трохдзённы тэрмін.

11 верасня ў г.п. Хоцімск Магілёўскай вобласці кандыдат ад Партыі БНФ па Крычаўскай выбарчай акрузе №83 Валерый Каранкевіч праводзіў свой агітацыйны пікет у дазволеным месцы. Мерапрыемства было спынена супрацоўнікамі міліцыі, а кандыдат затрыманы і дастаўлены ў

раённае аддзяленне міліцыі для дачы тлумачэнняў. Гэты ж кандыдат сутыкнуўся і з забаронай правядзення агітацыйнага пікета ў Клімавічах у дазволеным рашэннем райвыканкама месцы. Па дадзеным факце Валерый Каранкевіч падаў скаргу пракурору Клімавіцкага раёна Аляксандру Землякову на дзеянні начальніка ідэалагічнага аддзела Клімавіцкага райвыканкама Марыі Пракопчык. Начальнік ідэалагічнага аддзела спачатку сказала кандыдыту і ягонай даверанай асобе Аляксандру Балобіну, што не трэба ніякіх пісьмовых уведамленняў аб правядзенні пікетавання, дастаткова таго, што яе папярэдзілі, а потым забараніла пікет, бо яе не папярэдзілі пісьмова. У Крычаве Валерыю Каранкевічу 17 верасня ўдалося правесці агітацыйны пікет без інцыдэнтаў, але яго правядзенне ў дазволеным уладамі месцы каля гарадскога стадыёна «Сож» было малаэфектыўным, паколькі ў гэтым месцы людзі практычна не ходзяць. За цэлы дзень да пікетоўшчыкаў падышло толькі дванаццаць чалавек. Затое ўвага з боку праваахоўных органаў была падвышаная: пастаянна непадалёк ад пікета знаходзілася некалькі супрацоўнікаў міліцыі, а двое невядомых у цывільнай вопратцы з машыны вялі відэаздымкі ўсіх, хто падыходзіў да кандыдата.

Увагай мясцовых уладаў не быў абдзелены ў Бабруйску пікет кандыдата ў дэпутаты ад АГП Мацвея Хатары, які адбыўся 14 верасня на стадыёне па вуліцы Урыцкага. Варта адзначыць, што месца, вызначанае для пікетавання, было вельмі няўдалае, людзі туды фактычна не ходзяць, бо стадыён знаходзіцца ў закутку горада. Пікетоўцы вырашылі размясціцца звонку, каля самага плота стадыёна, каб іх хоць нехта пабачыў, але нават за гадзіну, якую яны прастаялі ў гэтым месцы, прайшло ўсяго каля 20 чалавек. Аднак амаль адразу пасля перамяшчэння пікета ў больш бачную зону прыйшлі супрацоўнікі міліцыі, КДБ, намеснік старшыні гарвыканкама Аляксандр Маркачоў і пачалі агітатараў праганяць за плот. Супрацоўнік міліцыі Сяргей Маркевіч паказаў паперу, дзе было пазначана, што пікетоўцы павінны знаходзіцца на пляцоўках, прылеглых да футбольнага поля. Магчыма, прадстаўнікі ўлады не хацелі, каб жыхары Бабруйска пабачылі расцяжку з вядомай цытатай Аляксандра Лукашэнкі «Выборы» — не пойду, всё равно обманут!». Асобных бабруйчан, якія падыходзілі да пікетоўшчыкаў, потым у дварах сустракалі супрацоўнікі міліцыі: спачатку спынілі аднаго з мясцовых сябраў БСДП «Грамада», крыху пазней — назіральніка ад БХК Сяржука Лацінскага, якога спыніў старэйшы лейтэнант крымінальнага вышуку Нягацін «для ўстанаўлення асобы». Праверыў пашпарт, прапіску, удакладніў, ці пражывае ён па гэтаму адрасе, перапісаў дадзеныя ў нататнік.

Непрыстасаванасць месцаў для агітацыйных масавых мерапрыемстваў у некаторых выпадках прыводзіла да кур'ёзаў. Так, у Віцебскай Горкаўскай выбарчай акрузе №17 незалежная кандыдатка Алена Фаміна 11 верасня спрабавала знайсці агітпляцоўку, вызначаную гарадскімі ўладамі. Арганізатары і ўдзельнікі пікета не адразу «пазналі» гэтае месца: у рашэнні выканкама было пазначана, што пляцоўка месціцца ў двары дома №25 корпус 1 па вуліцы Чкалава, а насамрэч яна знаходзілася ў адным з суседніх двароў. І, па сутнасці, агітпляцоўкай не з'яўлялася: гэта ўзгорак, зарослы травой, схіл якога мусіў бы быць «трыбунай» каля размешчанай унізе баскетбольнай пляцоўкі. Там не хадзілі людзі, бо паблізу няма нават сцежак. Зрэшты, наведнікі на пікеце ўсё ж былі — двое міліцыянтаў у форме, якія хаваліся за кутом бліжэйшай крамы,і чалавек у цывільным, які здымаў пікетоўцаў на відэакамеру і суправаджаў яшчэ адну зацікаўленую асобу — намесніка Першамайскай раённай адміністрацыі. Прадстаўнік адміністрацыі падышоў да пікетоўцаў, паказаў пасведчанне і спытаў, што яны тут робяць без дазволу. Кандыдат у дэпутаты паказала заяўку ў гарвыканкам. Удзельнікі пікета спрабавалі скарыстацца нагодай і сказалі, што месца для агітацыі вельмі непрыдатнае, і папрасілі дазволу перасунуцца бліжэй да кірмаша «Паўднёвы», дзе ёсць людзі. Але чыноўнік сказаў, што раз гэта месца вызначана, значыць тут і трэба праводзіць.

Фактычна па ўсёй краіне агітацыйная кампанія праходзіла пры нізкай цікавасці да яе з боку выбаршчыкаў і слабой актыўнасці многіх кандыдатаў. Напрыклад, у Магілёве толькі два кандыдаты ў дэпутаты, якіх падтрымлівала грамадзянская кампанія «Гавары праўду», Леанід Падбярэцкі і Аксана Закрэўская, амаль штодзённа выстаўлялі свае агітацыйныя пікеты ў дазволеных уладамі месцах, агітацыйная дзейнасць іншых кандыдатаў амаль не фіксавалася. Увага ўладных структур была прыцягнутая ў першую чаргу да тых, хто спрабаваў ажывіць выбарчую кампанію. Так, Леанід Падбярэцкі быў затрыманы за правядзенне пікета ў нявызначаным мясцовымі ўладамі месцы і дастаўлены ў РАУС для разбіральніцтва. Ужо вечарам таго дня адміністрацыйная справа кандыдата была закрыта і праз некалькі дзён за гэты інцыдэнт ён атрымаў афіцыйнае папярэджанне ад акруговай камісіі. Кандыдат Аксана Закрэўская была ўведамлена аб тым, што калі не перастане выкарыстоўваць герб горада ў сваіх перадвыбарчых агітацыйных матэрыялах,

то атрымае штраф у памеры 20 базавых велічынь. Прычынай такога патрабавання стаў ліст з гарвыканкама, які быў накіраваны ў акруговую камісію. Але А.Закрэўская адмовілася перарабляць агітацыйную прадукцыю, бо большая частка яе ўжо была распаўсюджана. Пагроза штрафу засталася толькі пагрозай на паперы. Сустрэчы з выбаршчыкамі спрабавалі праводзіць кандыдаты Таццяна Кузьмянкова (спарынг-партнёр праўладнага кандыдата Эдуарда Сянкевіча) і Леанід Падбярэцкі. На сустрэчу з першай кандыдаткай прыйшло каля 10 чалавек. На 4 сустрэчы Леаніда Падбярэцкага, якія адбываліся ў актавых залах школ №15, 35, 40 і Палацы культуры чыгуначнікаў, не прыйшоў ні адзін чалавек. Інфармаваннем аб сустрэчах з кандыдатамі займаліся выключна акруговыя камісіі.

У Віцебску агітацыйная кампанія таксама праходзіла не вельмі актыўна. Толькі два дэмакратычныя кандыдаты — Алена Фаміна і Аляксей Гаўруцікаў — правялі ў горадзе пікеты і сустрэчы з выбаршчыкамі. Сустрэча з выбаршчыкамі ў сярэдняй школе №45 кандыдата па Віцебскай Горкаўскай акрузе №18 Аляксея Гаўруцікава прайшла пры ўдзеле 20-25 чалавек, прычым перад мерапрыемствам было распаўсюджана каля 1 800 запрашэнняў.

Аднак у некаторых рэгіёнах агітацыйныя сустрэчы кандыдатаў праходзілі пры дастатковай цікавасці да іх з боку выбаршчыкаў. 5 верасня ў Салігорску ў «Клубе будаўнікоў» увечары адбылася перадвыбарчая сустрэча з кандыдатам у дэпутаты па Салігорскай гарадской выбарчай акрузе №68 Віктарам Малочкам. На мерапрыемстве ў якасці даверанай асобы таксама прысутнічаў лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. Паслухаць прадстаўнікоў апазіцыі сабралася каля 70 чалавек. Выступы праходзілі пад пільным кантролем з боку праваахоўных органаў. У цэлым мерапрыемства прайшло ў спакойнай і добразычлівай атмасферы. Кандыдат Віктар Малочка і яго даверaная асоба Анатоль Лябедзька распавялі пра кампанію «За свабодныя выбары без Лукашэнкі» і заклікалі выбарцаў не хадзіць на «псеўдавыбары ў ілжэпарламент». Але не абышлося без эксцэсаў. Падчас мерапрыемства адыёзны афіцэр салігорскай міліцыі Георгій Крывальцэвіч, адказны за шматлікія затрыманні і пераслед апазіцыі ў рэгіёне, спрабаваў арыштаваць даверaную асобу Віктара Малочкі Івана Шылу, пагражаючы яму двума суткамі арышту. Пасля кансультацый па тэлефоне Крывальцэвіч ад спробаў затрымаць маладзёна адмовіўся.

У Оршы масавыя мерапрыемствы агітацыйнага характару праводзілі сябар партыі «Справядлівы свет» Мікалай Петрушэнка і актывіст кампаніі «Гавары праўду» Канстанцін Анташкевіч, чыя каманда амаль штодня выстаўляла пікеты ў дазволеных месцах. Сустрэчы з выбаршчыкамі, якія праводзіў Канстанцін Анташкевіч, былі нешматлюднымі (ад 3-х да 50 чал.), і ў іх удзельнічалі ідэалагічныя работнікі, якія імкнуліся дыскрэдытаваць апазіцыйнага кандыдата. Сябар партыі «Справядлівы свет» Мікалай Дзямідаў таксама праводзіў сустрэчы з выбаршчыкамі, прычым менавіта выбаршчыкі былі ініцыятарамі сустрэч — запрашалі кандыдата абмеркаваць праблемныя пытанні.

Нягледзячы на існаванне канкурэнцыі па Маладэчанскай сельскай акрузе, падчас агітацыйнай кампаніі ўсе кандыдаты паводзілі сябе даволі пасіўна. Магчыма, што ахвоты ў правядзенні агітацыйных пікетаў не было з-за таго, што са спісу дазволеных месцаў райвыканкам выкрасліў сапраўды прыдатныя для гэтага месцы, пакінуўшы толькі месца адпачынку — амфітэатр і задворкі — школьныя стадыёны. Толькі непасрэдна перад выбарамі каля амфітэатра быў праведзены адзін пікет, на якім сябры БРСМ раздавалі ўлёткі праўладнай кандыдаткі Галіны Лазоўскай.

У Мінску некаторыя кандыдаты праводзілі агітацыю шляхам сустрэч з выбаршчыкамі ў месцах, вызначаных Мінгарвыканкамам у парадку арт. 45.1 ВК — гэта датычыла як праўладных, так і апазіцыйных, і незалежных кандыдатаў. Пікеты ў падтрымку праўладных кандыдатаў і супраць байкоту выбараў ладзіліся актывістамі РГА «Белая Русь» і БРСМ. 15 верасня ў сталіцы побач з Камароўскім рынкам адбыўся пікет пад лозунгам: «Палітвязні ёсць — выбараў няма» кандыдатаў ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі, да якога далучыліся прадстаўнікі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. У гэты час побач праходзіў пікет галоўнага доктара 34-й гарадской паліклінікі і сябра Белай Русі Дзмітрыя Шаўцова, які адмаўляў, што палітвязні ў Беларусі існуюць. Апазіцыйныя кандыдаты падчас пікета стаялі з партрэтамі палітвязняў. Анатоль Лябедзька і Вольга Кавалькова нагадвалі выбаршчыкам, што пакуль апаненты ўлады знаходзяцца за кратамі, яны не збіраюцца ўдзельнічаць у выбарах. Гучалі заклікі байкатаваць выбары і не хадзіць галасаваць, а побач прыхільнікі Дзмітрыя Шаўцова заклікалі ў выбарах удзельнічаць і галасаваць за іх кандыдата.

Тэма палітвязняў выкарыстоўвалася даволі актыўна дэмакратычнымі кандыдатамі пры правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў як у Мінску, так і ў рэгіёнах. 16 верасня каля гандлёвага цэнтра «Карона» ў Мінску прайшоў пікет у падтрымку палітвязняў кандыдата ў дэпутаты па Кальварыйскай акрузе №104 Таццяны Караткевіч (кампанія «Гавары праўду»). Іншы актывіст гэтай кампаніі Яраслаў Берніковіч, які балатаваўся па Наваполацкай выбарчай акрузе №25, на агітацыйных пікетах не толькі агітаваў за сябе, але і нагадваў навапалачанам пра тое, што ў Беларусі застаюцца палітвязні, і што кожны ахвотны можа выказаць ім салідарнасць і падтрымку. На пікеце Яраслава Берніковіча былі два стэнды: адзін — з партрэтам кандыдата і палажэннямі Грамадзянскай дамовы, у межах якой працуюць удзельнікі кампаніі «Гавары праўду»; другі — з партрэтамі палітвязняў і адрасамі ўстановаў, дзе яны адбываюць тэрмін зняволення. Калі ў Мінску ва ўдзельнікаў пікетаў не ўзнікала праблем у сувязі з актуалізацыяй праблемы палітвязняў, то дадзеным аспектам агітацыйнай дзейнасці Я. Берніковаіча цікавіліся супрацоўнікі міліцыі і спрабавалі даставіць яго ў акруговую камісію для ацэнкі зместу агітацыі, але да санкцыяй так і не дайшло. У Пінску старшыня АВК Пінскай гарадской выбарчай акругі №14 Ігар Берасцень пагражаў кандыдату ад ПБНФ Аляксандру Рамановічу разглядам пытання аб адпаведнасці Выбарчаму кодэксу тэмы палітвязняў, якая закранался падчас ягонага перадвыбарчага пікета 16 верасня. Па меркаванні старшыні АВК, інфармацыя пра палітвязняў не тычыцца выбараў, таму паводзіны кандыдата будуць разгледжаны на чарговым паседжанні камісіі. Але санкцый у адносінах А. Рамановіча не было прадпрынята, паколькі кандыдат зняўся з выбарчай гонкі.

Агітацыйная кампанія па ўсёй краіне не выклікала вялікай зацікаўленасці ў насельніцтва. Адну з магчымых прычын агучыў кіраўнік кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў падчас пікета ў Мінску ў падтрымку кандыдата Таццяны Караткевіч, які прайшоў у цэнтры сталіцы побач з філармоніяй 12 верасня: «Нават калі паглядзець, як праходзіць наш сённяшні пікет... Людзі праходзяць міма, крыху затрымліваюцца, але, пабачыўшы тут акрэдытаванага КДБ аператара, думаюць, ці варта ім тут заставацца, дый сыходзяць далей. Грамадства запалоханае».

Органы мясцовай улады не садзейнічалі правядзенню агітацыйных мерапрыемстваў і распаўсюду інфармацыі пра сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі. Зафіксаваны факты ўскладнення выкарыстання памяшканняў, прызначаных для сустрэч з выбаршчыкамі. Гаспадары памяшканняў адмаўляліся іх прадаставіць, матывуючы занятасцю. І гэта датычылася не толькі апазіцыйных кандыдатаў, але і тых, у кім улады былі проста незацікаўлены. Так, 11 верасня ў жодзінскім ДК «БелАЗ» павінна была прайсці заяўленая і ўзгодненая з акруговай камісіяй сустрэча кандыдата ў дэпутаты ад КПБ Сяргея Васілеўскага з выбаршчыкамі. Аднак малая зала ДК «БелАЗ» у вызначаны час аказалася пад замком. Ніводнай прыкметы таго, што да сустрэчы ў Доме культуры нехта рыхтаваўся, не было. Не было ні выбаршчыкаў, ні прадстаўнікоў АВК, якія звычайна прыходзяць на падобныя сутрэчы, ні звычайных для падобнага мерапрыемства прыладаў. Кандыдат ад КПБ пры гэтым у вызначаны тэрмін падаваў заяўку ў акруговую камісію і ўласнаручна расклеіў 40 абвестак па горадзе. 13 верасня на сустрэчу з Сяргеем Васілеўскім у ДК «Равеснік» у Жодзіне прыйшоў толькі адзін выбаршчык, а ў афіцыйна выдзеленым памяшканні пад шырмай «рамонту» аказаліся банкетныя сталы пад белымі вясельнымі абрусамі. Пры падрыхтоўцы да сустрэчы кандыдат папярэдне падаваў заяўку ў АВК акругі №64, а газета гарвыканкама «Жодзінскія Навіны» 12 верасня належным чынам апублікавала адпаведную абвестку. Немагчыма было зразумець, хто загадаў зачыніць спецыяльна выдзеленае для сустрэч памяшканне, у якое праз абвестку ў афіцыйнай газеце запрашаліся жодзінцы. Дырэктар ДК Ірына Анцітовіч заявіла, што памяшканне не падрыхтавана да выбарчай сустрэчы, бо ў ім робіцца рамонт.

Агітацыйныя мерапрыемствы апазіцыйных кандыдатаў нярэдка сутыкаліся з перашкодамі з боку органаў выканаўчай улады. У апошнія дні агітацыйнай кампаніі мясцовыя ўлады і кіраўніцтва некаторых прадпрыемстваў адмовілі кандыдату ў дэпутаты па Лунінецкай выбарчай акрузе №13 Віталю Каратышу ў правядзенні сустрэч у працоўных калектывах. Так, пасля адмовы ў сустрэчы з рабочымі лунінецкага прадпрыемства «Палессеэлектрамаш», аналагічным чынам паводзіла сябе і кіраўніцтва аб'яднання «Граніт» у Мікашэвічах. На тэрыторыю гэтага прадпрыемства В.Каратыш трапіў на службовым аўтобусе і спрабаваў падчас нефармальных гутарак з рабочымі распаўсюдзіць свае інфармацыйныя матэрыялы. Але пасля ўмяшальніцтва кіраўніцтва «Граніту» супрацоўнікі службы аховы прадпрыемства спынілі сустрэчу і загадалі кандыдату ў дэпутаты з'ехаць з тэрыторыі аб'яднання.

7 верасня па загадзе кіраўніцтва сельскага прамысловага комплексу «Славуцічы» Зэльвенскага раёна была спынена сустрэча з вясковымі механізатарамі кандыдатаў у дэпутаты па Сло-

німскай ВА № 58 Івана Шэгі (ПБНФ) і Міхаіла Караткевіча (БПЛ «Справядлівы свет»). Кандыдаты раніцай перад пачаткам працоўнага дня былі ўжо на тэрыторыі сельскага комплексу, сабраліся працоўныя, аднак перад самай сустрэчай начальнік мехдвара, які атрымаў загад ад кіраўніцтва гаспадаркі, спыніў гэта мерапрыемства і запатрабаваў ад механізатараў ісці на працоўныя месцы. Такая ж сітуацыя мела месца ў СВК «Сынковічы» Зэльвенскага раёна. Напярэдадні кандыдаты звярнуліся да начальніка аўтакалоны і галоўнага інжынера на мехдвары СВК «Сынковічы» з прапановай правесці сустрэчу з механізатарамі гаспадаркі. Была дасягнута дамоўленасць, што 4 верасня ў 07.45 мы зможам яе правесці. 4 верасня, у дамоўлены час, кандыдаты прыехалі на мехдвор, аднак старшыня СВК «Сынковічы» Дзмітрый Дзешка адмовіў у правядзенні сустрэчы, аргументуючы гэта тым, што кандыдаты не дамовіліся асабіста з ім. Варта адзначыць, што на тым жа мехдвары кандыдат ад улады Ала Сопікава бесперашкодна праводзіла сваю сустрэчу 27 жніўня ў працоўны час.

Агітацыю ў падтрымку кандыдатаў, лаяльных уладзе, актыўна ажыццяўлялі прадстаўнікі выканкамаў, кіраўнікі дзяржаўных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў. У многіх месцах яны стваралі спрыяльныя ўмовы для сустрэч праўладных кандыдатаў з выбаршчыкамі, практычна паўсюль у гэтых мэтах выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс. Праводзіліся сходы ў калектывах і арганізоўваліся сустрэчы з кандыдатамі ад улады, нярэдка — у працоўны час. Так, у працоўны час у г. Быхаве адбылася сустрэча кандыдата па Быхаўскай ВА №81, старшыні Слаўгарадскага райсавета і Слаўгарадскай раённай арганізацыі Белая Русь Таццяны Кананчук з калектывам мясцовага хлебазавода. Адміністрацыя СШ №9 г. Маладэчна арганізоўвала педкалектыў і бацькоў вучняў на сустрэчу з кандыдатам па Маладзечанскай сельскай ВА №73, дырэктарам прадпрыемства «Бярэзінскае» Станіславам Куляшом. Адміністрацыйны рэсурс прыцягваўся таксама для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі кандыдата па Аршанскай Дняпроўскай ВА №27, старшыні Аршанскага раённага выканаўчага камітэта Уладзіміра Дзедушкіна. Дзяржаўныя структуры забяспечвалі падтрымку аднаму з пяці кандыдатаў па Брэсцкай Заходняй ВА №1, генеральнаму дырэктару прадпрыемства «Брэсцкі цэнтральны ўнівермаг» Віктару Валюшыцкаму. Яго сустрэчы з выбаршчыкамі ў працоўных калектывах праводзіліся ў працоўны час з удзелам прадстаўнікоў Ленінскага райвыканкама г. Брэста. У бальніцах і паліклініках раёна, у крамах гандлёвай сеткі «Сантэ» віселі толькі друкаваныя агітацыйныя матэрыялы толькі гэтага кандыдата.

Падчас сустрэчы кандыдата ў дэпутаты, намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Агеева з працаўнікамі прадпрыемства «Бабушкина крынка» апазіцыйнага кандыдата, намесніка старшыні ПБНФ Рыгора Кастусёва спрабавалі не дапусціць на прадпрыемства. Пра тое, што ў Аляксандра Агеева запланавана гэтая сустрэча з выбаршчыкамі, кандыдат даведаўся ад сваёй даверанай асобы, бялыніцкага актывіста Партыі БНФ Мікалая Мяцеліцы. Яму паведамілі пра гэта работнікі прадпрыемства, сказаўшы, што ў 7-30 раніцы 11 жніўня ўсім загадана быць на сустрэчы з А. Агеевым. Р. Кастусёў са сваёй даверанай асобай вырашылі таксама паўдзельнічаць у сустрэчы, але калі раніцай прыехалі на прадпрыемства, то ахова іх не прапусціла. Пасля гэтага з'явіліся Аляксандр Агееў і суправаджаючыя яго прадстаўнік акруговай камісіі Шклоўскай выбарчай акругі № 90, а таксама дырэктар цэха па вытворчасці сыроў ААТ «Бабушкиной крынки» Тамара Галёта. Яны доўга раіліся, аднак урэшце-рэшт пасля настойлівых патрабаванняў кандыдата вымушаны былі прапуцісць. Супрацоўнікі прадпрыемства мелі магчымасць пабачыць, якія адносіны да апазіцыйнага кандыдата, калі на сустрэчу з выбаршчыкамі яму прыйшлося літаральна прарывацца з боем.

Кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Крычаўскай выбарчай акрузе №83 Валерый Каранкевіч 17 верасня падаў скаргу на выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу ягоным канкурэнтам, першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзімірам Краўцовым. У скарзе прыводзіліся факты правядзення У. Краўцовым сустрэч з выбаршчыкамі на прадпрыемствах Хоцімскага раёна ў працоўны час (у СВК «Акцябр-Бярозкі», у Хоцімскім Райста), якія арганізоўвалі падначаленыя яму работнікі Хоцімскага райвыканкама, у тым ліку яго старшыня Фёдар Вішнеўскі. Адпаведнай закону рэакцыі на скаргу Валерыя Каранкевіча не было.

# ЗНЯЦЦЕ КАНДЫДАТАЎ АГП І ПБНФ

15 верасня АГП і Партыя БНФ скасавалі свае рашэнні пра вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, а 17 верасня накіравалі ў АВК адпаведныя дакументы. Падставай для гэтага партыі назвалі наяўнасць у краіне палітвязняў і адсутнасць пазітыўных зменаў ва ўмовах выбарчага працэсу, у тым ліку, неўключэнне прадстаўнікоў апазіцыі ў склад выбарчых камісій. АГП указала на тое, што ў ВК па-ранейшаму застаюцца шырокія магчымасці маніпулявання вынікамі выбараў падчас пяцідзённага датэрміновага галасавання.

У Рэзалюцыі другой сесіі пазачарговага XV З'езда Партыі БНФ ад 15 верасня адзначалася: «На падставе абранай Партыяй БНФ тактыкі абумоўленага ўдзелу ў выбарчым працэсе пазачарговы XV З'езд Партыі БНФ канстатуе, што выбарчая кампанія была несвабоднай, непразрыстай, яна не давала магчымасцяў кандыдатам на роўных канкураваць за галасы выбаршчыкаў і не адпавядала абавязальніцтвам Беларусі як краіны-удзельніцы АБСЕ, а створаныя без удзелу апазіцыі ўчастковыя камісіі не могуць лічыцца органамі, што сумленна падлічваюць галасы выбаршчыкаў. З улікам выкладзенага і кіруючыся папярэднімі рашэннямі пра фармат і ўмовы ўдзелу ў выбарчай кампаніі, Партыя БНФ: скасоўвае сваё рашэнне аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў; заклікае выбаршчыкаў устрымацца ад удзелу ў галасаванні на падставе адсутнасці сумленных і справядлівых выбараў».

У дакуменце АГП аб выніках першага этапу кампаніі «За сумленныя выбары без «Лукашэнкі» ад 15 верасня адзначалася: «На сакавіцкім з'ездзе 2012 Аб'яднаная грамадзянская партыя прыняла стратэгію барацьбы «За сумленныя выбары без «Лукашэнкі»!». Стратэгія грунтуецца на тым факце, што ў краіне няма выбараў як такіх: вынікі «народнага волевыяўлення» прадказальныя і не маюць нічога агульнага з рэальным выбарам народа (...) АГП здолела скласці план дзеянняў, навязаць яго ўладзе і паспяхова і паслядоўна яго рэалізаваць. Упершыню была ўжытая тактыка, якую можна вызначыць як «кіруемы байкот». Апазіцыйная партыя здолела прарвацца ў сродкі масавай інфармацыі, якія незаконна манапалізаваны рэжымам (...) Сёння адбылася другая сесія пазачарговага з'езда, якая зняла ўсіх «кандыдатаў» ад АГП. Аднак гэта ні ў якім выпадку не азначае заканчэння кампаніі «За сумленныя выбары без «Лукашэнкі»!» (...) Першы этап гэтай кампаніі будзе завершаны актыўным удзелам у назіранні за яўкай выбаршчыкаў на ўчасткі для галасавання (...). Пачынаючы з першага дня датэрміновага галасавання, максімальная колькасць участкаў павінна быць пад кантролем назіральнікаў, пажадана, з фотаапаратамі, а лепш — відэакамерамі, каб зафіксаваць рэальную колькасць тых людзей, хто прыйшоў на ўчасткі. Мы разумеем, што ўлады могуць «намаляваць» любы неабходны ім вынік, нават пры наяўнасці самога шчыльнага назірання. Але пры ўсім гэтым назіральнікі будуць ведаць, што ўлады хлусяць (...)»

Сярод апазіцыйных партый менавіта АГП і Партыя БНФ вылучылі найбольшую колькасць кандыдатаў у дэпутаты — 35 і 31 адпаведна. З апазіцыйных партый у выбарах працягнулі ўдзел Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» (29 кандыдатаў) і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) (11 кандыдатаў), 1 кандыдат ад незарэгістраванага аргкамітэта Партыі свабоды і прагрэсу, а таксама кандыдаты, што вылучаліся шляхам збору подпісаў пры падтрымцы незарэгістраванай кампаніі «Гавары праўду» і грамадскага аб'яднання «Рух «За Свабоду».

З ліку неапазіцыйных партый выбарчую кампанію працягнулі вылучэнцы ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі (70 кандыдатаў), Камуністычнай партыі Беларусі (21), Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (8), Аграрнай партыі (1) і Сацыяльна-спартыўнай партыі (1).

У выніку зняцця кандыдатаў вядучымі апазіцыйнымі партыямі 15 акругаў аказаліся безальтэрнатыўнымі: Баранавічская Заходняя акруга №5, Баранавічская сельская акруга №7, Белавежская акруга №8, Пружанская акруга №9, Пінская гарадская акруга №14, Гомельская Сельмашаўская акруга №32, Ваўкавыская акруга №48, Гродзенская сельская акруга №52, Мастоўская акруга №56, Навагрудская акруга №57, Смаргонская акруга №59, Шчучынская акруга №60, Барысаўская акруга №62, Вілейская акруга №74, Заслаўская акруга №77.

Такім чынам, у Гродзенскай вобласці з 13 акругаў было 6 безальтэрнатыўных, у Брэсцкай — 5, у Мінскай — 3, у Гомельскай вобласці — адна. Іх сумарная колькасць прыблізна адпавядае колькасці безальтэрнатыўных акругаў на парламенцкіх выбарах 2008 г. (16), але перавышае колькасць на парламенцкіх выбарах 2004 г. (8 безальтэрнатыўных акругаў). Традыцыйна безальтэрнатыўнасць акругаў найбольш характэрная для рэгіёнаў, асабліва сельскіх. Сталіцы ўласцівая канкурэнцыя на выбарах.

# ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Згодна з арт. 53 Выбарчага кодэкса, датэрміновае галасаванне пачынаецца не раней за пяць дзён да дня выбараў. Яно адбываецца ў памяшканні УВК у прысутнасці не менш за двух яе сяброў з 10 да 14 і з 16 да 19 гадзін. Афіцыйнага пацвярджэння немагчымасці прагаласаваць у дзень выбараў ад выбаршчыкаў не патрабуецца. У першы дзень датэрміновага галасавання пламбіруюцца і апячатваюцца скрыні. УВК штодзённа складае і вывешвае пратакол, у якім указана агульная колькасць атрыманых бюлетэняў, колькасць выбаршчыкаў, якія іх атрымалі (у апошні дзень — агульная колькасць за ўсе дні), колькасць сапсаваных і асобна — нявыкарыстаных бюлетэняў. Прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні забаронены.

Згодна з Каляндарным планам, датэрміновае галасаванне праводзілася з 18 да 22 верасня 2012 г. уключна.

## 1. Прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні

Пачынаючы з першай дэкады верасня, фіксавалася інтэнсіўнае выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу для забеспячэння датэрміновага галасавання. Адначасова дзяржаўныя СМІ разгарнулі адкрытую прапаганду датэрміновага галасавання.

У сярэдзіне верасня аддзел ідэалагічнай працы Салігорскага райвыканкама распачаў працу па арганізацыі прымусовага датэрміновага галасавання. Ажыццяўляць ціск на жыхароў рэгіёна ідэолагі пачалі праз адміністрацыі мясцовых прадпрыемстваў. Пра гэта незалежным назіральнікам паведамілі прадстаўнікі адразу некалькіх дзяржаўных і прыватных устаноў. Адмысловыя інфармацыйныя матэрыялы з'явіліся на старонках газеты «Шахцёр», у эфіры мясцовага радыё і на Салігорскім тэлеканале. Штодня тэлеканал СТК падаваў зводкі з участковых камісій пра працэнт выбаршчыкаў, прагаласаваўшых датэрмінова, газета «Шахцёр» публікавала недвухсэнсоўныя заклікі мясцовых чыноўнікаў і начальнікаў да актыўнага галасавання. Актыўны ўдзел у папулярызацыі датэрміновага галасавання прыняла старшыня камісіі Салігорскай сельскай выбарчай акругі Таццяна Ярота, якая набыла вядомасць падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў. Тады на ўзначальваемым ёю ўчастку пры падліку бюлетэняў са скрыні для датэрміновага галасавання за дзеючага кіраўніка краіны было «аддадзена» 98% галасоў (гэтая лічба значна адрознівалася ад вынікаў у асноўны дзень галасавання).

У Пінску напярэдадні датэрміновага галасавання прайшоў адзіны дзень інфармавання з тэматыкай «Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь. Айчынны і сусветны вопыт». У межах яго прапагандысцкія групы Брэсцкага аблвыканкама наведалі буйныя прадпрыемствы ААТ «Палессе» і ААТ «Кавліцмаш», а агітатары з гарвыканкама — Палескі дзяржуніверсітэт, сярэднія школы №3 і №14, ААТ «Пінагрузсервіс» і праектна-канструктарскую майстэрню МАРС. Падчас датэрміновага галасавання «Пінскі веснік» апублікаваў зварот старшыні Пінскага гарвыканкама Аляксандра Гордзіча да гараджан выканаць свой грамадзянскі абавязак і прыняць удзел у выбарах. У гэтым жа нумары на першай паласе «Пінскага весніка» быў размешчаны матэрыял аб узорным датэрміновым галасаванні навучэнцаў Дзяржаўнага медкаледжу, якія, як заўсёды, актыўныя ў працэсе датэрміновага волевыяўлення таму, што «наперадзе выходныя і паездкі да бацькоў». Матэрыялы аб галасаванні навучэнцаў гэтай пінскай навучальнай установы зрабілі і мясцовыя тэлеканалы.

«Маладзечанская газета» ў нумары за 19 верасня напісала пра актыўнасць навучэнцаў політэхнічнага каледжа, якія ўжо з першага дня датэрміновага галасавання праявілі актыўнасць і прыходзілі на выбарчыя ўчасткі. Але назіральнікам стала вядома, што гэта не было ініцыятывай саміх маладых выбаршчыкаў. Прыняць удзел у галасаванні як мага раней іх папрасілі выкладчыкі, і асабліва настойвалі на гэтым — у каледжаўскім інтэрнаце.

Нягледзячы на заканадаўча замацаваную забарону прымусу да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні, падобныя факты зафіксаваны ў сярэднім на 16,8% ВУ, дзе ажыццяўлялася назіранне.

У асноўным датэрмінова галасавалі асобы, якія залежаць ад дзяржаўных органаў — іншагародняя студэнты, навучэнцы, жыхары інтэрнатаў, ваеннаслужачыя, супрацоўнікі дзяржаўных устаноў, грамадзяне, асуджаныя да абмежавання волі, і інш. Прыкметамі адміністрацыйнага прымусу да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні былі: просьба выбаршчыкаў да членаў УВК выдаць даведку пра ўдзел у галасаванні, арганізаваны прывод ці прывоз выбаршчыкаў на ўчастак для галасавання, інфармаванне членамі УВК прадстаўнікоў адміністрацыі аб удзеле ў датэрміновым галасаванні і інш. Фіксаваліся шматлікія выпадкі ўдакладнення сябрамі УВК і прадстаўніка-

мі дзяржаўных прадпрыемстваў і навучальных устаноў спісаў прагаласаваўшых і не прагаласаваўшых, што відавочна сведчыць пра кантроль за сітуацыяй.

21 верасня актыўна ішло датэрміновае галасаванне на ўчастку №12 Гомельскай Цэнтральнай акругі, дзе ішлі прагаласаваць у асноўным студэнты медыцынскага ўніверсітэта. На пытанне: «Чаму вы галасуеце датэрмінова?» большасць апытаных студэнтаў адказвалі: «Нам сказалі, каб прагаласавалі», «Мне патэлефанавалі з універсітэта і сказалі, каб я сёння прагаласавала». На пытанне: «А што будзе, калі не прагаласуеце?», студэнты адказвалі: «Напэўна, могуць быць нейкія праблемы, мы думаем, што лепш прагаласаваць».

Студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта паведамлялі назіральнікам, што ім настойліва «параілі» прагаласаваць датэрмінова на ўзроўні дэканаў і іх намеснікаў. У дэканаты штодня паступала інфармацыя з выбарчага ўчастка №9, на якім галасавала большасць студэнтаў, зарэгістраваных у інтэрнатах універсітэта. Тым, хто не прагаласаваў датэрмінова, намякалі на магчымасць непрыемнасцяў. Не заставалася ў баку і адміністрацыя інтэрнатаў. Выхавацелі абыходзілі пакоі і абяцалі праблемы ў выпадку няяўкі на датэрміновае галасаванне. Ускосным сведчаннем недобраахвотнага ўдзелу студэнтаў у выбарах служыць той факт, што на суседніх з 9 участках яўка выбаршчыкаў была значна ніжэйшай.

У Гродна прымусам да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні вызначыліся выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. На факультэце гісторыі і сацыялогіі гэтай навучальнай установы намеснік дэкана Мікалай Мыслівец і выкладчык Сяргей Амелька сабралі іншагародніх студэнтаў на занятках і павялі на датэрміновае галасаванне на выбарчы ўчастак. Аналагічная сітуацыя зафіксавана і ў Гродзенскім педагагічным каледжы. На ўчастку №13 Гарадзенскай-Цэнтральнай акругі №50, які размяшчаўся ў інтэрнаце Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа 20 верасня незалежныя назіральнікі зафіксавалі факт, як студэнт браў даведку ва ўчастковай камісіі для прадстаўлення яе ў дэканат сваёй навучальнай установы.

На ўчастку для галасавання №32 Брэсцкай-Усходняй акругі №3, які знаходзіўся ў кафэ «Зодчыя» (былая студэнцкая сталовая), і да якога належалі выбаршчыкі, прапісаныя ў бліжэйшых інтэрнатах Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, ужо 19 верасня прагаласаваў 431 выбаршчык, што з'яўлялася своеасаблівым рэкордам. Амаль усе прагаласаваўшыя — студэнты БДТУ, якія, як правіла, прыходзілі галасаваць арганізавана і ў той час, калі у іх павінны быць заняткі. Таксама вельмі актыўна датэрміновае галасаванне адбывалася на ўчастку №15 гэтай выбарчай акругі, размешчаным на тэрыторыі інтэрната Брэсцкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа. Паводле дадзеных незалежных назіральнікаў, 19 верасня там прагаласавалі 243 чалавекі, у асноўным прадстаўнікі гэтай навучальнай установы.

У Слонімскім дзяржаўным медыцынскім каледжы па загаду адміністрацыі на выбарчы ўчастак студэнтаў накіроўвалі групамі. Калі 18 верасня датэрмінова прагаласавалі 30 чалавек, то 19 верасня на выбарчы ўчастак даставілі ўжо 70 навучэнцаў.

У Мінску іншагароднім студэнтам Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта імя Сахарава дэканат «прапанаваў» прагаласаваць датэрмінова замест заняткаў. Таксама тым, хто прагаласуе датэрмінова, абяцалі дапамагчы з атрыманнем пакоя, а калі адмовяцца галасаваць — пазбавіць інтэрната. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва студэнтам прапаноўвалі дадатковыя выходны за тое, што яны прагаласуюць датэрмінова: на заняткі можна будзе не хадзіць з 21 да 24 верасня. На факультэце інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі БНТУ таксама выкарыстоўваўся «мяккі» варыянт заахвочвання да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні. Афіцыйнага загаду рэктарату БНТУ пра выходныя дні ў пятніцу і суботу (21 і 22 верасня) не было, але прагучала вуснае абяцанне ад адміністрацыі ўніверсітэта. Студэнты Мінскага інстытута кіравання паведамілі, што намеснікі дэканаў ходзяць па групах са спісам іншагародніх студэнтаў і кажуць, каб яны абавязкова прагаласавалі датэрмінова. І ўсё адбываецца пад кантролем рэктара ВНУ Мікалая Сушы. Калі ж нехта не прагаласуе, а гэта ўбачаць па спісах, будуць «прымацца меры», але якія — не ўдакладнялася.

У Горацкай выбарчай акрузе №83 на выбарчым участку №3 18 верасня ў Горках за паўгадзіны прагаласавала каля 250 выбаршчыкаў, практычна ўсе — студэнты Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Некаторыя прыходзілі самі па аднаму, некаторых прыводзілі куратары груп, якія на выхадзе з участка чакалі, пакуль іх выхаванцы выканаюць «грамадзянскі абавязак».

Студэнтаў Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта на датэрміновае галасаванне прымушаліісці куратары і прадстаўнікі студэнцкага актыву. За тры дні на ўчастку №21 Баранавіцкай Усходняй акругі № 6 прагаласавала 801 чалавек, што склала 31, 6% ад спісу. На гэтым участку галасавалі сту-

дэнты, якія прапісаныя ва ўніверсітэцкіх інтэрнатах. Сярод куратараў, якія забяспечвалі датэрміновае галасавнне, студэнты называлі Наталлю Маісеенка і Ганну Верамейка, якія пагражалі ў выпадку адмовы высяленнем з інтэрната ці пазбаўленнем стыпендыі. На скаргу назіральніка Сяргея Гоўшы па дадзеных фактах старшыня акруговай выбарчай камісіі Баранавіцкай Заходняй выбарчай акругі №5 Таццяна Латышава адказала, што «куратары Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Наталля Маісеенка і Ганна Верамейка не прымушалі студэнтаў да датэрміновага галасавання, а толькі інфармавалі іх аб магчымасці такога галасавання на працягу 18-22 верасня».

У Івацэвічах (Івацэвіцкая выбарчая акруга №11) намеснік начальніка Івацэвікага РАУС па выхаваўчай працы і жонка пракурора Івацэвіцкага раёна Ларыса Колбік далі каманду прагаласаваць кожнаму супрацоўніку райаддзела да абеда ў першы дзень галасавання, «каб пазбегчы непрыемнасцяў». Л.Колбік папярэдзіла, што пракантралюе.

У Бярозе 18 верасня на выбарчы ўчастак №57 Пружанскай выбарчай акругі №9 у першы дзень датэрміновага галасавання прывезлі з мясцовай вайсковай часткі да абеда 12 салдат тэрміновай службы, а за паўгадзіны да закрыцця, у 18.30 — 44 вайскоўцаў тэрміновай службы. Салдаты адзначалі, што дастаўлены яны прагаласаваць датэрмінова па загадзе нампаліта.

Дырэктар Слонімскага раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Пакала ад сваіх рабочых запатрабаваў, каб усе яны прагаласавалі датэрмінова. Ягоная жонка, якая працуе на гэтым прадпрыемстве дыспетчарам, 19 верасня тэлефанавала на мабільныя і хатнія тэлефоны ўсім работнікам гаспадаркі і загадвала ад імя дырэктара на працягу бліжэйшых двух дзён прыйсці на свае выбарчыя ўчасткі і прагаласаваць датэрмінова. На пытанне работнікаў РУП ЖКГ, што будзе, калі яны наогул не пойдуць на выбары, дыспетчар адказвала, што будуць непрыемнасці. Праўда, якія будуць непрыемнасці — жанчына не тлумачыла.

Назіральнік ад КХП-БНФ Юлія Балакір, якая працавала на ўчастку №5 па Слуцкай выбарчай акрузе №67, зафіксавала наступны факт. У другі дзень датэрміновага галасавання, 19 верасня, на ўчастак прыйшлі двое мужчын, у аднаго з якіх пры сабе не аказалася пашпарта, і сябры камісіі адмовіліся выдаць яму бюлетэнь. Мужчына адкрытым тэкстам заявіў: «Нас з працы на гадзіну раней адпусцілі, сказалі, што сёння ўсім прагаласаваць трэба, інакш звольняць». Яго калега адразу ж зашыкаў на яго: «Маўчы!». Мужчына сказаў, што працуе ў ПМК.

Назіральнік на салігорскіх сельскіх участках №76 і №77 Уладзімір Шыла паведаміў, што 19 верасня адна жанчына пасля галасавання папрасіла ў камісіі даведку з пячаткай аб тым, што яна прыняла ўдзел у датэрміновым галасаванні, каб паказаць кіраўніцтву на працы. У іншай жанчыны не было пашпарта, толькі нейкая паперка з працы, па якой камісія не дазволіла ёй прагаласаваць. Жанчына ледзь не расплакалася, кажучы, што не зможа апраўдацца перад начальнікам за тое, што не прагаласавала.

## 2. Умовы для назірання падчас датэрміновага галасавання

Некаторыя назіральнікі сутыкнуліся з адмовамі ў акрэдытацыі на ўчастках. Прэтэнзіі старшынь камісій да назіральнікаў часцей за ўсё датычылі фармальнасцяў, а ў некаторых выпадках — незаконных патрабаванняў.

У Магілёўскай Прамысловай выбарчай акрузе №87 да назірання ў першы дзень датэрміновага галасавання не дапусцілі не меней за 30 чалавек. Афіцыйна гэта было патлумачана тым, што на пратаколах вылучэння назіральнікаў ад Магілёўскай абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі няма пячаткі. Лідар магілёўскай арганізацыі АГП Уладзімір Шанцаў адзначыў, што пячаткі ў абласной арганізацыі АГП проста няма. Пры гэтым Цэнтральная выбарчая камісія вызначыла, што ў пратаколе пасяджэння структурнага падраздзялення партыі ці грамадскай арганізацыі пячатка ставіцца толькі пры яе наяўнасці. Аднак старшыня акруговай выбарчай камісіі сп.Кажэмякін сказаў партыйнаму лідару: ёсць пячатка — няма праблем, і яму ўсё адно, што рэкамендавала Цэнтральная камісія, у яго на гэта ёсць асабістае меркаванне. Толькі пасля таго, як Цэнтрвыбаркам загадаў акруговай выбарчай камісіі №87 дапусціць назіральнікаў, пытанне было вырашана.

У Гародні першапачаткова камісія выбарчага ўчастку №15 Гарадзенскай Цэнтральнай выбарчай акругі адмовілася рэгістраваць назіральніцу Алену Ксенз на той падставе, што яна не з'яўляецца сябрам Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Пры тым у дзяўчыны патрабавалі партыйнае пасведчанне. Прыйшлося ў сітуацыю ўмяшацца каардынатарам і юрыстам кампаніі «За справядлівыя выбары», якія прыехалі і давялі ўчастковай камісіі, што яна парушае заканадаўства, паколькі палітычная партыя мае права вылучаць назіральнікамі як сваіх сябраў, так і іншых гра-

мадзян, якія могуць быць яе прадстаўнікамі. Урэшце ўчастковая камісія атрымала на свой запыт жорсткае ўказанне з Цэнтральнай выбарчай камісіі і зарэгістравала назіральніцу.

19 верасня не былі дапушчаны як мінімум чатыры назіральнікі на выбарчыя ўчасткі на тэрыторыі Магілёўскай-Прамысловай выбарчай акругі №87. Першапачатковай прычынай нядопуску назіральнікаў з'яўлялася тое, што ў пратаколах вылучэння назіральнікаў ад абласной арганізацыі ГА БНФ «Адраджэньне» не быў пазначаны юрыдычны адрас і тэлефон. Пасля адпаведных выпраўленняў у пратаколах была агучана новая прычына — што сама арганізацыя не размешчана па адрасе, пазначаным у пасведчанні аб рэгістрацыі, прычым пытанне аб неЗнаходжанні арганізацыі па яе юрыдычным адрасе, пазначаным у пасведчанні аб рэгістрацыі, не ўваходзіць у кампетэнцыю акруговай камісіі — гэта кампетэнцыя Магілёўскага абласнога ўпралення юстыцыі.

21 верасня ў Светлагорску 8 чалавекам адмовілі ў праве працягваць назіранне на выбарчых участках. Усе гэтыя назіральнікі былі накіраваны на выбарчыя ўчасткі ад Светлагорскай раённай арганізацыі партыі «Справядлівы свет», кіраўніком якой з'яўляецца на той час кандыдат у дэпутаты С. Дайнека. Спачатку кіраўніцтва ўчастковых камісій пагадзілася з паўнамоцтвамі назіральнікаў, але затым заявіла, што ў іх дакументах нібыта няправільна напісаны адрас партыйнай арганізацыі. Па словах С. Дайнекі, у дакументах быў пададзены новы адрас, а кіраўнікі камісій мелі састарэлыя звесткі. Толькі пасля некалькіх скаргаў назіральнікі змаглі вярнуцца на выбарчыя ўчасткі.

На большасці ўчасткаў назіральнікі ўсё ж атрымалі магчымасць ажыццяўляць назіранне. Аднак сябры УКВ пры гэтым патрабавалі ад іх назіраць толькі з вызначаных месцаў, што часам зніШчала сам сэнс назірання ці стварала значныя перашкоды. Так, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі №52 Віцебскай Чкалаўскай выбарчай акругі Ніна Шубіна не дапусціла назіральнікаў у памяшканне для галасавання. Стол для іх паставілі ў суседнім пакоі, адкуль не было відаць, як выдаюцца бюлетэні, і ўвогуле ніякіх дзеянняў камісіі было немагчыма ўбачыць. У Брэсце на ўчастку для галасавання № 44 выбарчай акругі №1 назіральнікі таксама не мелі магчымасці назіраць за выбарчым працэсам — месца ім было выдзелена ў суседнім пакоі ад памяшкання, дзе галасавалі выбаршчыкі. У першы дзень ж датэрміновага галасавання мазырскаму назіральніку Уладзіміру Целяпуну, вылучанаму грамадзянамі на выбарчы ўчастак №18, пры спробе падысці да скрыні, каб паглядзець на якасць заклейвання шчыліны і праверыць наяўнасць подпісаў сябраў камісіі, намеснік старшыні камісіі Іван Навіцкі загадаў: «Назіральнік павінен сядзець на адведзеным месцы, а не разгульваць па памяшканні».

У многіх выпадках назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» не мелі эфектыўнай магчымасці бесперапынна назіраць за скрынямі і быць упэўненымі ў тым, што з імі не адбываецца ніякіх маніпуляцый. Назіральнікам дазвалялі прысутнічаць у пакоі для галасавання толькі ў афіцыйныя часы працы УВК, пры гэтым члены камісіі маглі знаходзіцца ў зачыненым пакоі для галасавання не толькі ў вызначаны законам час. Гэта тлумачылася як «працоўны момант УВК», «падрыхтоўка пакоя да галасавання» і г.д. У час перапынкаў і спынення працы не ўсюды апячатваліся памяшканні для галасавання.

На 3,1% ВУ ствараліся перашкоды назіральнікам кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» пры падліку імі колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні. У выніку непрадстаўленне звестак пра колькасць выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастках у першы дзень датэрміновага галасавання і ў наступныя дні, рабіла немагчымым альтэрнатыўны падлік выбаршчыкаў. Прыклад падобнай адмовы ў прадастаўленні інфармацыі зафіксаваны на ўчастку №30 Ленінскай акругі Бабруйска. На пытанне назіральніка ад прафсаюза РЭП Дзмітрыя Марголіна пра колькасць прагаласаваўшых датэрмінова сябры камісіі адказалі: «Гэта не ваша справа».

| | 18 верасня | 19 верасня | 20 верасня | 21 верасня | 22 верасня | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць выбарчых участкаў, з якіх паступілі звесткі | 151 | 158 | 156 | 158 | 165 | 157 |
| % выбарчых участкаў, дзе ствараліся перашкоды назіральнікам | 3% | 3,6% | 3,2% | 2,5% | 3% | 3,1% |

Па ўсёй краіне на выбарчых участках сябры УВК пагражалі выдаленнем назіральнікам або выдалялі іх па розных прычынах, а таксама аказвалі ціск у іншых формах. У Бабруйску пагрозы «выгнаць назіральніка» прагучалі на ўчастку №14 (САШ №26), дзе працавала актывістка кампаніі «Гавары праўду» Валянціна Глухава. Гэтая назіральніца заўважыла несупадзенні ў колькасці прагаласаваўшых, абвешчаных сябрамі УВК з уласным падлікам у шэсць чалавек. Аналагічная прычына — агучванне несупадзення прадстаўленых УВК дадзеных па колькасці прагаласаваўшых і вынікамі ўласнага падліку — стала прычынай вынясення папярэджання назіральніку — лідэару Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» прафесару Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Валерыю Беразіенку. Старшынёй камісіі сп. Якіменкам гэта было расцэнена як «стварэнне канфліктнай сітуацыі і напружанай атмасферы на ўчастку». «Дэстабілізацыяй працы ўчастковай камісіі» старшыня Гагарынскай УВК №36 Віцебскай Сельскай акругі №21 Пётр Прасолаў палічыў фатаграфаванне панарамы выбарчага ўчастка назіральнікам БСДП(Грамада) Леанідам Гаравым. Старшыня камісіі запатрабаваў ад назіральніка выдаліць з фотаапарата здымкі, а самога яго прыгразіўся выдаліць з участка. Гэта адбылося ў першы дзень датэрміновага галасавання, а ўжо на другі, 19 верасня, сп. Гаравы быў выдалены з участка за спробу наблізіцца да кабінак для галасавання. Паводле старшыні ўчастковай камісіі Пятра Прасолава, гэтымі дзеяннямі назіральнік «замінаў галасаванню».

20 верасня з участка №3 Гомельскай Цэнтральнай акругі №33 былі выдалены два назіральнікі — Андрэй Цянюта і Андрэй Жалезнічэнка, якія падлічвалі колькасць выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у датэрміновым галасаванні. Калі назіральнікі паспрабавалі зверыць свае дадзеныя з афіцыйнай інфармацыяй і падыйшлі да сяброў камісіі, тыя загадалі ім пакінуць участак. Загад аддала асабіста намеснік старшыні камісіі Святлана Кухарава. Хоць аб яўцы пытаўся толькі адзін назіральнік — Андрэй Жалезнічэнка, выдалены былі абодва.

21 верасня старшыня УВК участка №70 Магілёўскай Цэнтральнай акругі №85 Вера Цыркунова вынесла пісьмовае папярэджанне назіральніку ад АГП Юрыю Дарашэнку і аднachасова пазбавіла яго акрэдытацыі на ўчастку. Сваё рашэнне яна матывавала тым, што ён «замінае працы выбарчай камісіі». «Перашкодамі» старшыня камісіі палічыла вядзенне паралельнага падліку колькасці выбаршчыкаў і напісанне скаргаў на зафіксаваныя парушэнні выбарчага заканадаўства.

## 3. Выяўленыя парушэнні падчас датэрміновага галасавання

Падчас датэрміновага галасавання назіральнікамі была зафіксавана значная колькасць парушэнняў ВК. Агульная статыстыка найбольш тыповых прыводзіцца ніжэй:



Парушэнне афіцыйнага раскладу працы УВК мела месца ў сярэднім на 4,5% ВУ. У 5,4% выпадкаў назіральнікі мелі заўвагі да працэдуры апячатвання скрыні для бюлетэняў у першы дзень датэрміновага галасавання. Нетрывалае замацаванне скрыні пячаткай было адзначана на ВУ №412 Масюкоўшчынскай ВА №103 і ВУ №594 Усходняй ВА №107 г. Мінска, ВУ №44 Брэсцкай-Заходняй ВА №1 і інш.

Умяшальніцтва пабочных асоб у працу УВК адзначана у сярэднім на 20,9% ВУ. У асноўным такімі асобамі з'яўляліся прадстаўнікі мясцовых выканаўчых органаў улады, прадстаўнікі адміністрацый арганізацый і ўстаноў. Гэтыя выпадкі назіраліся на ВУ №14 Віцебскай Чыгуначнай ВА №19, ВУ №30 Глыбоцкай ВА №22 і інш. На многіх участках для галасавання былі заўважаны асобы ў цывільным, якія на пытанні назіральнікаў адмаўляліся прадставіцца. У Мінску падобныя выпадкі адбыліся на ВУ №572 Усходняй ВА №107, ВУ №№ 396, 397 Сухараўскай ВА №102, ВУ №243 Грушаўскай ВА №98 і інш. Таксама была зафіксавана прысутнасць кіраўнікоў установ унутранных спраў, якія правяралі дзейнасць міліцыянераў на ўчастках для галасавання.

Члены УВК і прадстаўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і навучальных установ паўсюдна ўзгаднялі спісы тых, хто прагаласаваў, што сведчыць пра імкненне кантраляваць сітуацыю. УВК рэгулярна прадстаўлялі кіраўніцтву адпаведных установ ці адміністрацый інфармацыю пра колькасць тых, хто ўзяў удзел у датэрміновым галасаванні: УВК №12 Магілёўскай Ленінскай ВА №84, УВК №31 Брэсцкай Усходняй ВА №3 і інш.

Невывешванне пратаколаў аб выніках штодзённага галасавання ў сярэднім мела месца на 1% выбарчых участкаў. Назіральнікі ўказвалі членам УВК на неабходнасць паведамлення штодзённых вынікаў датэрміновага галасавання.

## 3.1. Разыходжанні ў дадзеных па колькасці прагаласаваўшых датэрмінова

Па падліках назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», у першыя дні датэрміновага галасавання колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі, нязначна адрозніваласяад той, якую называлі УВК. Аднак у апошні дзень датэрміновага галасавання гэтая розніца склала ўжо 8,3%.

Таксама ў канцы датэрміновага галасавання павялічылася і колькасць тых ВУ, на якіх фіксавалася адрозненне афіцыйных звестак і звестак незалежнага назірання. Калі ў першы дзень датэрміновага галасавання такіх ВУ было 30,7% , то ў апошні — 39,5%.

**Колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова[14]**

| Дзень | Колькасць ВУ, дзе былі даступныя звесткі пра колькасць прагаласаваўшых | Колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова | | Розніца | % ВУ, дзе фіксавалася адрозненне паміж афіцыйнымі звесткамі і звесткамі назіральнікаў па колькасці прагаласаваўшых датэрмінова за дзень |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Звесткі УВК | Звесткі назіральнікаў | | |
| 18 верасня | 137 | 6 357 | 6 074 | -283 (2,3%) | 30,7 |
| 19 верасня | 143 | 10 773 | 10 169 | -604 (2,9%) | 31,5 |
| 20 верасня | 142 | 13 968 | 12 889 | -1 079 (4%) | 28,47 |
| 21 верасня | 143 | 18 181 | 16 292 | -1 889 (5,5%) | 40,36 |
| 22 верасня | 154 | 24 989 | 21 158 | -3 831 (8,3%) | 39,5 |
| Усяго (у сярэднім) | | 74 608 | 66 926 | -7 682 (5,4%) | (34,2) |

У асобных выпадках назіральнікамі фіксавалася значнае разыходжанне ў лічбах прагаласаваўшых на працягу дня з тымі звесткамі, якія абвяшчаліся ў канцы УВК.

Напрыклад, у Гомельскай Савецкай ВА №34 на ўчастках №№ 1, 2, 18, 23 амаль увесь час назірання фіксавалася разыходжанне лічбаў у 2-3 разы і інш. Так, 20 верасня на выбарчым участку №2, па дадзеных назіральнікаў, прагаласавалі 42 выбаршчыкі, а ўчастковая камісія паведаміла

14 Звесткі з 719 справаздач (з участкаў, дзе назіральнікі маглі атрымаць ад УВК інфармацыю па колькасці прагаласаваўшых), апрацаваных за ўвесь перыяд датэрміновага галасавання

пра 123 прагаласаваўшых. Яшчэ большая розніца была зафіксавана на ўчастку 33, дзе выбары адбыліся датэрмінова. Тут было зарэгістравана 800 выбаршчыкаў, датэрмінова прагаласавала 436 чалавек, пры гэтым назіральнікі зафіксавалі ўсяго толькі 101 выбаршчыкі. Вялікая розніца паміж афіцыйнымі дадзенымі ўчастковых камісій і падлікам назіральнікаў падчас усяго часу датэрміновага галасавання заўважана і на іншых участках 34 акругі: так, на участку №1 назіральнікі налічылі 202 чалавекі, а афіцыйныя дадзеныя — 426 прагаласаваўшых, на ўчастку №2 — 192 і 421 чалавекі адпаведна, на участку №18 — 222 і 524 выбаршчыкі.

У Бабруйску на выбарчым участку №12 (размяшчаўся ў ЖЭУ №7, Ленінскі раён) незалежныя назіральнікі ад самага пачатку працы адзначалі несупадзенне ў сваіх падліках па колькасці прагаласаваўшых з дадзенымі камісіі. У першыя дні датэрміновага галасавання яны фіксавалі несупадзенні ад 20 да 33 чалавек, але з кожным днём колькасць «фантомаў» на паперы прыбаўлялася. Па дадзеных камісіі на гэтым участку датэрмінова прагаласавала 358 чалавек, а назіральнікі налічылі 150.

Назіральнікі, зарэгістраваныя на ўчастку для галасавання №45 Магілёўскай Прамысловай выбарчай акругі №87, у першы дзень галасавання налічылі толькі 6 выбаршчыкаў, аднак у пратаколе было напісана 16. Тое самае адбылося і ў другі дзень галасавання. Па падліках назіральнікаў за дзень прыйшло прагаласаваць усяго 14 чалавек, у пратаколе ж была пазначана лічба 98.

На Калінінскім выбарчым участку №55 Крычаўскай выбарчай акругі №83 у Хоцімску назіральнік Аляксандр Балобін налічыў за першы дзень датэрміновага галасавання 27 чалавек, але ў выніковым пратаколе было ўказана пра 57 выбаршчыкаў. На Ленінскім выбарчым участку №54 гэтай жа акругі прысутнічаў назіральнік Пётр Басейка. Першы выбаршчык 18 верасня прыйшоў недзе праз гадзіну пасля адкрыцця ўчастку, потым назіральнік адсутнічаў гадзіну, а затым зафіксаваў з'яўленне яшчэ 6 выбаршчыкаў. Аднак у выніковым пратаколе была ўказана 107 прагаласаваўшых. Назіральнік выказаў недавер таму, што манавіта за гадзіну ягонай адсутнасці 100 жыхароў Хоцімска прагаласавалі датэрмінова.

Зафіксавана яшчэ адна тэндэнцыя: колькасць прагаласаваўшых датэрмінова на ВУ, ахопленых незалежным назіраннем, значна адрознівалася ад ВУ, дзе незалежных назіральнікаў не было. На салігорскім участку №77 у суботу 22 верасня прагаласавала 86 чалавек, а ў суседняй школе на ўчастку №78 у гэты дзень нібыта прыйшло прагласаваць 274 чалавекі. Участкі абсалютна ідэнтычныя, але на апошнім незалежных назіральнікаў не было. Яўка выбаршчыкаў на двух суседніх участках сталічнай Свіслацкай выбарчай акругі №94 адрознівалася больш чым у пяць разоў. У першы дзень датэрміновага галасавання на ўчастку №121 прагаласавала 68 чалавек, на суседнім 122-м участку — 12.

Рэзкае скарачэнне колькасці выбаршчыкаў адбылося на ўчастку №613 Каліноўскай выбарчай акругі №108 у апошні дзень датэрмінавага галасавання, калі там з'явіўся незалежны назіральнік. Так, у пратаколе камісіі ад 21 верасня было пазначана, што на ўчастак прыйшлі 270 выбаршчыкаў, а 22 верасня — толькі 25 чалавек. Такім чынам, яўка за адзін дзень знізілася ў 10 разоў, калі назіральнік прысутнічаў на ўчастку, і яго падлікі супалі з лічбамі камісіі ў гэты дзень.

Падобныя рызыходжанні сведчаць пра імкненне камісій завысіць колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні да дня выбараў.

# ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

Згодна з Указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 2012 года «Аб прызначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання», выбары былі прызначаны і адбыліся 23 верасня. У гэты дзень выбаршчыкі мелі магчымасць галасаваць як на ўчастках для галасавання, так і па месцы свайго знаходжання.

## 1. Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў

Выбаршчыкам, якія па стане здароўя або па іншых уважлівых прычынах не могуць прыйсці ў дзень выбараў у памяшканне для галасавання, УВК абавязана забяспечыць магчымасць галасаваць па месцы знаходжання. Афіцыйнага пацвярджэння немагчымасці прыйсці на выбарчы ўчастак не патрабуецца. Аднак паводле артыкула 54 главы 13 ВК выбаршчык сам павінен звярнуцца ў камісію з адпаведнай просьбай (у вуснай ці пісьмовай форме). УВК павінна стварыць спецыяльны спіс выбаршчыкаў, якія выказалі жаданне галасаваць па месцы свайго знаходжання, выпісваючы ў яго звесткі з агульнага. Для арганізацыі такога галасавання ўчастковыя камісіі павінны мець не больш за тры пераносныя скрыні, якія павінны суправаджацца не меш як двума сябрамі камісіі, што загадзя атрымліваюць такую колькасць бюлетэняў, якая адпавядае колькасці выбаршчыкаў, унесеных у спецыяльны спіс.

Назіральнікі фіксавалі выкананне вызначаных заканадаўствам працэдур падчас правядзення галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў. На пытанне, ці вёўся спіс выбаршчыкаў, якія заявілі пра жаданне галасаваць па месцы свайго знаходжання, 90,6% назіральнікаў адказалі, што такі спіс вёўся. На 79% ВУ старшыні камісій прадстаўлялі назіральнікам інфармацыю пра колькасць тых, хто пажадаў прагаласаваць па месцы свайго знаходжання. На 70% участкаў, як сведчаць назіральнікі, членам УВК, якія ажыццяўлялі арганізацыю галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў, выдавалася колькасць бюлетэняў, што адпавядала колькасці выбаршчыкаў у спісе. На 30% участкаў гэтая норма парушалася. Унясенне выбаршчыкаў у спіс для галасавання па месцы знаходжання пасля 18.00, што з'яўляецца парушэннем, мела месца на 3,6% участкаў. На большасці ўчасткаў (79%) назіральнікам дазволілі паехаць разам з членамі камісіі для прысутнасці пры галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў.

Засталася вельмі распаўсюджаная практыка ўнясення ў спіс для галасавання па месцы знаходжання тых выбаршчыкаў, якія папярэдне не выказвалі такога жадання. Назіральнікі зафіксавалі вялікую колькасць сітуацый, калі выбаршчыкі адмаўляліся галасаваць, калі сябры выбарчых камісій прыходзілі да іх дадому, выказвалі здзіўленне нечаканаму іх з'яўленню або заяўлялі, што ўжо прагаласавалі на ўчастку ці збіраюцца самастойна наведаць выбарчы ўчастак. Так, на ВУ №9 Барысаўскай гарадской ВА № 62, паводле звестак камісіі, заяўкі на ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання падалі 140 грамадзян. Абыход 60 месцаў пражывання выбаршчыкаў, якіх наведалі члены ўчастковай камісіі ў першай палове дня, выявіў, што спіс гэтых выбаршчыкаў быў складзены з парушэннямі. Так, 3 грамадзян аказаліся памерлымі (адна з іх памерла 2 гады таму), 2 грамадзян, па словах сваякоў, знаходзіліся ў непрытомным стане і не маглі звярнуцца да камісіі, 5 грамадзян заявілі, што камісію дамоў не выклікалі, у 11 месцах жыхарства выбаршчыкаў на момант абыходу з 10.00 да 13.30 нікога не было дома, 16 чалавек ужо прагаласавалі самастойна на ўчастку або заявілі, што будуць галасаваць менавіта на ўчастку, 3 былі ў ад'ездзе па розных прычынах (адпачынак, лячэнне і інш.).

Выпадкі, калі выбаршчыкі заяўлялі членам УВК, што не выказвалі жадання галасаваць па месцы свайго знаходжання, адбыліся на 20% участкаў. Зафіксаваны таксама выпадкі, калі грамадзяне, да якіх прыехалі члены камісіі, наогул адмаўляліся галасаваць (ВУ №126 Свіслацкай ВА №94, ВУ №571 Усходняй ВА г. Мінска, ВУ №1 Аршанска-Дняпроўскай ВА №27 і інш.).

Яўген Анішчанка, які з'яўляўся назіральнікам на ўчастку №8 па Аршанскай гарадской акрузе №26 з сябрамі камісіі аб'язджаў галасаваўшых на даму. Як высветлілася, з дзесяці чалавек, да якіх заехалі сябры камісіі са скрыняй, толькі адзін пацвердзіў, што звяртаўся ў камісію з падобнай просьбай. А адзін з выбаршчыкаў наогул адмовіўся галасаваць і выгнаў няпрошаных сяброў камісіі з кватэры. Падобная сітуацыя складалася і на іншых выбарчых участках Оршы. Ускосна гэта пацвярджае той факт, што на суседнім участку №9 назіральніку Уладзіміру Анішчанку наогул было адмоўлена ў праве назіраць за галасаваннем па месцы знаходжання выбаршчыкаў.

Назіральнік ад Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Томас Якавіцкі зафіксаваў выпадак, калі выбаршчыкі прыйшлі галасаваць і высветлілася, што члены ўчастковай выбарчай камісіі ўжо пайшлі да іх дадому, бо, нібыта, яны падалі заяўку на тое, што будуць галасаваць дома. Выбаршчыкі былі моцна абураныя, бо нікому яны не тэлефанавалі і нічога не прасілі, і самі ў стане прыйсці і прагаласаваць. Томас Якавіцкі адзначыў, што на ягоным участку, па дадзеных камісіі, са 1800 выбаршчыкаў 360 нібыта вырашылі прагаласаваць на даму.

На многіх выбарчых участках камісіі называлі неверагодна вялікія лічбы па колькасці выбаршчыкаў, якія, па іх словах, выказалі жаданне галасаваць па месцы свайго знаходжання. Гэта давала падставу меркаваць, што дадзены від галасавання выкарыстоўваўся для маніпуляцыі з галасамі выбаршчыкаў і павышэння яўкі.

Незалежны назіральнік Галіна Ярашэвіч на выбарчым участку №24 (Палац дзіцячай творчасці, вул. Савецкая, д. 136) Баранавіцкай-Усходняй выбарчай акругі №6 зафіксавала, што нечакана спіс грамадзян, жадаючых прагаласаваць па месцы пражывання, павялічыўся ў дзень галасавання 23 верасня з 47 да 362 чалавек.

Па дадзеных УВК №51 Аршанскай Дняпроўскай акругі №27, на ўчастку ў дзень выбараў прагаласавалі 150 чалавек на ўчастку і 448 чалавек на даму; на ўчастку №12 у вёсцы Панізоўе Аршанскага раёна 344 чалавекі на ўчастку і 236 на даму. На ўчастку №26 Аршанская гарадской акругі №26 у спісах для галасавання на даму лічылася 157 чалавек, але пры адкрыцці адпаведнай скрыні ў ёй выявіліся 283 бюлетэні.

У Бабруйску на ўчастку №44 па месцы жыхарства нібыта прагаласавала 397 чалавек, на ўчастку №38— 407 выбаршчыкаў, на ўчастку №11 — 121 чалавек, на ўчастку №25 — 314. Усе незалежныя назіральнікі сцвярджалі, што наведаць па некалькі соцень кватэр за лічаныя гадзіны проста нерэальна. Па іх падліках, максімальная рэальная колькасць — 21 кватэра ў гадзіну. Менавіта такія вынікі былі і ў тых выязных камісій, разам з якімі ім дазволілі прысутнічаць.

## 2. Галасаванне на выбарчых участках

Арганізацыя і правядзенне галасавання на ўчастку рэгламентаваны артыкуламі 51, 52 гл. 13 ВК. Згодна з палажэннямі ВК, галасаванне ў дзень выбараў адбываецца на выбарчых участках з 8 да 20 гадзін. На выбарчых участках у закрытых установах яно можа быць скончана раней, калі свой голас аддалі ўсе выбаршчыкі, унесеныя ў спіс. Галасаванне адбываецца ў памяшканнях з кабінамі ці пакоямі для таемнага галасавання. Скрыні для галасавання правяраюцца, пламбуюцца ці апячатваюцца да пачатку галасавання ў прысутнасці не менш як 2/3 складу камісіі. Бюлетэнь выдаецца выбаршчыку пад подпіс пасля прад'яўлення адпаведнага дакумента. Выбаршчык галасуе асабіста.

Вызначана, што скрыні для галасавання павінны знаходзіцца ў полі зроку членаў УВК, назіральнікаў і прадстаўнікоў СМІ. На пераважнай большасці ўчасткаў (93,6%), дзе прысутнічалі незалежныя назіральнікі, гэтая важная норма вытрымлівалася. Аднак адзначаны і яе парушэнні (6,4% участкаў): ВУ №47 Аўтазаводскай ВА №92 і ВУ №211 Кастрычніцкай ВА №97 г. Мінска, ВУ №6 Івацэвіцкай ВА №11, ВУ №9 Смаргонскай ВА №59 і інш., дзе урны размяшчаліся вельмі далёка ад назіральнікаў або былі толькі часткова даступныя для нагляду. Выдачу некалькіх бюлетэняў адной асобе заўважыла 5,3% назіральнікаў кампаніі. Агітацыю на выбарчым участку адзначылі 2,1% з іх. Зафіксаваны выпадкі выдачы бюлетэняў для галасавання без прад'яўлення адпаведных дакументаў, якія пацвярджаюць асобу выбаршчыка. Галасаванне без пашпарту адбылося на выбарчым участку №3, які ўваходзіў у склад Магілёўскай Прамысловай выбарчай акругі №86. Камендантка інтэрната №17, жыхары якога належалі да дадзенага ўчастка, абыходзіла пакоі і патрабавала, каб усе прыйшлі на ўчастак і прагаласавалі — нават калі не маюць пры сабе дакументаў. Жыхарка інтэрната Ларыса Шусціна распавяла, што папярэдзіла камендантку, што ў яе няма пашпарта, аднак тая адказала, што гэта не праблема, і папрасіла прыйсці прагаласаваць. Л. Шусціна так і зрабіла: пры выдачы бюлетэня пра дакументы ў яе не пыталіся.

Паводле артыкула 21 ВК ні выбаршчыкі, ні назіральнікі не маюць права знаёміцца з поўнымі спісамі выбаршчыкаў на ўчастку. Гэтая норма тлумачыцца неабходнасцю захавання таямніцы асабістага жыцця грамадзяніна. Выбаршчык можа праверыць толькі тое, ці ўключаны ён сам у спіс і ці звесткі пра яго правільныя. Пры гэтым была распаўсюджана практыка з боку членаў УВК паведамляць грамадзяніну звесткі пра членаў яго сям'і.

Спісы выбаршчыкаў рэальна з'яўляліся закрытым дакументам, які не маглі кантраляваць назіральнікі. Яны рыхтаваліся мясцовымі органамі ўлады непасрэдна на кожны выбарчы ўчастак. Іх закрытасць і шматлікія факты неадпаведнасці рэальнай колькасці выбаршчыкаў сведчылі пра тое, што спісы не перапраўляюцца ад адных выбараў да наступных, не ўлічваюць зменаў, накшталт смерці выбаршчыкаў ці таго, што значная частка беларусаў па эканамічных прычынах з'ехала з краіны і не можа прымаць удзел у выбарах і інш. Нярэдка ў спісы забывалі ўносіць жыхароў новых дамоў.

Назіральнікі на ўчастку №11 Брэсцкай-Усходняй акругі №3 зафіксавалі выпадак, калі ў спіс для галасавання была ўключана жанчына, якая памерла восем гадоў таму. Мужчына сталага веку быў вельмі абураны тым, што жонка, якую ён пахаваў, дагэтуль лічыцца выбаршчыкам на гэтай акрузе.

Участковая камісія №1 па Аршанскай гарадской акрузе №26 у запрашэнні на выбары, які атрымала жыхарка Оршы Ганна Чумаева, якая пражывае па вуліцы 1-я Чырвоная, унесла чатырох чалавек. Пры гэтым двое з іх ужо памерлі і не зарэгістраваны па дадзеным адрасе, яшчэ адзін ужо некалькі гадоў меў іншае прозвішча. У суседнюю кватэру члены камісіі прынеслі запрашэнне прыняць удзел у выбарах нябожчыку Міхаілу Астроўскаму. Усе гэтыя «мёртвыя душы» былі ўнесены ў адпаведны спіс выбаршчыкаў на дадзеным участку.

У спісе выбаршчыкаў знаходзілася і прозвішча зняволенага старшыні Праваабарончага цэнтра «Вясна» Алеся Бяляцкага на ўчастку №607 (Каліноўская выбарчая акруга №108). Разам з тым, згодна з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, «у выбарах, рэферэндуме не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. У галасаванні не прымаюць удзелу асобы, у дачыненні да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання — утрыманне пад вартай».

У Віцебску не былі ўнесены ў спісы выбаршчыкаў каля тысячы жыхароў двух шматпавярховых кватэрных дамоў па вуліцы Броўкі, №37 і №39. Сакратар камісіі 44-га ўчастка па Віцебскай Чкалаўскай выбарчай акрузе №18 сказаў, што гэтых людзей, калі яны прыйдуць галасаваць, будуць заносіць у дадатковы спіс. Камісія выбарчага ўчастку №45 Кастрычніцкай выбарчай акругі Віцебска наадварот «знайшла» два дамы выбаршчыкаў: у межы участка былі ўключаны дамы №22 і №24 па вуліцы Чапаева, якія знеслі паўтары гады таму. У выніку скаргаў на нядбайнае складанне спісаў выбаршчыкаў ЦВК зрабіла заўвагі ўчастковым камісіям, а Кастрычніцкая і Першамайская раённыя адміністрацыі змянілі межы выбарчых участкаў, далучыўшы два няўлічаныя шматпавярховыя дамы да ўчастку №44 у Віцебскай Чкалаўскай акрузе, і выкраслілі два неіснуючыя дамы з межаў участка №45 у Віцебскай Кастрычніцкай акрузе.

Пры адсутнасці адзінага рэестра выбаршчыкаў і адмовах УВК даваць канкрэтную інфармацыю пра агульную колькасць выбаршчыкаў на ўчастку ствараюцца перадумовы для маніпуляцый, асабліва калі існуе пагроза зрыву яўкі. Маніпуляцыі пры гэтым можна ажыццяўляць у розныя бакі: альбо памяншаць колькасць выбаршчыкаў, для таго каб выбары адбыліся, альбо павялічваць, калі трэба дапамагчы вызначанаму кандыдату набраць патрэбную колькасць галасоў.

Назіральнікі адзначылі непаслядоўнасць пазіцыі членаў УВК і недакладнасці ў іх працы са спісамі выбаршчыкаў на ВУ №№ 572, 586, 594 Усходняй ВА №107 г. Мінска, ВУ №52 Віцебскай Чкалаўскай ВА №18, ВУ №5 Гродзенскай Цэнтральнай ВА №50, ВУ №30 Гродзенскай Занёманскай ВА №49, ВУ №32 Гродзенскай Паўночнай ВА №51, ВУ №70 Пінскай сельскай ВА №15, ВУ №8 Маладзечанскай гарадской ВА №72 і інш. На гэтых выбарчых участках назіральнікам адмаўлялі без тлумачэнняў, паведамлялі «папярэднія дадзеныя» колькасці выбаршчыкаў або адказвалі, што «колькасць увесь час мяняецца». Абгрунтаванасць змен колькасці выбаршчыкаў назіральнікам праверыць не ўдалося.

Адказнасць за арганізацыю галасавання на ўчастках нясуць УВК. Назіральнікі заўважылі факты актыўнага ўмяшальніцтва ў іх працу пабочных асоб. На ВУ №571 Усходняй ВА №107 г. Мінска аддаваў распараджэнні не старшыня, а адзін з назіральнікаў і разам з ім некалькі чалавек у цывільным, якія выклікалі старшыню ў асобны пакой. На ВУ №39 Віцебскай Чкалаўскай ВА №18 адзначана прысутнасць прадстаўнікоў адміністрацыі Першамайскага раёна і іншых пабочных асоб.

У Магілёве на месцы старшыні камісіі на выбарчым участку №54 Магілёўскай Цэнтральнай выбарчай акругі №85 цэлы дзень знаходзіўся Аляксандр Шэпелеў, дырэктар завода «Зеніт». На пытанне назіральнікаў, што ён робіць на ўчастку, адказаў, што гэта ягоная камісія, ягоныя людзі тут працуюць, а ён назірае за працэсам галасавання.

26,8% назіральнікаў паведамілі, што на працу членаў УВК паступалі скаргі адразу ад некалькіх асоб. Былі выпадкі ціску на назіральнікаў і незаконнага выдалення іх з выбарчых участкаў.

У Хоцімску Пятра Басейку, які меў акрэдытацыю назіральніка, не дапусцілі да назірання на Ленінскі участак №54 згодна з адзінагалосным рашэннем камісіі «ў сувязі з перашкодамі працы камісіі».

Назіральніка ад партыі «Справядлівы свет» Алега Кастусёва выдалілі з участка для галасавання №14 Жлобінскай выбарчай акругі, абвінавачыўшы ва ўмяшанні ў працу. Раніцай, калі ўчастак пачаў працу і прыйшлі першыя выбаршчыкі, назіральнік зрабіў заўвагу старшыні камісіі Ганне Жырко, што скрыні з бюлетэнямі для датэрміновага галасавання павінны знаходзіцца не ў асобным памяшканні, а на бачным месцы. Скрыні вынеслі, але праз гадзіну старшыня камісіі зачытала Кастусёву рашэнне камісіі аб выдаленні яго з участка для галасавання за «неаднаразовыя парушэнні, у тым ліку за ўмяшанне ў працу сяброў камісіі і іншых назіральнікаў».

У Гомелі каля 18.20 з участка №1 Гомельскай-Савецкай акругі №34 выдалілі назіральніка Анатоля Паплаўнага. Камісіі не спадабалася, што ён хацеў сфатаграфаваць скрыні для галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў. Назіральнік адзначыў, што ў гэты час усе скрыні для галасавання на даму павінны быць на ўчастку. Іх было ўсяго тры, дзве з якіх былі на месцы, а трэцяя адсутнічала. Гэта і спрабаваў зафіксаваць А. Паплаўны.

З участка №449 Кальварыйскай акругі №104 Мінска ў канцы дня выбараў былі выдалены пяць назіральнікаў — два ад кампаніі «Гавары праўду» Антон Жылко і Станіслаў Рамановіч і яшчэ тры незалежных назіральнікі. Каардынатар ГП па гэтай акрузе Юрый Салодкі адзначыў, што ўвесь дзень назіральнікі працавалі дастаткова актыўна, заўважалі памылкі ў працы камісіі, калі, напрыклад, бюлетэнь спрабавалі выдаць чалавеку без дакументаў, пры выязным галасаванні яны таксама паказвалі на недахопы працы камісіі. Паводле яго слоў, каля 17 гадзін на ўчастак прыехалі двое мужчын гадоў 30-35, «вельмі падобных на супрацоўнікаў міліцыі ў цывільным». Маладыя людзі паказалі нейкія пасведчанні сябрам камісіі, а астатнім прысутным прадставіліся назіральнікамі ад Белай Русі. Пасля таго як Антон Жылко спытаў у камісіі, ці можна яму зарадзіць ноўтбук, «прадстаўнік Белай Русі» напісаў скаргу на ўсіх пецярых незалежных назіральнікаў, заявіўшы, што яны перашкаджаюць яму праводзіць назіранне. Камісія прыняла рашэнне выдаліць з участка ўсіх незалежных назіральнікаў.

Упершыню на парламенцкіх выбарах-2012 беларускія ўлады выкарысталі «выбарчыя каруселі» — арганізаваныя групы людзей пераязджалі ад аднаго ўчастка да другога і, не будучы выбаршчыкамі ўчастка, атрымлівалі бюлетэні. Назіральнікі зафіксавалі некалькі фактаў, калі выбаршчыкаў арганізавана прывозілі на аўтобусах прагаласаваць. На ўчастках №373 і №374 101-й Фрунзенскай акругі Мінска назіральнікі ад Партыі БНФ Сяргей Марцалеў і ад Руху «За свабоду» Арына Лісецкая зафіксавалі факты «выбарчых каруселяў». Каля 13 гадзінаў Арына Лісецкая пайшла з участка, каб гэта фатаграфаваць, пакінуўшы свае рэчы, і не вярнулася. Сяргей Марцалеў праз некаторы час пайшоў яе шукаць, але таксама знік. Ужо пасля завяршэння галасавання высветлілася, што абодва назіральнікі былі затрыманы і некалькі гадзін утрымліваліся ў РУУС Фрунзенскага раёна сталіцы.

## 3. Падлік галасоў

Згодна з артыкулам 13 ВК падлік галасоў павінен адбывацца галосна, на ВУ маюць права прысутнічаць акрэдытаваныя назіральнікі, прадстаўнікі СМІ, кандыдаты ў дэпутаты па дадзенай ВА і іх давераныя асобы. Перад ускрыццём скрынь для галасавання падлічваецца і агучваецца колькасць нявыкарыстаных блюлетэняў.

Ускрыццё скрынь і падлік галасоў ажыццяўлецца паасобна: спачатку падлічваюцца бюлетэні, якія знаходзіліся ў скрыні для датэрміновага галасавання, потым тыя, што знаходзіліся ў пераносных скрынях для галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў. У апошнюю чаргу — тыя, якія знаходзіліся ў скрынях у памяшканнях для галасавання. Вынікі кожнага падліку галасоў абвяшчаюцца старшынёй камісіі.

Пры выбарах дэпутатаў ППНС падлік галасоў на ўчастку для галасавання адбываецца асобна па кожнаму кандыдату ў дэпутаты.

На падставе бюлетэняў, якія знаходзяцца ў скрынях для галасавання, камісія спачатку паасобна, а потым суміруючы звесткі, устанаўлівае: агульную колькасць выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у галасаванні, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым

галасаванні; колькасць выбаршчыкаў, якія галасавалі па месцы свайго знаходжання; колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў на ўчастку для галасавання; колькасць галасоў, аддадзеных за кожнага кандыдата ў дэпутаты, і колькасць галасоў, аддадзеных супраць усіх кандыдатаў у дэпутаты (па безальтэрнатыўнай акрузе — колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдата); колькасць бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі.

Пасля завяршэння падліку галасоў УВК праводзіць пасяджэнне, на якім устанаўліваюцца і заносяцца ў пратакол вынікі падліку галасоў, разглядаюцца скаргі і звароты, асабістыя меркаванні членаў камісій (пры наяўнасці). У пратаколе пасяджэння УВК таксама павінны быць адлюстраваны вынікі паасобнага падліку галасоў (складаецца толькі ў адным асобніку і перадаецца толькі ў органы, якія стварылі камісіі, — райвыканкамы ці раённыя адміністрацыі).

У пратаколе аб выніках галасавання ўказваецца толькі агульны вынік галасавання. Копія пратакола аб выніках галасавання пасля яго падпісання вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення. Выдача назіральніку завеñанай копіі пратакола аб выніках галасавання на ўчастку заканадаўствам не прадугледжана.

Выбарчае заканадаўства падрабязна апісвае паслядоўнасць працэдур падліку галасоў, неабходных для гарантый супраць фальксіфікацый. Аднак на практыцы выкананне гэтых працэдур не забяспечвалася ці назіральнікі былі пазбаўлены магчымасці бачыць іх.

Магчымасць прысутнічаць у памяшканнях для галасавання падчас падліку галасоў прадстаўлялася. Аднак пры гэтым большасць з назіральнікаў (73,5%) адзначылі, што падлік адбываўся непразрыста — усімі членамі УВК адначасова, калі кожны лічыў толькі свой стос выбарчых бюлетэняў, перадаючы атрыманыя лічбы старшыні камісіі. Пры такой працэдуры ні назіральнікі, ні кожны асобны член УВК не маглі ведаць агульны вынік падліку галасоў на ўчастку. У большасці выпадкаў старшыні УВК не кіраваліся ў сваёй дзейнасці палажэннямі спецыяльнага дапаможніка Цэнтральнай камісіі, якія рэкамендуюць забяспечыць назіральнікам рэальную магчымасць назіраць за працэдурай падліку галасоў[15]15. Акрамя гэтага, назіральнікам не дазвалялі знаходзіцца на той адлегласці ад сталоў, з якой бачна працэдуру падліку, 79,5% з іх указалі, што не мелі зручнага месца для назірання за падлікам галасоў выбаршчыкаў.

Камісія ўчастка №20 Гомельскай Цэнтральнай акругі №33 вызначыла для назіральнікаў месца, дзе яны мусяць знаходзіцца падчас падліку галасоў — на калідоры. Старшыня камісіі патлумачыў, што памяшканне ўчастка невялікае, месца мала, а назіральнікі могуць перашкаджаць камісіі, і вырашыў, што яны будуць назіраць за падлікам галасоў праз адчыненыя дзверы. Назіральнікам з участка №4 Гомельскай Цэнтральнай акругі №33 сачыць за падлікам галасоў прыйшлося за 11 метраў ад стала, бліжэй падысці забараняла камісія.

У Мазыры падчас падліку галасоў на выбарчым участку №18 назіральнікаў папрасілі адысці ад стала з бюлетэнямі на 5 метраў, у сувязі з чым назіральнік Юрый Целяпун зрабіў заўвагу Івану Навіцкаму — намесніку старшыні ўчастковай камісіі. Навіцкі на гэта ніяк не адрэагаваў, пасля чаго Юрый сфатаграфаваў на тэлефон спіны сяброў камісіі, за якімі рэальна не было відаць падліку. Гэтае дзеянне назіральніка не засталося без увагі. Фота папрасілі сцерці, а Юрыя рашэннем камісіі выдалілі з участка.

Назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» ў пісьмовай форме звярталіся да старшынь УВК з просьбай забяспечыць празрыстасць працэдуры падліку галасоў, у прыватнасці, каб УВК даручалі ажыццяўляць падлік галасоў члену камісіі, які б пры гэтым агучваў вынік волевыяўлення выбаршчыка, адлюстраваны ў кожным бюлетэні, і дэманстраваў гэты бюлетэнь усім членам УВК і прысутным назіральнікам.

На гэтыя звароты былі дадзены фактычна аднолькавыя адказы старшынь УВК: падлік галасоў будзе ажыццяўляцца членамі УВК згодна з артыкулам 55 ВК, дапаможнікам для працы УВК, распрацаваным Цэнтральнай камісіяй. Указвалася, што працэдуры падліку галасоў і ўстанаўлення вынікаў галасавання былі адпрацаваныя членамі камісій пры правядзенні трэнінгаў. Пры гэтым не ўказвалася, якая канкрэтна працэдура адпрацоўвалася на гэтых трэнінгах.

Напрыклад, у Гродна ў дні датэрміновага і асноўнага галасавання каля дваццаці праваабаронцаў з «Вясны» і БХК, якія працавалі незалежнымі назіральнікамі, падалі ва ўчастковыя камісіі заявы з прапановай адкрытага і празрыстага падліку галасоў. Аналагічныя заявы падавалі і прадстаўнікі кампаніі «За справядлівыя выбары». Але паўсюдна былі атрыманыя адмоўныя адказы, прычым рашэнні прымалі старшыні камісій фактычна аднаасобна. На ўчастку №19 Гро-

---

15 Пособие для членов участковых избирательных комиссий [Электронный ресурс].
Рэжым доступу: http://www.rec.gov.by/Elections-PP5

дзенскай Цэнтральнай акругі старшыня камісіі спачатку вусна падтрымала прапанову назіральнікаў па падліку галасоў, але ў апошні момант перадумала — у 19.55 яны атрымалі пісьмовыя адмовы. У адказе, атрыманым назіральніцай Святланай Рудкоўскай на ўчастку №43 Гродзенскай сельскай акругі, старшыня УВК Людміла Мячына сярод іншага напісала, што «працэдура падліку галасоў і ўстанаўленне вынікаў галасавання была адпрацаваная з членамі камісіі пры правядзенні трэнінгу».

Паказальным з'яўляецца адказ старшыні УВК №287 Паўднёва Заходняй ВА №99 г. Мінска М. Г. Сідорыка назіральніку БХК Васілю Санковічу. На просьбу назіральніка забяспечыць празрыстасць працэдур падліку галасоў ён адказаў: «Разгледзеўшы Ваш зварот, паведамляю, што ў сувязі з тым, што Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь працэдура падліку галасоў не вызначана, участковая выбарчая камісія №287 Паўднёва-Заходняй выбарчай акругі № 99 будзе праводзіць працэдуру падліку галасоў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ў форме, зручнай для членаў камісіі».

У некаторых выпадках адмовы ў адкрытасці падліку галасоў утрымлівалі абсурдныя матывацыі, напрыклад, што магчымасць бачыць адзнаку выбаршчыка ў бюлетэні дазволіць назіральнікам «атрымліваць інфармацыю, атрыманне якой Выбарчым кодэксам не прадугледжана» (старшыня ўчастковай выбарчай камісіі №18 па Салігорскай гарадской выбарчай акрузе №68 Леанід Завадэўкін). Пры гэтым, як высветлілася, заявы ўчастковымі камісіямі не разглядаліся калегіяльна. Адказы пісаліся асабіста старшынямі камісій, хоць гэта мусілі быць выпіскі з пратаколаў паседжанняў адпаведных выбаркамаў.

40,4% назіральнікаў паведамілі, што УВК не агучвалі вынікі паасобнага падліку галасоў, а 8,9% заявілі пра адсутнасць паасобнага падліку галасоў наогул. Гэтыя факты сведчаць, што практычна палова УВК, на якіх ажыццяўлялася назіранне за працэдурамі падліку, праводзілі іх з парушэннямі патрабаванняў артыкула 55 ВК.

Пасля падліку галасоў многія назіральнікі адзначалі, што колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі па месцы знаходжання выбаршчыкаў, складала значную колькасць ад зарэгістраваных на ўчастку выбаршчыкаў — да 10% і болей.

Пасля азнаямлення з выніковымі пратаколамі УВК назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» выявілі несупадзенні звестак аб колькасці прагаласаваўшых выбаршчыкаў у копіях пратаколаў аб выніках галасавання, вывешаных для азнаямлення ў памяшканнях УВК, з тымі звесткамі яўкі выбаршчыкаў, якія атрымалі яны самі. Розніца склала 18,1%.

У г. Мінску колькасць прагаласаваўшых на ВУ №34 паводле афіцыйных дадзеных склала 30 589 чалавек, а паводле звестак назіральнікаў — 20 970 чалавек. Розніца — 9 619 чалавек (31,4%). Пры гэтым неабходна заўважыць, што дадзеныя назіральнікаў не ўключалі колькасць выбаршчыкаў, прагаласаваўшых па месцы свайго знаходжання. Таму праверыць рэальную колькасць выбаршчыкаў, якія бралі ўдзел у галасаванні па месцы свайго знаходжання, немагчыма. Улічваючы зафіксаваныя назіральнікамі шматлікія факты маніпуляцый пры правядзенні гэтага віда галасавання, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, рэальна можа быць яшчэ меншай.

Гэтыя дадзеныя, вядома, не могуць быць рэпрэзентатыўнымі ў межах усёй краіны, аднак сведчаць пра тое, што падчас правядзення выбараў мелі месца маніпуляцыі з яўкай выбаршчыкаў у бок яе павелічэння.

Напрыклад, падвядзенне вынікаў выбараў у г. Гродна адбылося з сур'ёзнымі прыпіскамі з боку камісій. На розных ВУ у выніковыя пратаколы было дапісана ад 100 да 500 галасоў. Такія факты адзначаны назіральнікамі на ВУ №№ 31, 32 Гродзенскай-Паўночнай ВА, на ВУ №№ 5, 10, 19 Гродзенскай Цэнтральнай ВА, на ВУ №30 Гродзенскай Занёманскай ВА.

На ўчастку №4 Гомельскай Цэнтральнай акругі №33 дадзеныя назіральнікаў разыходзіліся з пратаколам выбарчай камісіі: назіральнікі, якія ўдвух цэлы дзень не сыходзілі з месца, налічылі 360 выбаршчыкаў, камісія напісала ў пратаколе, што на ўчастку прагаласавала 507 чалавек.

Незалежная назіральніца Валянціна Шорах, якая разам з іншымі калегамі ўсе дні галасавання адсочвала выбарчы працэс на участку №31 Брэсцкай-Заходняй акругі №1, зафіксавала істотныя адрозненні ў лічбах, датычных яўкі выбаршчыкаў. Па яе словах, афіцыйныя дадзеныя ўчастковай выбарчай камісіі па колькасці людзей, якія прыйшлі галасаваць, былі завышаныя ў параўнанні з падлікамі незалежных назіральнікаў на 467 асобаў.

На выбарчым участку №31 Палескай акругі №43 прыпіску ў 386 галасоў зафіксаваў назіральнік Васілій Сініцкі. Па спісе было зарэгістравана 2550 выбаршчыкаў, 850 з іх прагаласавалі

датэрмінова, а 477 — у дзень выбараў — агулам атрымліваецца 1327 прагаласаваўшых. У пратаколе была пазначана іншая лічба: 1861 чалавек (з улікам галасаванняў па месцы жыхарства). Назіральнікам дазволілі сачыць за працэсам падліку галасоў на гэтым участку на адлегласці 10-15 метраў.

На выбарчым участку №17 Лідскай выбарчай акругі № 54 у спісе для галасавання налічвалася 1468 чалавек. Назіральнік Леанід Анацка лічыў кожнага выбаршчыка, які прыходзіў на ўчастак — 850 чалавек, але ў пратаколе была ўказана лічба — 1006 чалавек.

Назіральнік ад БХК Віктар Адзіночанка зафіксаваў, што на ўчастку №23 Гомельскай Цэнтральнай акругі на 20.00 ва ўсіх назіральнікаў была лічба 218 чалавек прагаласаваўшых за 23 верасня. Але ў выніковым пратаколе камісіі была ўказана іншая лічба — 295 — якраз, каб хапіла на тое, каб выбары адбыліся.

Назіральнікі палічылі, што 23 верасня на ўчастак №52 Віцебскай Чкалаўскай выбарчай акругі прыйшлі 876 выбаршчыкаў, але ў выніковым пратаколе была пазначаная колькасць 1599 чалавек — на 723 выбаршчыкі болей.

Назіральнік ад кампаніі «За справядлівыя выбары» Васіль Лапацін, які прысутнічаў увесь дзень на ўчастку №25 Барысаўскай гарадской выбарчай акругі №62, зафіксаваў колькасць прагаласаваўшых на ўчастку ў 707 чалавек, камісія жа «вывела» лічбу 770, забяспечыўшы такім чынам яўку больш за 50 працэнтаў.

На выбарчым ўчастку №15 Салігорскай гарадской выбарчай акругі №68 колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні 23 верасня, была штучна завышана ўчастковай камісіяй на 401 чалавека. У гэты дзень кандыдат у дэпутаты Віктар Малочка, а таксама яго даверанная асоба Аляксандр Малочка асабіста прысутнічалі на дадзеным участку ў якасці назіральнікаў і вялі падлік выбаршчыкаў.

На ўчастку № 396 Заходняй акругі №102 Мінска назіральніка Віктара Бурага выдалілі пасля таго, як ён паспрабаваў напісаць скаргу на ўчастковую камісію на несупадзенне колькасці прагаласаваўшых. Па падліках назіральніка, на ўчастку прагаласавалі 532 выбаршчыкі, у той час як у пратаколе камісіі была пазначана іншая лічба — 566. Такім чынам, разыходжанне ў дадзеных складала 34 чалавекі. В. Буры паспрабаваў напісаць скаргу, за што яго папрасілі выдаліцца з кабінета. Калі ён пакінуў памяшканне для галасавання і выйшаў у хол, яго папрасілі зусім сысці са школы (СШ №23 Мінска), у якой знаходзіўся выбарчы ўчастак, у адваротным выпадку сябры камісіі прыгразілі націснуць «трывожную кнопку» і выклікаць міліцыю. У гэтай жа школе знаходзіўся выбарчы ўчастак №397, дзе назіральнікі Вікторыя Бурая і Анастасія Ахобіна таксама былі выдаленыя пасля спробы напісаць скаргу. На гэтым участку разыходжанні ў дадзеных аб колькасьці прагаласаваўшых выбаршчыках склалі 157 чалавек.

Таксама адзначаліся выпадкі скарачэння ў асноўны дзень выбараў колькасці выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастку для галасавання. Маніпуляцыі са спісамі былі таксама накіраваны на забеспячэнне яўкі.

На ВУ №26 Гарадзенскай Занёманскай акругі агульная колькасць выбаршчыкаў была заніжана амаль на 90 чалавек. Старшыня УВК Сяргей Пятроў патлумачыў, што адных выклікаў ваенкамат, а іншыя з'ехалі ў камандзіроўкі і на заробкі. На гэтым участку вечарам у суботу ў спісе было 2 262 выбаршчыкі, а ў нядзелю іх засталося ўжо 2178.

У дзень галасавання ў Віцебску амаль на кожным выбарчым участку скараціліся спісы выбаршчыкаў. У камісіях тлумачылі гэта тым, што гэта людзі, якія «памерлі», «з'ехалі ў Расію», або «ўжо не жывуць па гэтым адрасе». Праваабаронца Павел Левінаў запытаўся на 57-м выбарчым участку Віцебскай Чкалаўскай акругі, дзе ён быў акрэдытаваны назіральнікам, куды ж падзеліся выбаршчыкі. Старшыня адказаў: «Памерлі!»

Старшыня АВК Таццяны Ярота Салігорскай сельскай выбарчай акругі №69 патлумачыла назіральніку Уладзіміру Шылу прычыну знікнення 12% выбарцаў на ўчастку для галасавання №76 «удакладненнямі». Як вынікала з яе адказу, першапачатковая колькасць выбаршчыкаў на ўчастку «насамрэч складала 3094 чалавекі». Пасля ўдакладнення ў дзень выбараў спісу грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, гэтая колькасць была скарочана да 2713 асобаў. Спіс зменшыўся ажно на 381 выбаршчыкі, што склала 12,3% ад першапачатковай лічбы. Паводле спн. Ярота, са спісу былі выкраслены неграмадзяне Рэспублікі Беларусь, асобы, якія з'ехалі за межы краіны, якія часова змянілі месца рэгістрацыі, а таксама памерлыя. Але, па сцверджанні У. Шылы, да пачатку галасавання гэтыя спісы ўжо былі тройчы правераны. Камісія ж канчаткова іх «удакладніла» адразу на чатыры сотні чалавек у меншы бок чамусьці менавіта ў апошні дзень

выбараў, калі стала абсалютна зразумела, што пры такой яўцы выбары не адбудуцца. Пасля гэткіх маніпуляцый сакратар камісіі і адначасова дырэктар школы ды настаўнік матэматыкі спадар Каштальян вывеў афіцыйны ўзровень яўкі ў 50,3%. Пракурор Салігорскага раёна В. Бельчын таксама ўбачыў у знікненні выбаршчыкаў са спісу для галасавання напярэдадні дня выбараў «удакладненне спісу выбаршчыкаў членамі камісіі напярэдадні кожнага тура галасавання». Па факце несупадзення звестак незалежнага назіральніка з афіцыйнымі лічбамі выбарчай камісіі, якое перавысіла дзве сотні галасоў, у афіцыйным адказе паведамлялася, што назіральнік ад БХК «не заўсёды прысутнічаў у памяшканні для галасавання, часам выходзіў».

Па падліках назіральнікаў, на некаторых участках яўка выбаршчыкаў склала 45-47%. У некаторых выпадках гэта выклікала нервовую рэакцыю з боку сяброў камісій, а часам і неадэкватныя дзеянні прысутных на выбарчых участках. Так, на выбарчым участку №594 Усходняй 107-й выбарчай акругі Мінска выбары не адбыліся — прагаласавала не болей за 32% выбаршчыкаў. Па інфармацыі назіральніка Алеся Лукашэвіча, на ўчастку ўсяго было 1 150 бюлетэняў, 317 было выдадзена для галасавання, 833 засталіся нявыкарыстанымі. Калі гэтыя дадзеныя былі ўнесены ў выніковы пратакол, з рук старшыні камісіі яго вырвала назіральніца ад адной з праўладных арганізацый і збегла. Іншыя назіральнікі пачалі крычаць, каб міліцыянт яе ўтрымаў, каб сябры камісіі таксама зрабілі нешта, але ні старшыня, ні сакратар камісіі, ні нават міліцыянт не спрабавалі гэтага зрабіць, а пры спробе саміх назіральнікаў дагнаць гэту жанчыну, міліцыянт і кіраўніцтва ўчастковай камісіі замінала ім. Неўзабаве старшыня, сакратар і міліцыянт таксама пакінулі будынак, дзе месцілася камісія, а астатнія сябры камісіі пачалі збіраць мэблю, нібыта нічога незвычайнага не адбылося. На выбарчым участку №594 было зарэгістравана 12 назіральнікаў, у тым ліку два міжнародныя — ад місіі БДІПЧ АБСЕ. Яны таксама здзівіліся такому развіццю падзей, перапытвалі ў прадстаўнікоў камісіі, куды падзеўся выніковы пратакол.

Назіральнікі неаднаразова накіроўвалі звароты ў органы пракуратуры і Цэнтральную камісію з просьбай правесці праверку ў сувязі з несупадзеннем звестак аб яўцы выбаршчыкаў, устаноўленымі назіральнікамі, і дадзенымі УВК.

Так, Аліна Скрабунова звярнулася ў Цэнтральную камісію з просьбай не прызнаваць вынікі галасавання на ВУ №48 Шклоўскай ВА №90. У адказе Лідзіі Ярмошынай паведамлялася, што ў адпаведнасці з ВК вынікі выбараў, у тым ліку і прызнанне іх адбыўшыміся, устанаўліваюцца ў цэлым па акрузе, а не на асобных участках для галасавання. Акрамя гэтага, як указвае старшыня Цэнтральнай камісіі, візуальны падлік галасоў выбаршчыкаў не спараджае ніякіх прававых наступстваў, бо ў адпаведнасці з часткамі 5 і 6 артыкула 55 ВК колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні, устанаўліваецца па спісе выбаршчыкаў, а колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, — па бюлетэнях, што апынуліся ў скрынях для галасавання. Аліна Скрабунова ўказала, што падлік бюлетэняў з розных скрынь адбываўся не паасобку. Аднак гэта, на думку Цэнтральнай камісіі, магло сведчыць пра парушэнне працэдурнага характару, а не пра волевыяўленне выбаршчыкаў. Такім чынам, візуальны падлік галасоў не мае прававога значэння, паколькі такая працэдура не прадугледжана выбарчым заканадаўствам.

## 4. Устанаўленне вынікаў выбараў

Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, падвядзенне вынікаў галасавання па акрузе заставалася закрытым для назіральнікаў. Тыя, хто быў зарэгістраваны ў АВК, не заўсёды маглі прысутнічаць у сваіх камісіях пры перадачы пратаколаў аб выніках галасавання і бюлетэняў. 77% назіральнікаў не маглі азнаёміцца з пратаколамі, якія паступілі з УВК, а 22% — маглі. Асноўнымі падставамі для адмоў служылі вусныя і пісьмовыя спасылкі адпаведных АВК і Цэнтральнай камісіі на артыкул 82 ВК, згодна з якім вынікі выбараў устанаўліваюцца на пасяджэннях АВК і заносяцца ў пратакол, які падпісваецца старшынёй камісіі, намеснікам старшыні, сакратаром, членамі АВК і неадкладна перадаецца ў Цэнтральную камісію.

Згодна з артыкулам 13 ВК назіральнікі маюць права прысутнічаць на пасяджэннях адпаведных камісій, знаёміцца з пратаколамі. Паводле афіцыйнай пазіцыі Цэнтральнай камісіі, назіральнікі маюць права прысутнічаць толькі на тым пасяджэнні АВК, на якім зацвярджаюцца вынікі выбараў па акрузе.

У некаторых выпадках патрабаванні назіральнікаў аб магчымасці прысутнічаць пры перадачы пратаколаў з участковых камісій у акруговыя выклікалі рэзка негатыўную рэакцыю АВК. Так, 23 верасня ўдзень назіральнік ад БХК у Віцебскай Кастрычніцкай акруговай камісіі №20

Анатоль Родзік напісаў заяву, што хоча прысутнічаць пры перадачы пратаколаў участковых камісій. Старшыня камісіі спадар Канявалаў забараніў яму гэта — спачатку ў вуснай, а потым у пісьмовай форме. Сп. Канявалаў сказаў А. Родзіку, што беларускія назіральнікі маюць права прысутнічаць толькі на пасяджэнні камісіі, а замежным — можна прысутнічаць пры перадачы пратаколаў. У гэты час якраз АВК наведаў назіральнік ад АБСЕ, якому А. Родзік распавёў пра спрэчную сітуацыю. Міжнародны назіральнік сказаў, што ў яго ёсць Выбарчы кодэкс, адмыслова перакладзены на англійскую мову, і там напісана, што ва ўсіх назіральнікаў роўныя правы. Старшыня на гэта запярэчыў: «Гэта няправільна. У нас дзейнічае не толькі Кодэкс, але і пастановы ЦВК, дык вось ЦВК забараняе беларускім назіральнікам прысутнічаць падчас гэтай працэдуры». Высвятленні тонкасцяў разумення беларускага выбарчага заканадаўства ў прысутнасці міжнароднага назіральніка абвастрыла сітуацыю, і Анатоля Родзіка проста гвалтам выштурхалі з пакоя АВК у Кастрычніцкай раённай адміністрацыі.

Назіральніка Эдуарда Баланчука, акрэдытаванага ў АВК Маладэчанскай гарадской акругі, які хацеў прасачыць за перадачай пратаколаў у акруговую камісію, старшыня акруговай камісіі выставіла за дзверы: маўляў, зараз няма пасяджэння, на якім назіральнік мае права знаходзіцца. Гэта адбылося на вачах міжнародных назіральнікаў.

Пасяджэнні, на якіх зацвярджаюцца вынікі выбараў па акрузе, як правіла, адбываюцца на пяты дзень пасля заканчэння выбараў. Такая інтэрпрэтацыя норм ВК з боку арганізатараў выбараў прывяла да таго, што прыём бюлетэняў, пратаколаў аб выніках галасавання, якія паступілі з УВК, падсумаванне і ўстанаўленне вынікаў галасавання па акрузе адбывалася па-за пасяджэннямі АВК у цалкам закрытым для назіральнікаў рэжыме.

Зафіксаваны выпадкі, калі нават самі пасяджэнні праводзіліся ў закрытым для назіральнікаў рэжыме. Так, Мастоўская акруговая камісія па аднайменнай выбарчай акрузе №56 правяла сваё пасяджанне па зацвярджэнні вынікаў галасавання на акрузе таемна. Калі 24 верасня зраніцы незалежны назіральнік кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Алег Рамашкевіч прыйшоў у будынак, дзе знаходзілася камісія, яму паведамілі, што пасяджанне адбылося яшчэ ўчора позна ўвечары. Фактычна, калі яно сапраўды праходзіла, яно магло адбыцца толькі ноччу. Выдаць Рамашкевічу копію пратакола таксама адмовіліся, параіўшы азнаёміцца з вынікамі выбараў праз некалькі дзён у газеце. Аналагічная сітуацыя склалася і ў АВК Гродзенскай-сельскай акругі, дзе назіральніцай была зарэгістравана Святлана Рудкоўская. Калі яна зраніцы 24 верасня прыйшла ў памяшканне АВК, выявілася, што выніковае паседжанне ўжо адбылося, а члены камісіі ў асобным пакойчыку «святкуюць» заканчэнне выбарчай кампаніі. Старшыні камісіі не было, а сакратар не дала магчымасці азнаёміцца назіральніцы з выніковым пратаколам на той падставе, што ў яе яго не аказалася.

Згодна з артыкулам 55 ВК і дапаможнікам для працы УВК копіі пратаколаў аб выніках галасавання, пратаколы пасяджэнняў УВК, дзе адлюстроўваюцца вынікі раздзельнага падліку галасоў, перадаюцца ў органы, якія ўтварылі камісіі (райвыканкамы і адміністрацыі раёнаў у гарадах). Паколькі ВК не ўтрымлівае прамой нормы, паводле якой назіральнікі маюць права знаёміцца з гэтымі пратаколамі, на практыцы пратаколы былі недаступнымі для назірання. Такім чынам, станоўчае новаўвядзенне аб абавязковай фіксацыі вынікаў раздзельнага падліку галасоў фактычна не рэалізавала свой пазітыўны патэнцыял.

Прыём пратаколаў і выбарчых бюлетэняў АВК адбываўся ў будынках мясцовых органаў выканаўчай улады. Так, Баранавіцкая Заходняя АВК №5 на працягу выбарчай кампаніі знаходзілася па адрасе вул. Савецкая, 79, пакой № 100. Аднак 23 верасня яна перамясцілася ў памяшканне гарвыканкама, дзе таксама пачала працаваць АВК № 6. Пратаколы з вынікамі галасавання ў Гомелькай Юбілейнай ВА №31 прымаліся АВК не па месцы яе знаходжання на вул. Кірава, 34, а ў будынку адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Гомеля. Як правіла, на ўваходзе райвыканкамаў дзяжурылі супрацоўнікі міліцыі, якія не дапускалі назіральнікаў у будынкі.

Названыя акалічнасці сведчаць пра грубае парушэнне прынцыпу незалежнасці выбарчых камісій ад мясцовых выканаўчых органаў улады, ствараюць магчымасці для кантролю працы камісій з боку прадстаўнікоў выканаўчай вертыкалі.

Назіранне за падлікам галасоў і ўстанаўленнем вынікаў галасавання на выбарах-2012 яшчэ раз яскрава выявіла асноўныя праблемныя моманты дзеючага выбарчага заканадаўства: адсутнасць рэгламентацыі спосабу падліку выбарчых бюлетэняў УВК, адсутнасць дадзеных аб выніках раздельнага падліку галасоў у пратаколе аб выніках галасавання і недаступнасць гэтай інфармацыі для назіральнікаў, закрытасць спісаў выбаршчыкаў, адсутнасць у ВК палажэння аб выдачы

назіральнікам завераных копій пратаколаў пра вынікі галасавання, немагчымасць прысутнасці зарэгістраваных у АВК назіральнікаў пры перадачы пратаколаў і бюлетэняў з УВК і ажыццяўлення назірання за ўстанаўленнем вынікаў галасавання па выбарчай акрузе.

Гэтыя сістэмныя праблемы выбарчага заканадаўства ствараюць шырокія магчымасці для маніпуляцый з вынікамі галасавання, яўкай выбаршчыкаў, робяць працэс падліку галасоў і ўстанаўлення вынікаў галасавання не празрыстым і закрытым для назірання, што не адпавядае асноўным прынцыпам правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў, сур'ёзна падрывае давер да вынікаў выбараў і выбарчага працэсу ў цэлым.

Паводле звестак Цэнтральнай камісіі аб выніках выбараў дэпутатаў ППНС пятага склікання, у спісы грамадзян, якія мелі права браць удзел у выбарах дэпутатаў, было ўключана 7 030 430 выбаршчыкаў. У галасаванні прынялі ўдзел 5 245 459 выбаршчыкаў, ці 74,61% ад агульнай колькасці ўключаных у спісы выбаршчыкаў.

Выбары адбыліся ва ўсіх выбарчых акругах. У першым туры абрана 109 дэпутатаў ППНС. У Гомельскай Навабеліцкай ВА №36, дзе балатаваўся адзін кандыдат, які не набраў неабходнай колькасці галасоў выбаршчыкаў, павінны быць праведзены паўторныя выбары.

Разам з тым, рэальныя вынікі волевыяўлення выбаршчыкаў вызначыць немагчыма ў сувязі з тым, што падвядзенне вынікаў выбараў было нетранспарэнтным, а маніпуляцыі з бюлетэнямі і лічбамі маглі адбывацца на ўсіх этапах галасавання і падліку галасоў і наслойвацца адна на другую. Гэта азначае, што лічбы, абвешчаныя АВК і ЦВК не могуць быць пацверджаны, у выніку чаго яны не выклікаюць даверу.

23 верасня 2012 г. дзве міжнародныя місіі па назіранні за выбарамі, АБСЕ / БДІПЧ і Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, а таксама групы назіральнікаў ад Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў прадставілі свае папярэднія заключэнні па выніках назірання за выбарамі.

Місія АБСЕ ў сваім папярэднім заключэнні ў прыватнасці адзначыла, што «назіральнікам не было дадзена паўнавартаснай магчымасці назіраць за падлікам галасоў, і яны негатыўна ацанілі гэты працэс на значнай колькасці выбарчых участкаў, дзе праводзілася назіранне. Адсутнасць дакладна вызначаных працэдур падліку галасоў азначае, што дакладны падлік галасоў, як таго патрабуе п. 7. 4. Капенгагенскага Дакумента АБСЕ, падпісанага ў 1990 годзе, не можа быць гарантаваны»[16].

Місія Міжпарламенцкай Асамблеі СНД адзначыла, што арганізацыя і правядзенне выбараў дэпутатаў «адпавядалі агульнапрынятым дэмакратычным прынцыпам правядзення свабодных і справядлівых выбараў, якія ўтрымліваюцца ў Канстытуцыі і выбарчым заканадаўстве Рэспублікі Беларусь»[17]. Пры гэтым місія Міжпарламенцкай Асамблеі СНД указала, што «недакладнасць некаторых фармулёвак Выбарчага кодэкса абумоўлівае магчымасць рознага тлумачэння на практыцы шэрагу заканадаўчых норм»[18].

---

16 Международная миссия по наблюдению за выборами. Республика Беларусь — Парламентские выборы, 23 сентября 2012 года [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PPNS5-Obs_Itog2.pdf

17 Заключение группы наблюдателей от Межпарламентской Ассамблеи государств — участников Сотружества Независимых Государств на выборах в Палату представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PPNS5-Obs_Itog1.pdf

18 Тамсама

# НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ

Па дадзеных ЦВК, на выбарах было акрэдытавана 762 міжнародных назіральнікі. Міжнароднае назіранне ў Беларусі традыцыйна было прадстаўлена Назіральнай місіяй СНД (347, з якіх 29 — ад Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельнікаў СНД), Міжнароднай місіяй БДІПЧ АБСЕ (261), ПА АБСЕ (74), 1 назіральнік прадстаўляў Міжпарламенцкую асамблею Еўразійскай эканамічнай супольнасці, па 2 назіральнікі былі накіраваны ЦВК Азербайджана, Арменіі, Казахстана і Латвіі, 3 назіральнікі — ад ЦВК Расійскай Федэрацыі і 1 ад ЦВК Малдовы. У якасці міжнародных назіральнікаў былі акрэдытаваны таксама 23 незалежныя замежныя назіральнікі і 44 прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса.

Нацыянальнае назіранне ажыццяўлялася 30 304 назіральнікамі, 5 з якіх былі акрэдытаваны ў ЦВК, 528 — у АВК і 29 774 — ва ўчастковых выбарчых камісіях. 1280 назіральнікаў былі вылучаны грамадзянамі шляхам падачы заявы, 3305 — працоўнымі калектывамі, 3586 — палітычнымі партыямі, 22125 — грамадскімі аб'яднаннямі.

З пазітыўных зменаў, якія былі ўведзены ў парадак працы назіральнікаў, варта адзначыць надзяленне кіруючых органаў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў правам вылучыць назіральнікаў на ўсе ўчасткі для галасавання незалежна ад сваіх арганізацыйных структур згодна з Пастановай ЦВК ад 19 чэрвеня 2012 года. У часе папярэдняй кампаніі гэтае пытанне выклікала пэўныя спрэчкі і непаразуменні, што запатрабавала дадатковага асобнага ўрэгулявання.

Традыцыйна сярод нацыянальных назіральнікаў, вылучаных грамадскімі аб'яднаннямі, большасць складалі прадстаўнікі пяці найбуйнейшых праўладных арганізацый: Белая Русь, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ), Беларускі саюз жанчын, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі.

Нацыянальнае незалежнае ад уладаў назіранне, акрамя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», ажыццяўлялі таксама кампанія «За справядлівыя выбары», якая можа лічыцца назіраннем з боку апазіцыйных палітычных партый і рухаў, а таксама ўдзельнікі праекта «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка».

Кампанія «За справядлівыя выбары» ладзілася з ініцыятывы 13 палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, уключна з асноўнымі апазіцыйнымі палітычнымі партыямі. Раней анансаваная Партыяй «Зялёныя», Партыяй БНФ і Рухам «За свабоду» асобная кампанія назірання «Народны кантроль — за сумленныя выбары» ўключылася ў кампанію «За справядлівыя выбары». Напярэдадні выбараў гэтая кампанія спрабавала зарэгістравацца ў якасці грамадскага аб'яднання, але сутыкнулася з адмовай у рэгістрацыі з боку Міністэрства юстыцыі.

Праект «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка» — гэта ініцыятыва арганізацыі Belarus Watch, якая рэалізуецца ў партнёрстве з ЕГУ і Беларускім Домам правоў чалавека. Падчас датэрміновага галасавання і ў дзень выбараў 70 удзельнікаў праекта назіралі на 59 участках 35 выбарчых акругаў, далучыўшыся да кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Чатыры прадстаўнікі праекта таксама прынялі ўдзел у доўгатэрміновым назіранні ў якасці практыкантаў доўгатэрміновых назіральнікаў кампаніі праваабаронцаў.

| **Назва арганізацыі (кампаніі)** | **Колькасць доўгатэрміновых назіральнікаў** | **Колькасць кароткатэрміновых назіральнікаў** |
|---|---|---|
| Праваабаронцы за свабодныя выбары | 98 (назіранне на 106 акругах) | 350 (назіранне на 188 участках) |
| За справядлівыя выбары | 0 | 1555 (назіранне на 777 участках) |
| Белая Русь* | 94 | 5107 |
| БРСМ* | 63 | 4575 |
| Беларускі саюз жанчын* | 36 | 1912 |
| Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі* | 38 | 4086 |
| Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў* | 35 | 3408 |

**Паводле звестак Цэнтральнай камісіі.*

Нягледзячы на высокі колькасны паказчык вылучаных ад праўладных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый назіральнікаў і дэклараваннем, што яны таксама праводзілі назіранне за выбарамі ў ППНС пятага склікання, вынікі іх дзейнасці так не былі прадстаўлены грамадству. Таксама зафіксавана, што прадстаўнікі дадзеных грамадскіх аб'яднанняў падчас ходу ўсёй выбарчай кампаніі рэальна не ажыццяўлялі назірання, у падаўляючай большасці не прысутнічалі на паседжаннях АВК і на ўчастках падчас датэрміновага галасавання, з'явіўшыся ў памяшканні для правядзення галасавання толькі ў дзень выбараў, і то не паўсюль.

Так, па дадзеных ЦВК, у Гомельскай вобласці акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі зарэгістравалі 89 і 5807 нацыянальных назіральнікаў адпаведна. Аднак, напрыклад, мазырскі праваабаронца Уладзімір Целяпун, назіральнік на выбарчым участку №18 (выбарчая акруга №42), за пяць дзён назірання за датэрміновым галасаваннем нікога з зарэгістраваных ад прадзяржаўных арганізацый так і не ўбачыў. Не з'явілася за гэты час зарэгістраваныя на ўчастку для галасавання ні Кавалёва Аксана, назіральнік ад Белай Русі, ні Навуменка Сяргей — назіральнікі ад КПБ, ні астатнія.

Шматлікія назіральнікі ад БРСМ, Белай Русі, ветэранскай арганізацыі і інш., якія былі зарэгістраваны на пінскіх участках для галасавання, нават у дзень выбараў масава ігнаравалі свае абавязкі. Яны проста адсутнічалі на большасці ўчасткаў, дзе сіратліва стаялі пустыя сталы з шыльдамі «назіральнікі».

У той жа час у працэсе назірання за выбарамі дэпутатаў ППНС назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» сутыкаліся з ціскам з боку органаў улады, адмовамі ў прадстаўленні інфармацыі з выбарчых камісій, выдаленнем з выбарчых участкаў (гэта адлюстравана ў раздзелах, прысвечаных адпаведным этапам выбарчай кампаніі), затрыманням, прыцягненнем да адміністрацыйнай адказнасці і іншым метадам уздзеяння. Гэта ў горшы бок адрознівала выбары-2012 ад выбарчых кампаній 2008 і 2010 гг.

Так, 2-га жніўня супрацоўнікі падраздзялення «Тайфун» ДАІ Віцебскай вобласці спынілі аўтамабіль, у якім знаходзілася іміджавая прадукцыя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Кіроўцу даставілі ў РАУС г. Расоны, дзе начальнік ААПП РАУС Аляксандр Ястрэбаў склаў пратакол вымання. Іміджавую прадукцыю, сярод якой былі канцэлярскія вырабы, сумкі, майкі з фірмовай сімволікай, было вырашана канфіскаваць «з мэтай правядзення праверкі». Дадзеная прадукцыя была падрыхтавана для доўгатэрміновых назіральнікаў, журналістаў і юрыстаў кампаніі.

11 верасня суддзя Ленінскага раёна Магілёва Аксана Ратнікава вынесла пастанову па справе адказнага за незалежнае назіранне на Магілёўшчыне ў межах кампаніі «За справядлівыя выбары 2012» Юрыя Новікава. Суддзя палічыла Юрыя Новікава вінаватым у тым, што ён займаўся распаўсюдам сродкаў масавай інфармацыі ў выглядзе імянных сшыткаў назіральнікаў, брашураў для назіральнікаў і інфармацыйнага бюлетэня для назіральнікаў. Паводле яе рашэння, уся гэтая прадукцыя трапляе пад закон аб СМІ і падлягае знішчэнню. Аўтамабіль Юрыя Новікава быў спынены 23 жніўня ў 20-00 у раёне чыгуначнага вакзалу супрацоўнікамі ДАІ, кіроўцу прапанавалі праехаць у Ленінскі РАУС, дзе аўтамабіль правяралі ўжо міліцыянты. У багажніку былі знойдзены «Метадычныя рэкамендацыі для назіральнікаў» у колькасці 293 асобнікі, столькі ж было імянных «Рабочых сшыткаў назіральнікаў», а таксама 905 асобнікаў бюлетэня «За справядлівыя выбары». Уся прадукцыя назіральнікаў, паводле рашэння раённага суда, мусіць быць знішчана.

У г. Баранавічы супраць праваабаронцы і назіральніка Сяргея Гоўшы была сфабрыкавана адміністрацыйная справа па арт. 17.1 Адміністрацыйнага кодэкса («дробнае хуліганства»). На падставе заявы старшыні АВК Баранавіцкай Заходняй выбарчай акругі №5 Таццяны Латышавай Сяргей Гоўша быў абвінавачаны ў грубай абразе старшыні і сяброў камісіі. Доказы невінаватасці назіральніка, прадстаўленыя ім на дыктафонным запісе пасяджэння АВК, не былі ўзяты пад увагу работнікамі міліцыі і судом, які аштрафаваў С. Гоўшу 28 жніўня на 15 базавых велічынь. Яшчэ да складання пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні і вынясення пастановы суда дзяржаўная баранавічская раённая газета «Наш край» безапеляцыйна назвала Сяргея Гоўшу «распаясаўшымся хуліганам» (нумар газеты 85 ад 2 жніўня). Аўтар артыкула Міхаіл Шубіч у артыкуле «Дробнае хуліганства» даваў ацэнку падзеям, вольна інтэрпрэтуючы рэальнае становішча спраў. Напрыканцы аўтар артыкула паведамляў, што матэрыялы справы будуць перададзены ў суд, які дасць прававую ацэнку здарэнню. Артыкул быў надрукаваны ранкам 2 жніўня, а ў другой палове таго ж дня ўчастковы інспектар капітан міліцыі Мікалай Кудраўцаў сапраўды

выклікаў праваабаронцу Сяргея Гоўшу ў Баранавіцкі ГАУС, дзе і быў складзены пратакол адміністрацыйнага правапарушэння. Гэтая сітуацыя толькі пацвярджала замоўны характар абвінавачання праваабаронцы, удзел у якім прынялі сябры АВК, міліцыя і суд пры інфармацыйнай падтрымцы дзяржгазеты дзеля дыскрэдытацыі назіральніка.

У канцы жніўня назіральніца па Ясенінскай выбарчай акрузе № 100 Мінска Валянціна Свяцкая атрымала ліст з Міністэрства юстыцыі, у якім Мінюст цікавіўся дакументацыяй неіснуючай арганізацыі — Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд «Касіяпея», старшынёй якой яна раней з'яўлялася. Арганізацыя была ліквідаваная дзевяць гадоў таму. Але падчас кожнай парламенцкай кампаніі чыноўнікі ўзгадваюць пра ліквідаванае аб'яднанне і патрабуюць даць справаздачу. Падобныя захады Мінюста Валянціна Свяцкая расцаніла як ціск на яе як назіральніка.

Сябра слонімскай суполкі Партыі БНФ Андрэя Лішыка, які з'ўляўся назіральнікам на Савецкім выбарчым участку №18 па Слонімскай акрузе, 19 верасня наведалі супрацоўнікі КДБ. Андрэй жыве ў інтэрнаце на Зоркавай вуліцы. Па словах юнака, да яго ў пакой прыйшлі два чалавекі, паказалі пасведчанні супрацоўнікаў КДБ і папярэдзілі, каб ён больш не займаўся назіраннем на выбарах. «Калі будзеш і далей займацца назіраннем за выбарамі, — сказалі супрацоўнікі КДБ, — то не знойдзеш працы не толькі ў Слоніме, але і ў адсталым, задрыпаным калгасе».

Напярэдадні асноўнага дня галасавання Вераніка Байкова, сакратар АВК Мазырскай акругі, сказала назіральнікам ад БХК Святляне Шульга (выбарчы ўчастак №35, спорткомплекс «Мазырсоль») і партыі «Справядлівы свет» — Шкробат і Бялько (выбарчы ўчастак №32, медкаледж), што ім лепей не прыходзіць на ўчасткі ў дзень выбараў — 23 верасня. У іншым выпадку іх будуць выводзіць з міліцыяй і здымаць гэты працэс на камеру. Такія дзеянні з боку сакратара АВК былі выкліканы тым, што УВК не выходзілі на планавы (альбо абяцаны) працэнт колькасці выбаршчыкаў датэрміновага галасавання, які быў агучаны ў відэа на сайце тэлеканала «Мазыр» http://tkm.by/ З чаканых 30 працэнтаў набралася толькі 15. Прычынай невыканання плана сакратар АВК палічыла пільнасць працы назіральнікаў.

24 вернасня, на наступны дзень пасля дня выбараў, 15 незалежных назіральнікаў праекта «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка» былі затрыманыя ў хостэле «Джаз» у Мінску. З хостэлу разам з усімі ягонымі пастаяльцамі і персаналам на аўтазаку назіральнікі былі дастаўленыя ў Цэнтральны РАУС, дзе была праведзеная іх прымусовая дактыласкапія, а таксама агляд асабістых рэчаў. У некаторых затрыманых часова былі адабраныя тэлефоны і ноўтбукі. Праз тры гадзіны пасля затрымання без тлумачэння прычынаў назіральнікаў і персанал хостэлу адпусцілі. Цэнтральны раённы аддзел Следчага камітэта г. Мінска ў адказ на скаргу затрыманых назіральнікаў паведаміў, што затрыманне ўдзельнікаў праекта адбылося ў сувязі з ананімным званком аб тэрарыстычнай пагрозе. «У 10 гадзін на тэлефон АДС паступіў званок ад ананімнага заяўніка, які растлумачыў, што ў гасцініцы «Джаз» знаходзіцца група грамадзян каўказскай нацыянальнасці, якія пражываюць у названай гасцініцы без рэгістрацыі. Таксама чалавек растлумачыў, што яны магчыма датычныя да тэрарыстычнай дзейнасці. У сувязі з тым, што з МУС раней была атрыманая інфармацыя аб тым, што група злачынцаў — выхадцаў з Рэспублікі Казахстан, можа хавацца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і рыхтаваць правядзенне тэрактаў, далажыў аб паведамленні ў ГУУС Мінгарвыканкама. Кіраўніцтвам ГУУС было прынятае рашэнне аб дастаўленні асобаў, якія пражываюць у гасцініцы «Джаз» з мэтай устанаўлення іх асобы, пастаноўцы на дакта-, відэаўлік». Следчы камітэт адмовіўся ўзбуджаць крымінальную справу за незаконнае затрыманне назіральнікаў, матывavaўшы гэта адсутнасцю складу злачынства ў дзеяннях супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Між тым затрыманыя звяртаюць увагу на тое, што следчы так і не здолеў патлумачыць, чаму іх каля двух гадзін пратрымалі ля сцяны ў калідоры РАУС, а таксама навошта было забіраць на агляд ноўтбукі і сродкі сувязі ў некаторых затрыманых.

Сутыкнуліся назіральнікі і з палітычна матываванымі звальненнямі з працы за ўдзел у назіранні. Так, напачатку кастрычніка слесар райводаканала Івацэвіцкай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Станіслаў Халадовіч, які быў назіральнікам падчас парламенцкіх выбараў, атрымаў на рукі папярэджанне аб тым, што з ім з 7 лістапада не будзе працягнуты працоўны кантракт. У той час, як на водаканале не хапае ажно 40 работнікаў. Па словах Халадовіча, спагнанняў на працы ён не меў, а ў 2009 годзе нават быў узнагароджаны граматай за выдатную працу. Станіслаў Халадовіч лічыць сваё звальненне палітычна матываваным, кажа, што хвалю незадавальнення кіраўніцтва ўзнялі сёлетнія парламенцкія выбары: ён быў назіральнікам на ўчастку №6 выбарчай акругі №11, якой кіраваў дырэктар райводаканала Уладзімір Бурдзь. Гэты ўчастак даў самы нізкі працэнт яўкі на выбарах у раёне.

Упершыню было фактычна забароненаназіранне на выбарчых участках, якія знаходзіліся па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Цэнтральная камісія ўстанавіла, што ў адпаведнасці з Палажэннем[19] палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні могуць накіроўваць сваіх назіральнікаў толькі ў тыя камісіі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. На падставе гэтага назіральнікам кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» было адмоўлена ў магчымасці працаваць на выбарчых участках, адчыненых у дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтвах Рэспублікі Беларусь ва Украіне, Польшчы, Германіі, Расіі, Кітаі, Францыі і шэрагу іншых краін.

Трэба адзначыць, што падчас прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. падобныя абмежаванні не назіраліся.

Нормы згаданага Палажэння парушаюць прынцып галоснасці і празрыстасці выбарчага працэсу, супярэчаць артыкулу 13 ВК, які рэгламентуе правы назіральнікаў. У выніку на замежных участках для галасавання назіранне было немагчымым для нацыянальных назіральнікаў.

19 Пастанова ад 19.06.2012 г. № 21 «Об утверждении Положения о порядке деятельности иностранных (международных) наблюдателей при подготовке и проведении выборов депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва».

# СКАРГІ І ЗВАРОТЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З ВЫБАРАМІ

Згодна з выбарчым заканадаўствам, рашэнні выбарчых камісій і іншыя дзеянні, звязаныя з выбарамі, могуць абскарджвацца ў вышэйстаячыя выбарчыя камісіі і пракуратуру. Новая рэдакцыя Выбарчага кодэкса (снежань 2010 года) таксама надала магчымасць судовага абскарджання рашэнняў органаў, якія фарміравалі ТВК і УВК. Так, у адпаведнасці з ч. 6 арт. 34 Выбарчага кодэкса рашэнне органаў, якія ўтварылі камісію, можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця адпаведна ў абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд суб'ектамі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі. Скарга павінна быць падпісана адпаведна кіраўніком палітычнай партыі (арганізацыйнай структуры), іншага грамадскага аб'яднання (арганізацыйнай структуры), кіраўніком іншай арганізацыі (структурнага падраздзялення), грамадзянамі, якія вылучылі прадстаўніка ў склад камісіі шляхам падачы заявы. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Падчас выбарчай кампаніі было пададзена больш за 525 скарг і заяў.

## 1. Скаргі, звязаныя з утварэннем АВК і УВК

З пададзеных падчас выбарчай кампаніі скарг і заяў 117 — гэта скаргі на рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па стварэнні АВК і УВК, у якіх указваецца на неабгрунтаванае неўключэнне ў склад камісій прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Ні адна з гэтых скарг не была задаволена. Частка скарг — не разгледжана ў сувязі з пропускам устаноўленага ВК трохдзённага тэрміну падачы.

Суды ігнаравалі довады заяўнікаў аб дыскрымінацыйным падыходзе мясцовых выканаўчых органаў пры стварэнні УВК, спасылаючыся на тое, што працэдура фарміравання выбарчых камісій была праведзена без фармальных парушэнняў. Шмат у чым гэта абумоўлівалася адсутнасцю ў ВК крытэрыяў уключэння прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій.

Трэба адзначыць, што пры разглядзе такіх скарг у судах прадстаўнікі органаў, якія ўтварылі камісіі, указвалі, што прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый не ўключаны ў выбарчыя камісіі ў сувязі з прыцягненнем некаторых з іх да адміністрацыйнай, крымінальнай адказнасці ці беспрацоўем (напрыклад, рашэнні суда Кастрычніцкага раёна г. Магілёва па скарзе Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэньне»). Падставамі для адмовы ва ўключэнні ў выбарчыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыі служылі фармальныя памылкі ў дакументах аб вылучэнні. Пры гэтым варта заўважыць, што на аналагічныя фармальныя недакладнасці з боку праўладных арганізацый або самавылучэнцаў не звярталася ўвага.

Падобная практыка была адобрана Цэнтральнай камісіяй яшчэ на выбарах Прэзідэнта 2010 г. Такую выснову можна зрабіць з адказу Цэнтральнай камісіі на скаргуназіральніка БХК Паўла Левінава аб парушэннях пры фарміраванні УВК №35 Віцебскай Чкалаўскай ВА №18. У прыватнасці Цэнтральная камісія ўказала, што «нязначныя недакладнасці, дапушчаныя ў прадстаўленых дакументах, не могуць быць падставай для прызнання вылучэння пералічаных асоб незаконнымі, таму што прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскіх аб'яднанняў былі вылучаны правамоцным спосабам».

Аналагічная выснова зроблена і пракуратурай Віцебскай вобласці ў адказе на скаргу Паўла Левінава па пытанні фарміравання АВК Віцебскай Чкалаўскай ВА №18. Выконваючы абавязкі пракурора Віцебскай вобласці А. В. Чадзюк указаў, што «некаторыя недакладнасці пры запаўненні дакументаў, якія тычацца ўказання месца жыхарства выбаршчыкаў, з'яўляюцца неістотнымі і не ўплываюць на правамернасць прынятага рашэння». Аднак практыка сведчыць, што аналагічныя парушэнні з боку незалежных кандыдатаў у камісіі заўсёды прыводзілі да прымянення санкцый у адносінах да іх.

У цэлым аналіз судовых рашэнняў па скаргах аб фарміраванні выбарчых камісій паказвае, што суды фактычна не разглядалі спрэчкі пра абгрунтаванасць уключэння ці неўключэння тых ці іншых прадстаўнікоў у склад камісій, а абмяжоўваліся высвятленнем, ці былі дапушчаны фармальныя парушэнні пры фарміраванні выбарчых камісій.

Такую выснову можна зрабіць і з адказу намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь А. А. Забары на наглядную скаргу на адно з рашэнняў аб фарміраванні выбарчых камісій. У прыватнасці ён указаў, што «пытанне аб уключэнні той ці іншай асобы ў склад камісіі адносіцца да выключнай кампетэнцыі органаў, якія ўтвараюць камісіі».

## 2. Скаргі на этапе рэгістрацыі ініцыятыўных груп і збору подпісаў

На этапе рэгістрацыі ініцыятыўных груп было пададзена 3 скаргі, па адной з якіх было прынята станоўчае рашэнне. Так, Цэнтральная камісіі задаволіла скаргу палачаніна Сяргея Рабцава, чыю ініцыятыўную групу не зарэгістравала Полацкая акруговая выбарчая камісія. У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы пенсіянеру Сяргею Рабцаву было адмоўлена з прычыны наяўнай судзімасці, атрыманай у 2007 годзе па артыкуле 155 КК «прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання па неасцярожнасці». У ЦВК палічылі, што гэты факт не перашкаджае рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Рабцава і яго вылучэнню ў кандыдаты Палаты прадстаўнікоў.

Цэнтральнай камісіяй было адмоўлена ў задавальненні скаргі аўтару рэзананснага перфомансу «Мусарок» Івана Амельчанкі, які напярэдадні перадачы ў акруговую камісію заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы быў затрыманы і арыштаваны на 12 сутак. Дакументы былі адпраўленыя ў акружкам па пошце, але камісія не зарэгістравала групу, матывавашы гэта тым, што прэтэндэнт у дэпутаты не з'явіўся асабіста. Кіраўнік Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына на прэс-канферэнцыі 26 ліпеня патлумачыла, чаму выбарчая камісія не зарэгістравала ініцыятыўную групу па вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Івана Амельчанкі. Яна заявіла журналістам, што не бачыць у гэтай сітуацыі нічога нелагічнага: «У законе пазначана, што заява аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы падаецца асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты або прэзідэнты. Падчас прэзідэнцкіх выбараў мы нічога не тлумачылі, але тады ўстанавілі парадак, што дакументы могуць падавацца асабіста або па даверанасці. Лукашэнка падаваў дакументы па даверанасці, якая была ў Аляксандра Радзькова, кіраўніка яго ініцыятыўнай групы». Па словах Ярмошынай, забарона на прыём дакументаў па пошце была ўведзена пасля таго, як у выбарах 2002 года ўдзельнічаў «кандыдат-фантом», які вылучаўся, падаваў скаргі, але яго ніхто ніколі не бачыў. «Калі камісія пайшла па адрасе працоўнага калектыву, які яго вылучаў, там аказаліся руіны».

На этапе збору подпісаў пададзена 18 скарг (для параўнання: на прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. іх было больш за 50). Нязначная колькасць тлумачыцца тым, што збор подпісаў выкарыстоўваўся нешматлікімі кандыдатамі ў асноўным з мэтай прыцягнення ўвагі да сваёй асобы. Асноўныя ўдзельнікі выбарчай кампаніі — палітычныя партыі — вылучалі прадстаўнікоў рашэннямі сваіх вышэйшых органаў. У асноўным абскарджанні датычыліся нядопуску сябраў ініцыятыўных груп для збору подпісаў у інтэрнаты.

Таксама абскарджваліся рашэнні органаў мясцовай улады аб вызначэнні месцаў, забароненых для збору подпісаў. Так, у выніку абскарджвання было зменена рашэнне Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта: са спісу забароненых выключаны асобныя вуліцы горада. У некаторых выпадках аналагічныя скаргі не былі задаволены. Мінскі абласны выканаўчы камітэт адмовіў у задавальненні скаргі на рашэнне Слуцкага раённага выканаўчага камітэта. Адмоўнае рашэнне прыняў Мінаблвыканкамам па скарзе на рашэнне Любанскага райвыканкама. Варта заўважыць, што на прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. менавіта Мінскі абласны выканаўчы камітэт быў адным з нешматлікіх органаў, які пераглядаў рашэнні ніжэйшых выканкамаў на карысць пашырэння дазволеных месцаў.

## 3. Скаргі на адмовы ў рэгістрацыі кандыдатамі

У адпаведнасці з ч. 16 арт. 68 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь рашэнне акруговай выбарчай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можа быць абскарджана у Цэнтральную камісію асобай, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Рашэнне Цэнтральнай камісіі ў той ж тэрмін можа абскарджана асобай, вылучанай кандыдатам у дэпутаты, у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Разгляд скаргаў на рашэнні Цэнтральнай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты адбываецца ў адпаведнасці з гл. 29 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Цэнтральная камісія абавязана прадставіць суду матэрыялы, якія паслужылі падставай для адмовы ў

рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Заяўнік мае права прадстаўляць суду доказы і іншыя матэрыялы. Рашэнне Вярхоўнага Суда з'яўляецца канчатковым.

На рашэнні АВК аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты ў Цэнтральную камісію было пададзена 57 скаргаў, задаволена — 11. Такім чынам, падчас выбарчай кампаніі 2012 года скаргаў было менш, чым у аналагічны перыяд парламенцкіх выбараў 2004 г. (правам абскарджання скарысталіся 164 прэтэндэнты), і прыкладна роўна 2008 г. (52 скаргі). Сярод 11 прэтэндэнтаў, зарэгістраваных у якасці кандыдатаў, — тры беспартыйныя, па тры прадстаўнікі АГП і БПЛСС, па адным прадстаўніку ЛДП і ПБНФ. Задаволіўшы прыкладна 20% пададзеных скаргаў, Цэнтральная камісія перавысіла паказчык 2008 г., (8 з 52 ці 15%) і не дасягнула паказчыка 2004 г. (44 з 164 ці 26%).

Большасць з 11 задаволеных скаргаў датычыліся адмовы ў рэгістрацыі на падставе несапраўдных дадзеных у дэкларацыях. Пры гэтым у шэрагу выпадкаў АВК адмаўлялі з-за недэкларавання сумаў, меншых за 20% гадавога даходу, што паводле тлумачэнняў Цэнтральнай камісіі не лічыцца істотным парушэннем. У такіх выпадках рашэнні АВК адмяняліся Цэнтральнай камісіяй, аднак прэтэндэнты з-за некампетэнтных дзеянняў членаў АВК гублялі тыдзень агітацыйнай кампаніі.

Большасць скаргаў на рашэнні АВК аб прызнанні несапраўднымі подпісаў выбаршчыкаў задаволеныя не былі. Цэнтральная камсія грунтавалася на звестках АВК, у тым ліку, дадзеных экспертызы МУС, аб тым, што даты ў падпісных аркушах пастаўлены адной рукой. Прад'яўленыя на пасяджэнні некаторымі прэтэндэнтамі пісьмовыя пацверджанні, дадзеныя самімі выбаршчыкамі, не прымаліся да ўвагі. Падобная сітуацыя склалася з Міхаілам Пашкевічам, якому ў выніку было адмоўлена ў рэгістрацыі па Купалаўскай выбарчай акрузе №95 у Мінску.

У некаторых выпадках заключэнні, дадзеныя экспертамі-крыміналістамі, не дазвалялі адназначна адказаць на пытанне, зробленыя запісы ў графах «дата» і «подпіс» адной асобай ці рознымі. Аднак Цэнтральная камісія не ўлічвала гэта і пакідала скаргі без задавальнення.

Па Слуцкай выбарчай акрузе № 67 пры падтрымцы кампаніі «Гавары праўду» шляхам збору подпісаў ішоў Аляксандр Солап. Нягледзячы на прызнанне таго факту, што АВК неабгрунтавана адмовіла яму ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты, Цэнтральная камісія прыняла рашэнне не задаволіць скаргу Аляксандра Солапа і пакінуць рашэнне АВК у сіле. Са спасылкай на звароты грамадзян камісія ўказала на прычыну такога рашэння — неаднаразовыя судзімасці прэтэндэнта. Аднак паводле ВК гэты грамадзянін не меў перашкодаў для рэгістрацыі, бо яго судзімасці былі пагашаны ў сувязі са заканчэннем іх тэрміну.

На рашэнні Цэнтральнай камісіі аб адмове ў задавальненні скаргаў на рашэнні АВК у Вярхоўны Суд паступіла 19 скаргаў, адна з іх — скарга Віктара Цярэшчанкі — задаволена і заяўнік быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты (Пастаўская выбарчая акруга №29). Яшчэ дзве не былі разгледжаны з-за пропуску тэрміну для абскарджання. Астатнія 16 пакінуты без задавальнення.

Разглядаючы скаргу Сяргея Парсюкевіча, Вярхоўны Суд ужыў норму часткі 16 артыкула 61 ВК і прызнаў недапушчальным запаўненне падпісных лістоў асобай, якая не з'яўляецца членам ініцыятыўнай групы. Гэта пярэчыць Пастанове Цэнтральнай камісіі, якая ўстанавіла, што звесткі пра выбаршчыка могуць запаўняцца як самім выбаршчыкам, так і іншай асобай па просьбе выбаршчыка. Рашэнне Вярхоўнага Суда выяўляе відавочную супярэчнасць згаданай Пастановы Цэнтральнай камісіі патрабаванням выбарчага заканадаўства, аднак не дае гэтаму адпаведнай ацэнкі.

Вярхоўны суд пацвердзіў законнасць рашэння Цэнтральнай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Аляксандра Солапа са спасылкай на наяўнасць судзімасці. Суддзя Вярхоўнага Суда Ігар Мільто звярнуў увагу на адсутнасць у ВК указанняў на непагашаную або не знятую ва ўстаноўленым парадку судзімасць. Такі падыход відавочна супярэчыць заканадаўству, паколькі ў адпаведнасці з арт. 99 Крымінальнага кодэкса, пагашэнне або зняцце судзімасці ануляюць прававыя наступствы крымінальнай адказнасці. Такім чынам, суд не ліквідаваў дыскрымінацыйны падыход, сфармуляваны Цэнтральнай камісіяй у сваёй Пастанове па скарзе Солапа. Падыход, які падтрымаў Вярхоўны Суд, пярэчыць беларускаму заканадаўству.

## 4. Скаргі на этапе агітацыі

На этапе агітацыі пададзена больш за 113 скаргаў, якія пераважна датычыліся наступных з'яў: цэнзуры праграм кандыдатаў у СМІ, адмоў у трансляцыі выступленняў кандыдатаў, заба-

роны правядзення пікетаў у падтрымку байкоту выбараў, адмоў у прадстаўленні памяшканняў для сустрэч з выбаршчыкамі, немагчымасці вядзення паўнавартаснай агітацыі шляхам правядзення масавых мерапрыемстваў, выкарыстання асобнымі кандыдатамі адміністрацыйнага рэсурсу і інш.

Зарэгістраванаму 29 жніўня згодна з рашэннем ЦВК кандыдату ад Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Артуру Эшбаеву са Смалявіцкага раёна на Лагойскай выбарчай акрузе №75 зноў прыйшлося звяртацца ў ЦВК, але ўжо каб адстаяць свае права на гарантаваную законам перадвыбарчую агітацыю. Акрамя таго, што ў сувязі з абскарджваннем рашэння Лагойскай АВК у Цэнтральнай камісіі 10 дзён фактычна былі выкрасленыя з прадугледжаных заканадаўствам 30 дзён для перадвыбарчай агітацыі, то і пасля атрымання рэгістрацыі кандыдат сутыкнуўся з праблемай. Так, смалявіцкая газета «Край Смалявіцкі» адмовілася прымаць для публікацыі выбарчую праграму Артура Эшбаева з-за таго, што яна была пададзеная ў рэдакцыю з натуральным пры такіх абставінах спазненнем. Акруговая камісія на зварот кандыдата аб дапамозе паабяцала вырашыць праблему, але так нічога і не зрабіла. Толькі пасля чарговага звароту ў ЦВК і адпаведнага разбіральніцтва кандыдату паабяцалі вырашыць праблему з рэдакцыяй.

Але большасць скаргаў апазіцыйных кандыдатаў заставаліся без задавальнення. Цэнтральная камісія не задаволіла скаргі кандыдатаў па Шклоўскай выбарчай акрузе №90 на дзеянні свайго апанента, намесніка старшыні Камітэта дзяржкантролю Беларусі Аляксандра Агеева, які выкарыстоўваў службовае становішча для вядзення сваёй перадвыбарчай кампаніі.

Іван Шэга і Міхаіл Караткевіч, кандыдаты ў дэпутаты па Слонімскай выбарчай акрузе №58, звярталіся некалькі разоў са скаргамі ў Цэнтральную выбарчую камісію аб тым, што на тэрыторыі Зэльвенскага раёна створаны няроўныя ўмовы правядзення перадвыбарчай агітацыі. Кандыдатам у дэпутаты некалькі разоў зрывалі сустрэчы ў СВК «Сынковічы», у Зэльве, у СВК «Славацічы», у вёсцы Караліно і ў іншых месцах Зэльвеншчыны. Спадарыня Ярмошына адказала, што «вам было адмоўлена ў прадастаўленні памяшкання для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі, паколькі ў парушэнне ўстаноўленага парадку вы не звярнуліся ў акруговую камісію і ваша патрабаванне к Цэнтральнай камісіі таксама не заснавана на законе». У другім адказе ад 10 верасня спадарыня Ярмошына паведаміла, што «вызначэнне месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў у Зэльвенскім раёне з'яўляецца кампетэнцыяй Зэльвенскага раённага выканаўчага камітэта і Цэнтральная камісія не мае права даваць ацэнку прынятаму рашэнню». Пры гэтым, усе сустрэчы з выбаршчыкамі Міхаіл Караткевіч і Іван Шэга ўзгаднялі са старшынёй акруговай камісіі Слонімскай выбарчай акругі Аленай Мачалінай, з Зэльвенскім райвыканкамам, а таксама са старшынямі сельскіх Саветаў.

Іван Шыла, які з'яўляўся даверанай асобай салігорскага кандыдата ў дэпутаты Віктара Малочкі, атрымаў адказ з ЦВК на сваю скаргу на рашэнне Салігорскага выканкама «Аб вызначэнні месцаў для правядзення ў паведамляльным парадку масавых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца кандыдатамі ў дэпутаты ў Салігорскім раёне». У сваёй скарзе прадстаўнік кандыдата выказваў незадаволенасць рашэннем салігорскіх чыноўнікаў, якія дазволілі агітацыйныя сустрэчы толькі на нешматлюдных пляцоўках школьных стадыёнаў ды ўскрайкавым парку «Маладосць», што значна звузіла магчымасці для кантактаў з выбаршчыкамі. Цэнтральная плошча, галоўныя вуліцы, дваравыя тэрыторыі і наогул шматлюдныя месцы Салігорска апынуліся забароненымі для агітацыйных сходаў. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына стала на бок чыноўнікаў. «Пры падрыхтоўцы гэтага рашэння мясцовыя ўлады кіраваліся тым, што пры правядзенні масавага мерапрыемства магчымы вялікі збор народу. Таму ў гэтых мэтах двары не падыходзяць. Гэта можа парушыць спакой грамадзян, пражываючых у дамах вакол двара, і перакрыць рух транспарту».

ЦВК фельмі фармальна адрэагавала на скаргу кандыдата ў дэпутаты па Брэсцкай Цэнтральнай акрузе №2 Ігара Маслоўскага, якая тычылася вызначаных гарадскімі ўладамі месцаў, дзе можна было ладзіць пікеты і сустрэчы з выбаршчыкамі. У сваёй скарзе Маслоўскі даводзіў, што мясцовы гарвыканкам наўмысна прапанаваў пляцоўкі, якія размешчаны ў месцах, якія рэдка наведваюць людзі. У якасці прыкладу экс-кандыдат нагадаў пра пікет, які ён і яго давераныя асобы ладзілі 14 верасня ў вызначаным месцы — на стадыёне «Лакаматыў». За гадзіну, на працягу якой адбываўся пікет, актывісты выбарчай кампаніі Ігара Маслоўскага фактычна не сустрэлі на спартовым аб'екце ніводнага чалавека. Аднак з адказу Цэнтрвыбаркама вынікала, што «на тэрыторыі Брэсцкай Цэнтральнай выбарчай акругі №2 створаныя ўсе ўмовы для правядзення актыўнай агітацыйнай кампаніі».

## 5. Скаргі на этапе галасавання і падвядзення вынікаў выбараў

Па датэрміновым галасаванні, галасаванні ў дзень выбараў і пры падліку галасоў пададзена каля 200 скаргаў. Большасць з іх — на парушэнні вызначанай у ВК працэдуры галасавання: умяшальніцтва пабочных асоб у працу УВК, прастаўленне адзнак у бюлетэнях за выбаршчыкаў членамі УВК, выдача некалькіх бюлетэняў адной асобе і г. д. Акрамя гэтага, пададзены скаргі на перашкоды назіранню на ўчастках для галасавання. Трэба адзначыць, што скаргі накіроўваліся не па кожным факце парушэнняў, у некаторых выпадках назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» і непасрэдныя ўдзельнікі выбарчай кампаніі абмяжоўваліся паведамленнямі пра парушэнні СМІ і апісаннем іх у справаздачах.

Па парушэннях, дапушчаных пры падліку галасоў, пададзена 31 скарга. Ні адна з іх не была задаволена.

5 кастрычніка 2012 г. Цэнтральная камісія разгледзела 2 скаргі па выніках выбараў дэпутатаў ППНС: скаргу Уладзіміра Сякеркі на вынікі выбараў па Гомельскай-Цэнтральнай ВА №33 і скаргу Ігара Случака па Гомельскай Савецкай ВА №34. У задавальненні названых скаргаў было адмоўлена. Рашэнні не абскарджваліся ў Вярхоўны Суд, паколькі такая магчымасць не прадугледжана заканадаўствам. Гэта, на думку экспертаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Іншых скаргаў па выніках выбараў у Цэнтральную камісію не паступіла.

Органы пракуратуры, на якія ўскладзена функцыя нагляду за выкананнем заканадаўства ў ходзе выбараў, як і ў папярэднія кампаніі, па сутнасці, ухіліліся ад правядзення праверак і ў большасці выпадкаў перадавалі скаргі на разгляд выбарчых камісій.

Аналіз спраў дае падставы зрабіць выснову, што выніковасць абскарджанняў вельмі нізкая. Усе звароты, пададзеныя ў сувязі з фактамі парушэнняў выбарчага заканадаўства, былі пакінутыя без задавальнення.

Заява назіральніка РПГА БХК «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Уладзіміра Краўчанкі аб парушэннях заканадаўства пры падліку галасоў на выбарчым участку №12 Магілёўскай Ленінскай выбарчай акругі №84, накіраваная ў Пракуратуру Магілёўскай вобласці, была пераадрасавана старшыні акруговай выбарчай камісіі. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што паўнамоцтвы старшыні акруговай выбарчай камісіі, хоць і працягваюцца да прызнання Палатай прадстаўнікоў паўнамоцтваў абраных дэпутатаў, фактычна не дазваляюць ужываць якіх-небудзь значных мер па фактах парушэнняў. Пракуратура, якая валодае больш сур'ёзнымі паўнамоцтвамі па фактах парушэнняў выбарчага заканадаўства, як і непасрэдна падчас выбараў, далёка да правядзення праверкі па дадзеных фактах.

Яшчэ больш неадназначнае рашэнне было прынята Пракуратурай Першамайскага раёна г. Віцебска па заяве назіральніка РПГА БХК «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Паўла Левінава па фактах парушэння выбарчага заканадаўства на ўчастку №57 Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18. Пракурор Першамайскага раёна Віцебска Раманоўскі Ю.В. прыняў рашэнне накіраваць заяву для разгляду старшыні адпаведнай акруговай выбарчай камісіі. Аднак да гэтага часу паўнамоцтвы выбраных дэпутатаў былі пацверджаны і дадзеная камісія спыніла сваю дзейнасць.

Адмоўлена ва ўзбуджэнні крымінальнай справы па заяве Паўла Левінава ва Упраўленне Следчага камітэта па Віцебскай вобласці па факце скажэння вынікаў падліку галасоў на ўчастку для галасавання №58 Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18. Павел Левінаў паведамляў пра няўлічаныя бюлетэні для галасавання, якія былі атрыманы выбаршчыкамі, але не апушчаны імі ў скрыні для галасавання (гэтыя бюлетэні маюцца ў заяўніка). Пастанова была абскарджана пракурору Першамайскага раёна г. Віцебска.

Адмоўлена назіральніку РПГА БХК «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Наталлі Самахвалавай, якая звярнулася з заявай аб узбуджэнні крымінальнай справы па фактах падробкі дакументаў і няправільнага падліку галасоў старшынёй участковай камісіі №22 Магілёўскай Кастрычніцкай выбарчай акругі №86. У заяве адзначалася, што фактычная колькасць датэрмінова прагаласаваўшых выбаршчыкаў у два разы менш, чым колькасць выбаршчыкаў, указаных у выніковым пратаколе. Аналізуючы пастанову аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, вынесеную участковым інспектарам Кастрычніцкага РАУС г. Магілёва Грабянюком І.В., можна зрабіць выснову, што, як па пераважнай большасці зваротаў аб парушэннях выбарчага заканадаўства, праверка была праведзена павярхоўна. У ходзе яе былі апытаныя толькі старшыня камісіі і яго намеснік.

Іншыя абставіны пры правядзенні праверкі не былі даследаваны (не былі апытаныя іншыя назіральнікі, акрэдытаваныя ўчастковай камісіяй, грамадзяне, якія паводле дадзеных участковай камісіі прагаласавалі, не былі вывучаны пісьмовыя матэрыялы).

Варта звярнуць увагу на справу былога кандыдата ў дэпутаты па Брэсцкай Заходняй выбарчай акрузе №1 Аляксандра Мельніка, які спрабаваў прыцягнуць да адказнасці вінаватых у парушэннях выбарчага заканадаўства пры правядзенні выбараў на ўчастку для галасавання №39. Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт адмовіўся пачаць адміністрацыйны працэс па яго заяве, аднак пасля абскарджання гэтага рашэння ў Пракуратуру адміністрацыйны працэс усё-такі быў пачаты ў адпаведнасці з арт. 10.26 ПВКоАП. Затым Брэсцкі гарвыканкам вынес пастанову аб яго спыненні. А. Мельнік абскардзіў пастанову, у тым ліку, у суд Ленінскага раёна г. Брэста. Аднак скаргі не разглядаліся па сутнасці, паколькі на думку дзяржорганаў, А. Мельнік не з'яўляецца пацярпелым, і адпаведна, не надзелены правам абскарджання ў рамках адміністрацыйнага працэсу.

Адзначаны выпадак выкарыстання міжнародных механізмаў абароны парушаных правоў. Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі Васіль Палякоў і сябра партыі Уладзімір Няпомняшчых падалі скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека. Падставай паслужыла адмова судоў разгледзець іх скаргі па фактах увядзення на тэлерадыёкампаніі «Гомель» палітычнай цэнзуры падчас агітацыйнай кампаніі. Выступы кандыдатаў, якія ўтрымлівалі заклікі да выбаршчыкаў не браць удзел у выбарах, у эфір не прайшлі. Скаргі апазіцыянераў у суд выніку не далі, таму што беларускае заканадаўства не дае права ў падобных выпадках скардзіцца ў суд. У звароце ў Камітэт ААН па правах чалавека экс-кандыдаты ўказваюць на парушэнне іх права на свабоднае выказванне меркавання, права на ўдзел у справядлівых выбарах, права не падвяргацца дыскрымінацыі на падставе палітычных перакананняў, права на доступ да правасуддзя і просяць рэкамендаваць ураду Беларусі ўнесці адпаведныя змены ў нацыянальнае заканадаўства.

Аналізуючы разгляд скаргаў, пададзеных удзельнікамі выбарчай кампаніі, можна зрабіць выснову, што працэдура абскарджання парушэнняў выбарчых правоў працягвае заставацца неэфектыўнай і не дазваляе дамагчыся іх аднаўлення ў судовым або адміністрацыйным парадку, таму многія зацікаўленыя асобы не бачаць сэнсу абскарджваць парушэнні выбарчага працэсу.

# ВЫСНОВЫ

Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» лічыць, што выбары ў ППНС пятага склікання адбыліся з сур'ёзнымі парушэннямі прынцыпаў дэмакратычных і справядлівых выбараў, замацаваных стандартамі АБСЕ і беларускім заканадаўствам. Атмасфера палітычнага пераследу і рэпрэсій апанентаў улады, на фоне якой праходзіла выбарчая кампанія, абмежаванні падчас фарміравання выбарчых камісій, агітацыйнай кампаніі негатыўна паўплывалі на свабоду выбару. Непразрыстасць падліку галасоў не дае падстаў сцвярджаць, што вынікі выбараў адлюстроўваюць волевыяўленне беларускага народа.

Выбары дэпутатаў ППНС пятага склікання сталі першымі парламенцкімі выбарамі, якія праводзіліся паводле абноўленай рэдакцыі Выбарчага кодэкса. Змены і дапаўненні ў ВК, унесеныя ў 2010 і 2011 гг., у асноўным насілі пазітыўны характар. Аднак адсутнасць эфектыўных механізмаў рэалізацыі правоў грамадзян і абскарджвання парушэнняў у вялікай ступені змяншаюць станоўчы ўплыў гэтых змен. Значная частка выбарчага працэсу застаецца нетранспарэнтнай і негалоснай. Выбарчае заканадаўства не мае дастатковых механізмаў супраць маніпуляцый пры правядзенні выбараў.

Адсутнасць крытэрыяў для ўключэння або адхілення вылучаных кандыдатур у склад выбарчых камісій дазволіла органам выканаўчай улады маніпуляваць працэсам фарміравання камісій. Нягледзячы на тое, што ВК гарантуе прадстаўленасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый у складзе выбарчых камісій, на практыцы менавіта прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый склалі ў выбарчых камісіях менш за 1%.

Рэгістрацыя ініцыятыўных груп у АВК у цэлым адбывалася без відавочных парушэнняў. Аднак праверка дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах праводзілася ў закрытым для назіральнікаў рэжыме, што дае падставы ўдзельнікам выбарчага працэсу не давяраць вынікам праверкі, асабліва ў выпадках адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Усяго рознымі шляхамі было вылучана 494 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат, з іх 122 (24,6%) было адмоўлена ў рэгістрацыі. Палітычныя партыі вылучылі 204 прэтэндэнты (41% ад агульнай колькасці вылучаных). Адмову ў рэгістрацыі атрымалі 23% вылучэнцаў ад партый, з іх 19,5% — ад апазіцыйных партый.

Пераважная большасць ініцыятыўных груп апазіцыйных прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат былі зарэгістраваныя. Адмоўлена 85 ініцыятыўным групам, што планавалі вылучыць 15 асоб у якасці кандыдатаў у дэпутаты, большасць з іх складалі ініцыятыўныя групы па вылучэнні А. Міхалевіча і М. Статкевіча.

Рашэнні АВК па адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні ў якасці прэтэндэнтаў у кандыдаты А. Міхалевіча і М. Статкевіча на падставе таго, што першы не пражывае на тэрыторыі Беларусі і знаходзіцца ў крымінальным вышуку, а другі адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў турме г. Магілёва, не заснаваныя на законе.

Падчас перадвыбарчых мерапрыемстваў былі зафіксаваны перашкоды з боку ўлад у дачыненні да членаў ініцыятыўных груп апазіцыйных кандыдатаў і выпадкі выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу на карысць тых, каго падтрымлівае ўлада.

Змены ВК, унесеныя ў 2010 г., спрасцілі працэдуры рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. На спрашчэнне працэдур рэгістрацыі кандыдатаў была накіравана і Пастанова Цэнтральнай камісіі №35, якая вызначыла, што пад «істотным характарам не адпавядаючых рэчаіснасці звестак у дэкларацыі аб даходах і маёмасці кандыдата ў дэпутаты» разумеецца дэклараванне меншай сумы гадавога даходу (калі неадпаведнасць складае больш за 20% ад агульнай сумы гадавога даходу).

Абсалютна праходнымі былі кандыдатуры тых кандыдатаў у дэпутаты, хто вылучаўся адразу ад двух суб'ектаў (ад грамадзян шляхам збору подпісаў і ад працоўных калектываў) — яны на 100% зарэгістраваныя. Як правіла, менавіта гэтым шляхам ідуць тыя кандыдаты, якіх падтрымлівае ўлада. Нязначная колькасць адмоў у рэгістрацыі дадзена вылучэнцам ад працоўных калектываў — зарэгістравана 85% ад вылучаных такім шляхам. Больш за ўсё адмоўлена тым прэтэндэнтам, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў — 56%.

На этапе перадвыбарчай агітацыі адзначана выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу ў мэтах падтрымкі праўладных кандыдатаў. Адначасова дзяржаўныя СМІ публікавалі матэрыялы, якія негатыўна асвятлялі дзейнасць апазіцыі. У параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2008 г.

палепшаны заканадаўчыя ўмовы для агітацыі, аднак выкарыстанне новых норм было звужана дзеяннямі выканаўчай улады і выбарчай адміністрацыяй. Вялікая колькасць кандыдатаў ад апазіцыйных партый была пазбаўлена магчымасці данесці сваю пазіцыю да выбаршчыкаў. Зафіксаваны шматлікія выпадкі цэнзуры выступаў, перадвыбарчых праграм апазіцыйных кандыдатаў, забароны трансляцыі іх выступленняў у эфіры. Гэта істотна абмежавала правы выбаршчыкаў на атрыманне поўнай інфармацыі пра кандыдатаў і іх праграмы.

У першыя дні датэрміновага галасавання колькасць тых, хто прагаласаваў датэрмінова, нязначна адрозніваласяад той, якую аб'яўлялі УВК. Але ў канцы датэрміновага галасавання пявялічылася розніца паміж афіцыйнымі звесткамі і звесткамі назіральнікаў. Таксама ў канцы датэрміновага галасавання значна ўзрасла колькасць участкаў, на якіх была зафіксавана падобная розніца.

Пры правядзенні датэрміновага галасавання назіральнікам неаднаразова адмаўлялі ў прадстаўленні звестак пра колькасць выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастках. Былі адзначаны парушэнні працы ўчастковых камісій, члены якіх, нягледзячы на заўвагі назіральнікаў, няякасна апячатвалі скрыні для галасавання. Таксама заўважаны выпадкі, калі памяшканні для галасавання не апячатваліся падчас перапынкаў і пасля заканчэння працы УВК.

Працэс галасавання па месцы знаходжання выбаршчакаў вызначаўся шматлікімі парушэннямі падчас галасавання. Гэта датычыцца, у першую чаргу, арганізацыі галасавання па месцы знаходжання тых выбаршчыкаў, якія папярэдне не выказвалі такога жадання, і перашкод у працы назіральнікаў з боку членаў УВК.

На пераважнай большасці ўчасткаў (93,6%), дзе былі незалежныя назіральнікі, скрыні для галасавання знаходзіліся ў полі зроку членаў УВК, назіральнікаў і журналістаў. Выдачы некалькіх бюлетэняў адной асобе зафіксавалі 5,3% назіральнікаў. Былі зафіксаваны выпадкі ціску на назіральнікаў і незаконнага выдалення іх з выбарчых участкаў. 26,8% назіральнікаў паведамілі, што на працу членаў УВК паступалі скаргі адразу ад некалькіх асоб.

Падлік галасоў адбываўся непразрыста, назіральнікі, а ў большай частцы УВК і члены камісій, не мелі магчымасці адсочваць правільнасць падліку галасоў, адлюстраваных у выбарчых бюлетэнях. Назіральнікамі кампаніі зафіксавана несупадзенне звестак пра яўку выбаршчыкаў на ўчастках са звесткамі, указанымі ў пратаколах УВК аб выніках галасавання.

Падчас выбарчай кампаніі пададзена 525 скаргаў. Большасць з іх сведчыць пра неабгрунтаванае неўключэнне ў выбарчыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыі і грамадскіх аб'яднанняў. Як і на папярэдніх выбарах, ніводная з такіх скаргаў не была задаволена. На адмову ў рэгістрацыі ў Цэнтральную камісію паступіла 57 скаргаў, з іх 11 былі задаволены. З 19 скаргаў на адпаведныя рашэнні Цэнтральнай камісіі, пададзеных у Вярхоўны Суд, задаволена адна.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

Пры ўнясенні змен у ВК у студзені 2010 г. не была ўлічана большасць рэкамендацый АБСЕ і Венецыянскай камісіі, зробленых па выніках назірання за папярэднімі выбарчымі кампаніямі, у тым ліку выбарамі ў ППНС 2008 г.

Большасць гэтых рэкамендацый не страціла сваёй актуальнасці. Выбары паказалі, што без дэталёвай рэгламентацыі парадку фарміравання выбарчых камісій, галасавання і падліку галасоў немагчыма забяспечыць такое правядзенне выбараў, якое б адпавядала міжнародным стандартам. Выбарчая кампанія таксама засведчыла неабходнасць забеспячэння рэальнай роўнасці кандыдатаў у сферы доступу да сродкаў масавай інфармацыі і пашырэння правоў назіральнікаў.

Унясенне прапанаваных рэкамендацый у выбарчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь і іх паслядоўная рэалізацыя на практыцы дазволяць наблізіць выбары да міжнародных стандартаў і павялічыць давер да вынікаў такіх выбараў як у грамадзян Беларусі, так і ў міжнароднай супольнасці.

## 1. Выбарчыя камісіі

У ВК неабходна закласці норму, якая б гарантавала прысутнасць у выбарчых камісіях прадстаўнікоў тых апазіцыйных палітычных партый, якія вылучаюць сваіх кандыдатаў на выбарах. Неабходна забяспечыць палітычным партыям, якія прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі, права дэлегаваць аднаго прадстаўніка ў кожную з тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбарчых камісій. І толькі ў тым выпадку, калі палітычная партыя не скарысталася такім правам, дазваляць мясцовым распарадчым і выканаўчым органам у парадку, усталяваным законам, самастойна запаўняць вакантныя месцы ў выбарчых камісіях. Аналагічным чынам першачарговае права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі трэба прадстаўляць і кандыдатам у Прэзідэнты. Гэтыя змены адпавядалі б прыярытэту партый у садзейнічанні выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян (частка 1, артыкул 5 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь). Пры наяўнасці конкурсу на ўдзел у выбарчай камісіі яна павінна ствараецца ў максімальнай колькасці, устаноўленай ВК. Акрамя гэтага важна заканадаўча вызначыць крытэрыі для кандыдатаў у склад выбарчых камісій, якія б зменшылі магчымасці адвольнага іх прызначэння і маглі б ацэньвацца судом пры разглядзе адпаведных скаргаў. Фарміраванне выбарчых камісій пры наяўнасці конкурсу павінна праходзіць шляхам абмеркавання кожнай кандыдатуры асобна, у прысутнасці назіральнікаў.

## 2. Рэгістрацыя кандыдатаў

Неабходна выключыць магчымасць выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў, у прыватнасці забараніць збор подпісаў не членамі ініцыятыўных груп. Акрамя гэтага, трэба прадугледзець права назіральнікаў прысутнічаць пры праверцы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў. Як паказвае вопыт выбарчых кампаній, вызначыць тое, кім зроблены запіс даты ў падпісным лісце, цяжка нават для эксперта. Таму патрабаванне прастаўлення даты подпісу выключна самім выбаршчыкам неабходна зняць.

## 3. Спісы выбаршчыкаў

У мэтах павелічэння празрыстасці, падсправаздачнасці працэсу рэгістрацыі выбаршчыкаў неабходна стварыць агульнанацыянальны спіс выбаршчыкаў. Ён павінен размяшчацца ў інтэрнэце і быць даступным для кожнага жадаючага. Грамадзяне і назіральнікі, у тым ліку давераныя асобы, прадстаўнікі СМІ і міжнародныя назіральнікі павінны мець поўны доступ да спісаў. Кожны грамадзянін павінен мець права знаёміцца са спісамі выбаршчыкаў на сваім участку да пачатку галасавання. Акрамя гэтага назіральнікі павінны мець магчымасць знаёміцца са спісамі выбаршчыкаў падчас галасавання. Колькасць выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастку для галасавання, павінна абвяшчацца выбарчымі камісіямі як напярэдадні галасавання, так і пасля яго заканчэння.

## 4. Фінансаванне выбараў

Вынікі фарміравання і выкарыстання выбарчых фондаў кандыдатаў паказалі неабходнасць павелічэння тэрміну іх фарміравання. Неабходна дазволіць асобам, якія маюць намер вылучыцца

кандыдатамі ў Прэзідэнты, і палітычным партыям, якія прынялі рашэнне пра вылучэнне сваіх кандыдатаў у дэпутаты, фарміраваць выбарчы фонд з моманту прызначэння даты выбараў. У выпадку нерэгістрацыі кандыдатаў, грошы будуць вяртацца ахвяравальнікам.

Мэтазгодна павелічэнне максімальнага памеру выбарчага фонду.

## 5. Перадвыбарчая агітацыя

Заканадаўства прадугледжвае працягласць перыяду перадвыбарчай агітацыі не больш, як адзін месяц. Такі тэрмін агітацыі абмяжоўвае як кандыдатаў у магчымасці агітацыі, так і грамадзян у атрыманні поўнай інфармацыі пра кандыдатаў і іх праграмы. Прапаноўваецца павялічыць тэрмін агітацыйнай кампаніі як мінімум яшчэ на два тыдні за кошт скарачэння папярэдніх этапаў выбарчай кампаніі. Акрамя гэтага, трэба вызваліць суб'ектаў, якія размяшчаюць палітычную рэкламу, ад адказнасці за змест рэкламы, якую прадставілі кандыдаты ці палітычныя партыі.

Неабходна вярнуць практыку правядзення дэбатаў паміж кандыдатамі ў прамым эфіры, а таксама забараніць цэнзуру выступаў кандыдатаў і іх праграм.

## 6. Судовае абскарджанне рашэнняў, звязаных з выбарамі

ВК прадугледжвае абмежаваны пералік падстаў для звароту ў судовыя органы. Неабходна даць магчымасць судовага абскарджання любых рашэнняў выбарчых камісій, іншых дзяржаўных органаў. У першую чаргу гэта датычыцца пастановы Цэнтральнай камісіі, якая зацвярджае вынікі выбараў, а таксама вынікі выбараў па асобных участках, тэрыторыях і акругах.

## 7. Датэрміновае галасаванне

Замацаваная ў ВК працэдура датэрміновага галасавання дазваляе ўладам ажыццяўляць рознага роду маніпуляцыі. У сувязі з гэтым прапануецца разгледзець магчымасць поўнай адмены датэрміновага галасавання, замяніўшы яе працэдурамі, што дазвалялі б выбаршчыкам галасаваць на іншых участках.

У выпадку, калі датэрміновае галасаванне не будзе адменена, прапануецца скараціць тэрміны датэрміновага галасавання да двух дзён, увесці крытэрыі, паводле якіх выбаршчыку даецца права на датэрміновае галасаванне. Такімі крытэрыямі павінны быць падставы, якія адназначна сведчаць пра немагчымасць для выбаршчыка ўзяць удзел у галасаванні ў дзень выбараў (напрыклад, ад'езд за мяжу краіны, ці за межы выбарчай акругі і інш.).

Трэба таксама заканадаўча дэталізаваць працэдуры захавання выбарчых скрынь падчас датэрміновага галасавання, апячатвання памяшканняў, дзе знаходзіцца выбарчая скрыня.

Патрабуецца забараніць знаходжанне пабочных асоб, у тым ліку супрацоўнікаў міліцыі ў памяшканнях для галасавання і пакоях, дзе захоўваюцца выбарчыя скрыні, бюлетэні і іншыя матэрыялы па выбарах.

Прадугледзець права назіральнікаў знаходзіцца ў памяшканнях для галасавання па-за часам працы выбарчых камісій (абедзенны перапынак і інш.), калі там застаюцца члены выбарчых камісій.

Забяспечыць усе УВК празрыстымі цэльнымі выбарчымі скрынямі з пластыкавымі стужкамі для апячатвання з індывідуальным нумарам выбарчага ўчастка.

## 8. Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка

Вызначыць, што права на такое галасаванне ўзнікае ў выбаршчыка толькі пасля перадачы пісьмовай заявы ва ўчастковую выбарчую камісію (не пазней дня галасавання) аб немагчымасці галасавання на выбарчым участку.

## 9. Падлік галасоў

Працэдура падліку галасоў не з'яўляецца празрыстай. Адна з асноўных прычын гэтага — адсутнасць дэталізацыі працэдуры падліку галасоў у ВК. Трэба заканадаўча замацаваць наступныя прынцыпы працэдуры падліку галасоў.

Падлік галасоў трэба праводзіць галосна ў прысутнасці назіральнікаў, якія могуць бачыць правільнасць падліку волевыяўлення выбаршчыкаў у кожным бюлетэні і чуць, за каго пададзены голас. Патрабуецца, каб падлік галасоў рабіў адзін з членаў камісіі, які б агучваў і дэманстраваў усім членам камісіі і назіральнікам кожны бюлетэнь.

Падлік галасоў павінен ажыццяўляцца асобна па кожнай скрыні для галасавання, вынікі такога асобнага падліку галасоў асобна па кожнай скрыні павінны адлюстроўвацца ў выніковым пратаколе.

Назіральнікі і іншыя асобы, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з выбарчым кодэксам на ўчастку для галасавання пры падліку галасоў, павінны мець права весці аўдыё- і відэазапіс працы выбарчай камісіі аж да абвяшчэння вынікаў галасавання і вывешвання выніковага пратакола. Копія выніковага пратакола, завераная старшынёй і сакратаром камісіі і замацаваная пячаткай, выдаецца назіральніку па яго просьбе.

Прапануецца замацаваць права назіральнікаў, зарэгістраваных у тэрытарыяльных выбарчых камісіях, і давераных асоб кандыдатаў непасрэдна прысутнічаць і назіраць за працэдурамі перадачы выбарчых бюлетэняў і пратаколаў з вынікамі галасавання з участкаў для галасавання ў тэрытарыяльныя камісіі і атрымліваць (альбо складаць самім) зводную табліцу вынікаў галасавання па ўчастку і ў цэлым па акрузе і тэрыторыі з завярэннем гэтых копій старшынёй адпаведнай выбарчай камісіі.

## 10. Назіранне за выбарамі

Для павелічэння даверу да інстытута выбараў у Беларусі неабходна заканадаўча пашырыць правы назіральнікаў.

Назіральнікі павінны мець магчымасць бесперашкодна знаёміцца з матэрыяламі камісій па вылучэнні ў іх склад, спісамі выбаршчыкаў, умовамі захавання выбарчых бюлетэняў і скрынь падчас датэрміновага галасавання.

Неабходна зрабіць транспарэнтнай працэдуру падліку галасоў, каб засведчыць тое, што кожны бюлетэнь быў улічаны менавіта за таго кандыдата, які пазначаны ў бюлетэні. Неабходна дакладна акрэсліць права абскарджання, у тым ліку ў судовым парадку любых дзеянняў, якія могуць паўплываць на вынікі выбараў, а таксама прапісаць працэдуры і тэрміны абскарджання.

У мэтах адназначнага прымянення палажэнняў аб правах назіральнікаў, замацаваць у артыкуле 13 ВК прынцып тэорыі права, згодна з якім пералік правоў назіральнікаў з'яўляецца прыкладным, а пералік забаронаў — вычарпальным.

# СІТУАЦЫЯ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

## 1. Міжнародная рэакцыя на выбары

24 верасня кіраўнік місіі назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ Антоніа Мілашоскі заявіў, што празрыстасць выбараў у Беларусі не можа быць гарантаваная належным чынам, паколькі назіральнікі не мелі дастатковага доступу да падліку галасоў[20]. У папярэднім дакладзе БДІПЧ і ПА АБСЕ падкрэслівалася, што «выбары не былі непрадузятымі, а працэс падачы скаргаў і апеляцый не гарантаваў эфектыўнага сродка абароны[21]». Акрамя таго, было адзначана, што «нягледзячы на пэўныя паляпшэнні выбарчага заканадаўства ў 2010 і 2011 гадах, заканадаўчыя рамкі ўсё роўна не гарантуюць правядзення выбараў у адпаведнасці з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ і міжнароднымі стандартамі»[22].

У той жа дзень з крытычнай ацэнкай правядзення ў Беларусі парламенцкіх выбараў выступілі Вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан і Камісар па пытаннях пашырэння і палітыкі суседства Штэфан Фюле. Яны падкрэслілі, што парламенцкія выбары сталі яшчэ адной страчанай магчымасцю для правядзення выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. Услед за ацэнкай БДІПЧ яны адзначылі, што выбары не былі справядлівымі і праходзілі на фоне агульнага клімату рэпрэсій і запалохвання[23].

Адначасова з заявай выступіў і кіраўнік Еўрапарламента Марцін Шульц, які выказаў шкадаванне, што парламенцкія выбары ў Беларусі зноў не адпавядалі міжнародным стандартам справядлівага і празрыстага выбарчага працэсу, а таксама паведаміў, што ў такой сітуацыі Еўрапарламент не зможа аднавіць афіцыйныя адносіны з беларускім парламентам[24]. Падобная адзнака падзей зроблена прэс-сакратаром Дзяржаўнага Дэпартамента ЗША.

Кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД Сяргей Лебедзеў не выказаў істотнай крытыкі адносна арганізацыі парламенцкіх выбараў у Беларусі. На яго думку, пэўныя недахопы выявіліся, але заўвагі і недапрацоўкі былі адзінкавымі, але ні ў якім разе не масавымі[25].

14 снежня Місія назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ апублікавала выніковы даклад аб ходзе парламенцкіх выбараў у Беларусі 23 верасня 2012 года[26]. У дакладзе канстатуецца, што, нягледзячы на некаторыя паляпшэнні ў Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь, многія абавязацельствы і стандарты ў рамках АБСЕ не былі выкананы.

## 2. Заявы кіраўніка дзяржавы і старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў па пытаннях, звязаных з правядзеннем выбараў

11 кастрычніка адбылося заключнае сумеснае паседжанне палат Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання, на якім выступіў Прэзідэнт А. Лукашэнка. Ён закрануў тэму выбараў, а менавіта — магчымасць пераходу ў будучыні на змешаную выбарчую сістэму, якая прадугледжвае і аднамандатныя акругі, і партыйныя спісы. А. Лукашэнка станоўча ацаніў функцыянаванне змяшанай сістэмы ў іншых краінах, але падкрэсліў, што выбары па партыйных спісах не могуць быць эфектыўнымі без наяўнасці аўтарытэтных партый і адпаведнай палітычнай культуры.

Прэзідэнт адзначыў, што ў перспектыве РГА «Белая Русь» можа стаць партыяй цэнтрысцкай накіраванасці, але параіў не спяшацца з гэтай трансфармацыяй[27]. Словы кіраўніка дзяржавы

20 Антоніа Мілашоскі: «Празрыстасць галасавання на выбарах не можа быць гарантаваная ў належнай ступені». — БелаПАН. 24 верасня 2012 года. — Рэжым доступу: http://by.belapan.com/archive/2012/09/24/576594_576595/

21 «Назіральнікі АБСЕ: Выбары ў Беларусі нельга назваць свабоднымі і бесстароннімі». — БелаПАН. 24 верасня 2012. — Рэжым доступу: http://by.belapan.com/archive/2012/09/24/576582_576583/

22 «ЕС: Беларусь згубіла яшчэ адну магчымасць правесці выбары ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі». БелаПАН, 24 верасня 2012. — Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/09/24/eu_eu_576822_576824/

23 Schulz on Belarus elections: mockery of democratic ballot. 24-09-2012. — Рэжым доступу: http://www.europarl.europa.eu/the-president/en/press/press_release_speeches/press_release/2012/2012-september/press_release-2012-september-13.html

24 «Миссия от СНГ вполне удовлетворена содержательной стороной выборов». — Советская Белоруссия, 25.09.2012. — Режим доступа: http://www.sb.by/post/136954/

25 Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/10/11/580378_580381/

26 Справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. Режим доступа: http://belhelcom.org/node/18176

27 22 кастрычніка стала вядома, што пытанне пераўтварэння РГА «Белая Русь» у палітычную партыю не ўключаны ў парадак дня з'езда гэтай грамадскай арганізацыі 3 лістапада 2012

сведчаць пра рашэнне чарговы раз адкласці працэс пераўтварэння грамадскай арганізацыі «Белая Русь» у палітычную партыю[28].

Акрамя гэтага А. Лукашэнка выказаў надзею, што парламент пятага склікання пачне «нейкую мадэрнізацыю палітычнай сістэмы», якая «будзе залежыць не толькі ад унутраных умоў, але перш за ўсё ад таго, у якой знешнепалітычнай сістэме і канфігурацыі мы будзем існаваць[29]». Прэзідэнт аднак не патлумачыў, што ён разумее пад такой мадэрнізацыяй і якім чынам новы Нацыянальны сход будзе вырашаць гэтую задачу. Канкрэтных дзеянняў Прэзідэнта і ўладных структур па абмеркаванні такой палітычнай рэформы (мадэрнізацыі) не было адзначана.

На гэтым жа паседжанні парламента А. Лукашэнка аб'явіў, што кампанія апазіцыі па байкоту выбараў «ганебна правалілася». Яна, па словах Прэзідэнта, «паказала слабасць апазіцыі, так званай «пятай калоны», якая нават не хоча імітаваць барацьбу за ўладу»[30].

17 кастрычніка старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына ў інтэрв'ю агенцтву БелаПАН фактычна прызнала выкарыстанне дзяржаўнымі ўстановамі адміністрацыйнага рэсурсу для забеспячэння яўкі на выбары. Яна заявіла, што яўка у 74% была дасягнута за кошт «тых тытанічных намаганняў па прыцягненні выбаршчыкаў на ўчасткі, якія рабілі мясцовыя ўлады і адміністрацыі, асабліва дзяржустаноў, устаноў адукацыі»[31].

Лідзія Ярмошына таксама выказалася супраць змешанай выбарчай сістэмы, абгрунтоўваючы гэта тым, што «мажарытарныя акругі будуць непад'ёмна велізарныя, мажарытарная сістэма проста не будзе выконваць сваю функцыю, так як дэпутат не зможа даходзіць да кожнага выбаршчыка». Але з іншага боку, яна адзначыла, што «55 дэпутатаў для 15 партый — гэта мала, будзе занадта высокі прахадны бар'ер для праходжання ў парламент. Адпаведна, туды змогуць трапіць толькі адна-дзве буйныя партыі»[32]. На яе думку, у Беларусі трэба выкарыстоўваць або мажарытарную, альбо прапарцыйную выбарчую сістэму. Пры гэтым Л. Ярмошына пагадзілася, што правядзенне выбараў па партыйных спісах дапаможа фарміраванню палітычнай партыйнай сістэмы.

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў паведаміла, што прадставіла Прэзідэнту прапановы па змене выбарчага заканадаўства. У прыватнасці, яна прапанавала ўвесці дадатковую магчымасць для вылучэння кандыдатаў ад грамадскіх арганізацый, якія налічваюць больш за тысячу членаў; даць магчымасць фармаваць выбарчыя фонды з моманту вылучэння кандыдата для таго, каб кандыдат меў легальныя сродкі для аплаты працы членаў ініцыятыўнай групы. Л. Ярмошына таксама лічыць неабходным вывесці агітацыю за байкот выбараў з паняцця перадвыбарчай агітацыі[33]. Неабходна адзначыць, што падчас выбараў у парламент 2012 года Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ўжо фактычна гэта зрабіла.

16 кастрычніка А. Лукашэнка даў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў СМІ расійскіх рэгіёнаў. Сярод іншага на ёй быў закрануты шэраг тэм, звязаных з выбарамі. Прэзідэнт зноў крытычна выказаўся наконт прапарцыйнай сістэмы выбараў, спасылаючыся на неразвітасць партыйнай сістэмы ў Беларусі. Ён таксама адзначыў прадузяты характар дакладу БДІПЧ па выніках парламенцкіх выбараў у Беларусі.

3 снежня Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў накіравала Прэзідэнту прапановы па ўнясенні змяненняў у выбарчае заканадаўства. У прыватнасці, Цэнтральная камісія выступіла за: пашырэнне магчымасцяў для вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў праз прадастаўленне такога права рэспубліканскім грамадскім аб'яднанням колькасцю больш за тысячу чалавек, а таксама выключэнне з артыкула Выбарчага кодэкса, які тычыцца правядзення перадвыбарнай агітацыі, палажэння пра байкот выбараў; павелічэнне памераў асабістых фінансавых выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты парламента і прэзідэнты; адмова ад прадастаўлення кандыдатам бюджэтных сродкаў для вырабу агітацыйных улётак падчас агітацыйнай кампаніі. Незалежныя эксперты выказалі меркаванне, што прапановы ЦВК сведчаць пра імітацыю рэформаў, а не пра рэальную мадэрнізацыю. Неабходныя змены выбарчага заканадаўства, аб якіх у першую чаргу казалі незалежныя назіральнікі і апазіцыя,

28 Рэжым доступу: http://by.belapan.com/archive/2012/10/11/580369_580373/

29 Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/10/11/580363_580367/

30 Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/10/17/581626_581627/

31 Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/10/17/581648_581649/

32 Там жа

33 Рэжым доступу: http://by.belapan.by/archive/2012/10/17/581648_581649/

